**Алесь Чобат**

# Калі хочаце мець у Айчыне свабоду…

Паэзія
ВЫБРАНАЕ

Мінск
2009



www.kamunikat.org

УДК
ББК
Ч

*Укладанне, прадмова*
***Язэпа Янушкевіча***

**Чобат А.**
Ч **Калі хочаце мець у Айчыне свабоду**…/ Паэзія: Выбранае / Уклад., прадм. Я. Янушкевіч. - Мінск, 2009. - 216 с.

Зборнік паэзіі адметнага айчыннага паэта выходзіць да 50-годдзя творцы на складкі-ахвяраванні сучаснікаў.

Прагу волі, як і прагу нараджэння вольнага таленавітага слова, нельга ні адмяніць дэкрэтам, ні разбіць неўладкаваным бытам у Айчыне.

© Чобат А., 2009
© Янушкевіч Я., укладанне, прадмова, 2009
© Паўлавец В., вокладка, 2009
© Паўлавец В., Янушкевіч Я., афармленне, 2009



www.kamunikat.org

## *«Звар’яцею ад роднага краю…»*

Абсалютная бальшыня сучасных знакавых паэтаў (Р.Барадулін, Д.Бічэль, Н.Гілевіч, Н.Мацяш, У.Някляеў, А.Пісьмянкоў, В.Стрыжак, А.Сыс) выйшлі з гуманітарыяў.

Алесь Чобат – ці не адзіны сёння па-сапраўднаму адметны Паэт з тэхнічнай адукацыяй.

Не гадаваўся юнак з-над Скідзелькі у філфакаўскай гурмé. У Алеся Чобата было іншае гняздоўе. Ён з тых нешматлікіх айчынных творцаў, хто, скончыўшы сталічны тэхналагічны інстытут, дзесятак гадоў адпрацаваў канструктарам ліцейных формаў і быў выкінуты назад у мястэчка Скідаль. Там працягвае выпакутваць у формах сваёй душы крышталёвую Паэзію.

Крытыкі яшчэ прызнаюць, што па энэргетычнасці радка, напоўненасці вобразамі, стрункасці рыфмы А.Чобат найбліжэйшы да свайго аднагодка А.Сыса. Абодвух творцаў вылучаюць непрыручанасць мешчанотай, непрыняцце духоўнага халуйства, адкрытая грамадзянская пастава, асэнсаванне падняволенасці векавечнай Бацькаўшчыны.

Пішу тут мала, ашчаджаючы на галоўнае: ВЕРШЫ. Зборнік выдаецца на складкі аматараў паэзіі. У ліку іх няма тых штатных кіраўнікоў СБП-Літфонду на чале з маладжавым старшынёй (быць і яму генералам!), якія паводле пастановы Ліквідацыйнай камісіі «*О выплате заработной платы*» ад 25.03.2009 (гаркава-сімвалічны падабраны дзень!), атрымалі тысячы і тысячы даляраў за прададзены наш пісьменніцкі Дом творчасці «Іслач» (пра што не ведае хіба аніводзін шараговы сябра той пісьменніцкай суполкі, да якой належыць і А.Чобат).

Што ж, інстынктыўная рэгула тхараватых:«*абы толькі ўсё ціха было*».

Заўчасна суцяшаўся у даследаванні пра Браніслава Эпімах-Шыпілу мой філфакаўскі выкладчык-куратар Р. Семашкевіч: «Далёкімі здаюцца часы, калі на выданне кнігі людзі павінны былі збіраць грошы, мець больш чым трэба турботаў». Часы пракудныя вярнуліся.

Гонар і слава творцам, якія працягваюць пісаць, адчуваючы адказнасць за Айчыну. Хай сабе, застаючыся жыць тут, можна й звар'яцець ад несправядлівасці за паламаны лёс, разбітыя надзеі, звальненне з працы, замоўчванне ў акадэмічных тамах й літаратурных хрэстаматыях, нашпігаваных графаманамі.

Што ж, «прыйдзе новы а мудры гісторык…» Той самы непадкупны (бо без гадавых акладаў) суддзя – Час. І адсеецца важкае жыццядайнае зерне ад пустазелля.

Спынюся. Бо і паводле Эклезіяста: шмат чытаць – хвароба вачам; многа слухаць – стома вушам.

Ды толькі біблейнае не пра паэзію Алеся Чобата. Пры чытанні вершаў скідзельскага самотніка адчуваеш, як ад іх, бы ў горне, гартуецца душа.

І толькі ад моўчы праўдзівых паэтаў запануе ў народзе немата («*У кожны век нахабства і цкаванне // бярэ свой верх праз нашае маўчанне*»).

Перадаю чытачам паэтычнае «*Выбранае*» разам з падзякай за дапамогу ў падрыхтоўцы тэкстаў ***Янку Лайкову, Нілу Гілевічу, Хрысціне Лялько, Алесю Наварычу, Уладзімеру Някляеву, Міхасю Скоблу***.

Ну, і вядома, А.Чобату-юбіляру, з якім падчас імпэтнага ўкладання «Выбранага» вярнуўся я да пракаветнай традыцыі: самапіснага (а не электроннага) ліставання.

*Віншую, дружа!*

***Язэп Янушкевіч***

*Ракаў, жнівень-2009*

* * *

Калі мой край перажыве мяне
і будзе вольны ад чужога грыму,
няўжо і вас віхура абміне,
асаднікі і парабкі рэжыму?!

Барацьбіты за веру і спакой,
і свой і тых, каму высока падаць,
няўжо і вас прыгрэе пад рукой
кароткая бяспамятная памяць?

Няўжо і вам спакойна паміраць,
а не плаціць і не ўцякаць за мора,
маленькая агідненькая шаць
часоў праклёну і сляпога гора...

* * *

Зіма. Адліга. Чорная дарога.
Жывых няма, і мёртвыя далёка –
ні зорачкі, ні края, ні мяжы.

І цесна ценям, і самотна душам,
як жабракі, па чорным свеце кружым –
крыжы і ямы, ямы і крыжы.



www.kamunikat.org

Бацькі не хочуць да шыхтоў з сынамі,
чужы і мілы край яшчэ не з намі –
ні памяці, ні роспачы, ні слёз.

Паклёп і куля выклятых не страшаць,
а не клянём і мы чужынцаў нашых –
пракляты будзь без лёсу вечны лёс.

* * *

Раскіданыя часам і вайной,
замучаныя не сваёй вінoй,
рассыпаныя бурай па дарогах,
на тры крыжы расцягнутыя Богам,

ну, што мы дзелім?! Праўду і хлусню?
Здабытак мёртвых? Попел пакаленняў?
Жывём – як не жывём... няма карэнняў,
няма слядоў ад болю і агню.

Адны адных чакаюць і стаяць,
цікавасць ціхім розумам кіруе,
ніхто сябе дарэмна не марнуе –
ці час не той, ці сэрцаў не чуваць...



www.kamunikat.org

## 1863

*«2 ноября в Ошмянской следственной комиссии были спрошены нижепоименованные лица и показали: 1. Казимир Иосифов Богушевич... имею четырех сыновей... Владислава, 25 лет, служащего офицером в Капорском полку, Францышка, 23 лет, ушедшего в мятеж, Валериана, 22 лет, имеющаго должность землемера в Ошмянском уезде, Аполлинария, 18 лет, занимается дома хозяйством...»*

Са справы Часовага палявога аўдытарыяту
Віленскай вайсковай акругі

Праўды хоча адзін, а спакою другі –
кожны сам выбірае пагоні і ўцёкі.
Прыйдзе смерць без чаргі, час разгорне сцягі,
і чатыры сыны – як чатыры дарогі.

Мы ніколі не дзякуем нашым часам:
тут умовы не тыя і людзі не тыя,
але кожны за зброю хапаецца сам –
не схіляецца болей і вечна не ные.

Беларусы адны будуць век бедаваць,
што аднойчы зашмат начыталіся кніжак,
беларусы другія ідуць ваяваць –
Каліноўскі Кастусь, Багушэвіч Францішак.

Іх чакае выгнанне, турма і пятля,
ім праз сотню гадоў не відно абеліскаў –
толькі кліча зямля, толькі кліча зямля
да Гародні, да Ліды, да Вільні, да Мінска.



www.kamunikat.org

Генерал-губернатар і граф Мураўёў
на той час быў не горш за Цанаву з Яжовым.
Біў шляхэцкую дур, піў мужыцкую кроў,
спраўна гнаў на Сібір з іх тутэйшаю мовай.

Не прадайце народ, не дзяліце народ
на мужыцкія косы і штуцэры шляхты!
За няволі жыццё варта ўзяць волі год,
гэта потым – на крыж, на Амур і на шахты.

Нам цяпер, як раней, валіць здрада пад дых,
але мёртвыя сораму й страху не маюць,
нашы мёртвыя помняць пра нашых жывых,
нашы мёртвыя нашых жывых узнімаюць.

## Ксёндз Фалькоўскі – першы павешаны на крэсах у 1863 годзе

Паўставаць заўжды не той час. Зноў ці рана, ці позна.
Але ксёндз вясковы чытае з амбоны адозву –
гэта ўсё, што паўстанцкі Жонд можа зрабіць пакуль.
А далей – толькі смерць ад казачых шабляў і куль.

Імперыя моцна ваюе! Вакол яе перамога...
Спачатку – ксяндза адвозяць у Вільню, да Мураўёва,
потым – на вёсцы вешаюць.
І закопваюць без магілы...


www.kamunikat.org

На тым месцы сорак гадоў камяні ўзыходзяць наноў.
Мужыцкія рукі тую работу рабілі.
І ўвогуле – на Беларусі лішніх няма камянёў...

Людзі, і вы ўспамяніце таго святога ксяндза.
І хай хоць раз у жыцці пацячэ па душы сляза.

* * *

За прамовы сталіцаў заўсёды плаціць хутарам.
Маем звычай такі, калі радасці – напапалам,
а ўсе беды і болесці застаюцца народу
са згоды змагароў за змаганне,
за вечную слодыч свабоды.

* * *

Смяецца дурань мястачковы
з пакутаў матчынае мовы –
за ім і тэхнікум, і пых.

Жыве і спіць, бяды не мае.
Начальства бок яго трымае –
само выходзіла з такіх.

Асілак з розумам калекі
не адчувае небяспекі
зрабіцца мёртвым пры жыцці.

Сам хлопец жвавы і вясёлы,
але другой такой жывёлы
на ўсім падворку не знайсці.

* * *

Звар'яцею ад роднага краю!
Тут зламаюць любое скрыдло,
і прабачаць, і прымуць да раю –
абы толькі ўсё ціха было.

Шчодрасць наша мацней за ўсе звычкі!
Тут астатняе ў душах святло
аддадуць, прададуць і пазычаць –
абы толькі ўсё ціха было.

Што дурны, што занадта свядомы.
Паяднала іх даўняе зло –
выракаюцца сына і дому,
абы толькі ўсё ціха было.

Горш ад сварак усіх і ад спрэчак
і халодных выгнанняў люцей
абыякавасць родных мястэчак
і бязлітаснасць блізкіх людзей.

www.kamunikat.org

## Балада
## пра памінальную хвіліну

Не аднаго ахопваў боль начамі:
яшчэ каго на свеце замаўчалі?

Не верце, што маўчанне быць павінна,
на свеце – памінальная хвіліна.

Прымаем злосць таварышаў старанных
памянем нашых мёртвых і выгнаных.

Не будзем выракацца ў кола ўзятых,
мы людзі, а не сорам рук– узнятых.

Памянем кніг нявыданых старонкі,
памянем тых, хто скручаныя ў плёнкі.

На забароны гнеўныя не глянем –
Высоцкага і Ленана памянем.

Як прагу жыць, іх песні ў душах носім –
і так баліць, як нечага мы просім.

Прымушаны прасіць, чаго не маем –
паэзію і музыку памянем.



www.kamunikat.org

У кожны век нахабства і цкаванне
бярэ свой верх праз нашае маўчанне.

Тым, хто ўсяго і кожны дзень баіцца,
няма чаго валіць на кіраўніцтва.

Хто жыць мяркуе прастатой святою,
стаць рызыкуе тою ж svалатою.

Не падтрымаем здрады падваенне –
свае памянем гонар і сумленне.

Каб стаць на тым, каб нізка не хіліцца,
не быць нікім і ў шчыліну не шыцца.

Часамі ж наша згода нават страшыць –
мы самі ж замаўчалі мёртвых нашых.
*1980 г.*

* * *

Мой даверлівы брат, не пішы халую –
няўжо выпрасіць хочаш радзіму сваю?!

Мой даверлівы брат, не піхайся дарма
да высокіх дзвярэй, бо людзей там няма.

Мой даверлівы брат, што трымае твой крок:
жонка, дзеці, заробак – а ці арышту змрок?!



www.kamunikat.org

Мой даверлівы брат, чалавек ты ці не,
калі наша зямля ўжо ляжыць у труне?!

Мой даверлівы брат, цмокі і павукі
перш за ўсё на даверлівых ладзяць сукі...

* * *

У паўстанцаў заўсёды прамы і аднолькавы лёс –
касінераў забітых апусцяць на дол патаемна,
а жывым касінерам з пакутай, – ці ўсё недарэмна? –
шлях на спёку Тэхаса або на сібірскі мароз.

Асірочаны край адступае на сорак гадоў,
каб ізноў агрызнуцца халодным і страшным жалезам,
да апошняга хутара біцца мужыцкім адрэзам,
тут малая цана на сваю і варожую кроў.

Апустэчаны край адступае глыбей і далей,
забіваецца ў душы, цураецца ўласнае мовы,
а ратунку не мае, і цэліць наган у галовы,
аж па ботах у ката сцякаюць мазгі, як алей...

О, краіна упартых! Твой парастак толькі падрос,
а зубамі скрыжэ, бо пануюць чужыя героі;
ён спачатку да кніжак, а потым ужо і да зброі –
у паўстанцаў заўсёды прамы і аднолькавы лёс.



www.kamunikat.org

* * *

Які ты задаволены!
Цябе ж яшчэ не звольнілі.
На тэмы на адвольныя
гаворыш, як святы.

Чакай, адліга згіне і
другая пойдзе лінія –
і ўсе мае «памылкі»
таксама зробіш ты.

## Гістарычны нарыс

Не крадзі і не бі. Не гуляй і не хлусь.
Завучылі. Зямля. Незалежнасць. Айчына...
На сучаснікаў не спадзяецца Скарына,
і нашчадкам радкі пакідае Кастусь.

Час прайшоў... Завучылі. Здалі. Пажылі.
Разумнейшыя сталі – вядома ж, навука.
Зноў абрыдлая гліна, аблезлая сука
і забытая вёска на ўскраі зямлі.

Час ідзе...



www.kamunikat.org

## Абноўленая будучыня

абноўлены маленькі чалавек
абноўлены і нават лепшы здзек
абноўленыя страх спакой і згода
абноўленага нашага народа
абноўлены пры жонцы спіць мужык
абноўлены вакол выходзіць пшык
абноўленага плана будаўніцтва
абноўленая сцёкамі крыніца
абноўлены маленькі чалавек.

## Час Касінераў

Ты цяпер не адзін – да народа вяртаецца вера
у другое жыццё. Прэч маўклівасць і згоду сваю!
І да нашых мясцін набліжаецца час касінераў,
і наступіць на горла аднойчы мой люд гадаўю!

Нам не трэба дазволу... Мільёны забітых за намі.
Гэта наша зямля, гэта нашы лясы і палі.
І гудуць у нябёсах паўстанцкія душы званамі,
а нашчадкі паўстанцаў збіраюцца зноў на зямлі...

Зноў нас будуць душыць з дапамогай глухіх
ды спакойных.
Мы яшчэ павандруем далёка за Нёман і Сож,



www.kamunikat.org

калі час касінераў заменіцца часам бяззбройных,
калі час безгаловых цялём папляцецца пад нож.

Зноў «шалёных» няма! Без гарантыі кроку не ступяць
і не вераць нікому, і слова сказаць не даюць.
Гэта наша зямля, гэта нашы адданасць і тупасць,
калі ў збітыя душы яшчэ дадаткова плююць.

Толькі нам не канец. Мы працяг да другіх пакаленняў.
Грамадзяне з натоўпу рабіцца людзьмі пачалі.
Бо Кастусь Каліноўскі застаўся ў душы і сумленні,
а не ў голым граніце застаўся на гэтай зямлі.

## Вёска

Час мітынгаў адкоціцца, як гром...

На вёсцы ранак бразгае вядром.
Сабака брэша. Лес маўчыць, як скрыня.
Гаспадара ўпраўляе гаспадыня.

Адгаласіла вёска за сваіх.
За першага. За старшыню калгаса.
Цяпер сядзіць, маўчыць,
чакае часу – як на прышэсце абяцанак тых.

А ты, мой сябра і названы брат,
каму трываць, як грызці жылы злосна,

збіраешся назад,
назад,
назад –
і гэта ўжо без жартаў невыносна.

Няма пагоні. Высылкі. Дагляду.
Няма чаго канфіскаваць – як сяду.
Усё сваё адразу пры сабе.
Ну, што ізноў?!

Другія вось – трываюць.
За пару слоў цяпер не забіваюць.
Адкуль жа тая пляма на табе?
Адкуль на нас. Мы зноўку эмігранты.
Мы валацугі, парыі, ваганты.

Мы паўцякалі ад прыгону прэч.
А мілы край на месцы назаўсёды...
Змаганне наша стала, як прыгоды.
Такая вось істотнейшая рэч.

## Каўнас

У цесных вулічках блукае цішыня,
як памяць лёгкая
наступных пакаленняў,
якія не заўважаць нашых ценяў...



www.kamunikat.org

Зялёны клён і голуб залаты.
Чырвоны шыхт ганзэйскіх камянічак.
У час трывогі не мяняюць звычак
суседзі нашы – сёстры і браты.

Спакойны дзень, як у калысцы сон.
На тварах годнасць. Чысціня на бруку.
Тут перанеслі ганьбу, кроў і муку –
перанясуць і гэтых сорак дзён.

Блакада. Крыкі. На стары матыў.
Абураны працоўныя ў Разані.
А летні дождж светлымі слязамі
званы касцёлаў ціха абудзіў.

Як Нёман белы, час плыве далей,
няшчасных нараджае і шчаслівых,
каб мы жылі, і верылі смялей,
і гналі смутак добрым чорным півам.

## Першыя перамены

Не. Нічога на свеце не вечна.
Час мяняецца. Сон у руку.
Вось і фабрыка з Маладзечна
стала жаліцца Пазняку.



www.kamunikat.org

Аж стамляюся – так дзіўлюся
Нам цяпер за так не праспаць
незалежнасць на Беларусі,
бюракраты мордай у гразь...

Ну, чаго мы так завяліся?
Трэба верыць у свой народ:
і адродзяцца, як адракліся,
каб ізноў ісці «упярод»...

* * *

Калі ўсё скончыцца, мы будзем як святыя
ні чаркі поўныя, ні ножкі маладыя
не зацікавяць кожнаю парой.

Нарэшце слова гонару стрымаем,
што больш не ашалеем і не маем
агульнага нічога з воляй той.

А сапраўды, навошта воля тая,
калі ўсё скончыцца і Беларусь пустая
забудзе мёртвых і прадасць жывых.

Але заўжды патрэбна будзе воля,
таму што ўсё не скончыцца ніколі –
і дых займе ад дзевак маладых...

www.kamunikat.org

* * *

Не цяжка мне зусім –
я не жабрацкі сын,
але сын Беларусі
і смерці не баюся.

Ды што! Цяпер у нас,
калі на спраўных час,
любы, хто хоча ўбіцца,
нічога не баіцца!

Народ памёр і знік –
жывы адзін разлік,
а чыстае імкненне –
дарэмнае здарэнне.

Бывай, мой родны кут!
Нікога болей тут,
ніхто мяне не хвошча...

Шчаслівы дзядзька мой
нямецкаю пятлёй
задушаны на плошчы.

www.kamunikat.org

* * *

У восені малюнак свой і строй,
а дым бульбоўніка паслаўся над зямлёй,
і вечар цягнецца прысаддзя доўгім ценем...

Час не ляціць і не гудзе чмялём,
а хмары намалёваны вуглём,
і выстыглыя гнёзды апусцелі...

Не прагне сэрца бою і агню,
але баліць душа – і ўпершыню
бярэ за горла край, людзьмі забыты...

Ах, Божа мой, чаму спакон вякоў
не выпускае восень хлапчукоў,
чый лёс і шлях дажджом і ветрам змыты...

## Ноч

Дождджык. Лета. Вулічка старая.
У пакоі плыта ціха грае,
час ідзе, і ружа памірае...

Стомленае сэрца не баліць.
Плыта грае. Свечка ціха мгліць,
ліпа летнім дождджыкам шуміць...

www.kamunikat.org

Мне ад пошты ні лістоў, ні скрынак.
Час ідзе. Лье дожджык на прыпынак,
позна ўжо на самы дробны ўчынак...

Свечка гасне. Памірае ружа,
а душа стамілася – так дужа
у пакоі тым было, было, было...

## Ля карціны М. Савіцкага «Партызанская мадонна»

Адратаванага поля аблокі
высвецяць твар і адзенне з ільну,
пожняй пабітыя босыя ногі...
Боты для тых, каму йсці на вайну.

Час абмінуў глуш ляснога раёна –
і выглядае са жніва таго
сына свайго
адратаванага поля мадонна.

Хто яе сын?.. Белым днём, сярод ночы
маці пазнае яго праз нябыт.
Глянь – у дзіцяці дарослыя вочы,
спаленых вёсак прагорклы блакіт.

З плачам па тых, каго здзьмула завея,
цяжка схапіўшыся, у палыне
разам з малым нарадзіла надзею
ўсім на зварот, хто пайшоў па вайне.

Вочы сялянскія, дробненькі прышчык,
як палатно, белы твар ільняны –
нібы ўзіраюцца на пераплыўшых
не пераплыўшыя Рэку Вайны.

Хто яе сын?... толькі чорныя хмары,
толькі пажары вялікай бяды –
вочы мадонны ўзіраюцца ў твары
сотняў жывых, хто прыходзіць сюды.

## Браты

Сасна над магілай рыпіць, як вяроўка над пляцам,
павешаны хлопцы за лёс быць народам такім –
Кастусь на Лукішках ля віленскіх дрэў і палацаў,
а мой дзядзька Толя у Скідалі ў сорак другім.

Абодва глядзелі цвярозымі ў неба вачыма,
абодва ўсё ведалі – як і на што яны йшлі,
абодвух забыла і кінула наша Айчына,
а потым успомніла і аж узнесла з пятлі...



www.kamunikat.org

Патрэбу ў святых на зямлі адчуваюць не тыя,
хто плача па мёртвых і просіць палёгкі жывым;
а моўцы пустыя і дробныя блазны святыя,
каму нашы хлопцы ўяўляюцца ценем пустым.

Хто спрытны хадзіць то наўкол, то шляхамі крывымі,
хто рушыць магілы і помнікі ставіць ізноў,
вы гэта сур'ёзна сябе палічылі жывымі?!
А што ў вас жывога, апроч нашпаргаленых слоў?

Адна толькі праўда за вашым запісана збродам,
як свет не дзяліўся б па волі сваёй і Масквы –
вы шчыра й сумленна быць хочаце разам з народам,
каб цэлы народ заставаўся шалёным, як вы.

Спакой і выгода, калі пераціснуты болем
астатнія душы за вечнай высокай сцяной –
і болей не чуюць братоў Кастуся з Анатолем,
забітых бяспамяцтвам лепей, чым слізкай пятлёй.

Сягоння святкуюць, хто выжыў дурным і сагнутым,
але не загінуў разумным, прамым, маладым,
і зычаць сягоння чакаць адпаведнай мінуты,
а жыць да мінуты нячутным, нябачным, нікім.

www.kamunikat.org

Няхай я не ведаю, чым нашы скончацца віны,
і нават няхай не вярнуцца з калымскіх дратоў
ды я не загіну і справы адвечнай не кіну,
а проста ад'еду па чорнай дарозе братоў.

## Такая гэта зямля

Бацькі зямля вялікая, маці зямля вялікая
яблыняй і калінай, пчольнікам звонкага ліпеня
на рэха нябёс перамножаная –
Нёманшчына...

І да яе, як магнітам,
цягнуць словы з вялікай літары –
Поле.
Полымя.
Памяць.

Тут да зямлі ўцалелай
цёплай прытуліць сілай
смак папяроўкі спелай,
подых жанчыны мілай.

Тут паляціць упокат
вечарам палымяным
доўгі бусловы клёкат
з выкашанай паляны...



www.kamunikat.org

Чужына не нам шчаслівей.
Жывём на такой – на звыклай,
маўклівай і неўрадлівай.
Айчына вышэй за выбар...

На ёй, як дубы, мацнелі
рады чатырох паўстанняў.
Яе пакахаў Міцкевіч,
і стаў яму свет выгнаннем.

На ёй прырасталі сэрцам
да краю свайго і поля.
Яна згарэла пад немцам,
яна не згіне ніколі;

нічога яна не забыла,
нікога яна не забыла,
сама на сябе рабіла,
чакала, верыла, клікала –
бацькі зямля вялікая,
маці зямля вялікая.

Не нам выбіраць лепшы час –
быў лёс наш раней за нас.

Святая ці не святая,
такая ці не такая –
такая гэта зямля...



www.kamunikat.org

* * *

Сон падарожжа акрылiў нясмелых –
дарога, мора, пані ў сукнях белых,
шпацыркі, кава, сосны, хваляў шум...

Прадых ад свету, схільнасць да прыгоды –
якой яшчэ палёгкі і выгоды!
Тут не пакрыўдзяць беднасць, лёс і тлум...

Тут можна жыць не толькі для радзімы
ці прадпрыемства... Хіба свет адзіны?
Але крыху падумаць пра спакой...

Калі на волю нам яшчэ зарана,
але трываць абрыдла болей пана,
адно адхланне – з хваляю марской...

* * *

Плёскат хваляў рачных
з цёплых вокнаў пяе.
Дзве пчалы залатых
пякуць вусны мае,
мілы подых апёкі мне гоіць.

Твае смутак і боль
сваім сэрцам вазьму,
але светла з табой
будзе сэрцу майму,
і сляза твая душу напоіць.



www.kamunikat.org

Прытулю назаўжды,
прыгарну цябе ўсю,
каб не чула бяды,
два крыжы панясу,
    мой анёл залаты і ўкаханы.

Сон павекаў тваіх
дакрануўся здалёк
і каленяў жывых
не дрыжыць матылёк,
    ночкай летняю закалыханы.

* * *

Запомні гэты дзень, няма другога –
далей прытулак, вуліца, дарога,
далей нічога. Помні гэты дзень...

Запомні твар яе і погляд мілы,
далей не будзе болей моцнай сілы,
не будзе сілы... Помні гэты дзень.

Запомні пацалунак і абдымкі –
далей нічога, толькі пілігрымкі,
бясконцы шлях. Запомні гэты дзень.

Запомні развітанне на завулку,
пасля якога больш няма прытулку.
няма нічога. Помні гэты дзень...

Запомні боль і рэзь вачэй і сэрца,
ты не смаркач, не здраднік, не зняверца –
нічога больш. Запомні гэты дзень...

## Польскі эцюд

Нам не сустрэцца больш ніколі,
прыйшла пара пацiснуць рукі,
і па сваёй уласнай волі
мы развіталіся без мукі.

Нам не па дваццаць год з табою,
мы вінаваціць лёс не будзем,
але нідзе няма спакою
паважным і дарослым людзям.

Мне і дагэтуль сніцца часам, –
мы ўсе належым успаміну, –
як удваіх з табою разам
вясной паедзем на радзіму.

Там і цяпер старая сліва
на стрэху белы цвет губляе
і сэрца беднае шчасліва
ад прыгажосці замірае.



www.kamunikat.org

Калі закружыць час няўмольны
і па дарогах расцярушыць,
мы станем тут, і Нёман вольны
дасць адпачынак блізкім душам.

Цяпер і ты другою стала,
і я свайго жыцця не кіну,
але пакуль не ўсё прапала,
давай паедзем на радзіму.

* * *

Так непадобныя, як толькі ты і я,
пясок і мора, міласць і нязгода,
боль і адхланне, крык і цішыня –
і нам не разлучыцца назаўсёды.

Але разлука сэрцаў, блізкіх душ
і адрачэнне нас не з нашай волі, –
праз абавязак, беднасць, бруд і глуш,
бядой той самай не былі ніколі.

Не разлучыць нас зайздрасці сляпой,
парадам моўцаў і раптоўнай смерці,
і наша ўся бяда – не мы з табой,
але жыццё як ёсць на гэтым свеце...



www.kamunikat.org

## На аўтобусным прыпынку

Цяплынь на вуліцы, але на сэрцы восень,
мястэчка ў клопатах, а ім няма канца, –
будуем, кормім, дастаём, прывозім
ад Касцюковіч і да Камянца.

Сябе мардуем працаю і крыкам,
а Бог не слухае і церпіць, як раней,
калі наш плён адным глыкáе глыкам
краіна цудаў, брудаў і свіней.

Куды што знікла? Коні і авечкі.
Сады, сядзібы, песні, карані.
Сыны, млыны, азёры, студні, рэчкі
і вочы – каб без болю і хлусні...

* * *

У тых мясцінах, блізкіх да нябёс,
не абдзяляюць Бог, райкам і лёс,
гарод, кабанчык, бульбы дваццаць сотак.

А каб яшчэ дзе выпісаць мукі
ці камбікорму, дык і не такі
ўжо дрэнны час для местачковых цётак.

А што ж, прыедуць дочкі і сыны –
і мусіш даць, бо дзе ж цяпер адны
ў тым горадзе што купяць, каб паесці...

А кажуць, у газэтах пішуць зноў,
што гэта Сталін да ўсяго давёў,
ды дзе ж чытаць – няма калі прысесці...

* * *

У вёсцы клопатна, у горадзе няёмка.
Вакол не так. Надзейна і надоўга
не так. Не тое. Не адтуль. Не там...

Не так, як хочацца. Не тое, што павінна.
Знаёмая агідная карціна.
Чарга бясконцая, і на канцы ты сам.

Надзеі згублены, і пошукі прайграны.
А хмурны жнівень цягнецца, як п'яны,
па бруду вуліцаў. Далёка да зімы.

Бывай, айчына! А куды паеду?
Ўжо цэлы свет цягаецца па свету.
Апошнія, як і заўсёды, мы...

www.kamunikat.org

* * *

Цалую неба над табой,
калі няма цябе са мной,
мой край няшчасны і шчаслівы...

Цалую след нябачных душ,
калі жывыя, – як ні руш! –
гніюць зялёнымі, як слівы...

Цалую чорную зямлю,
якую болей не малю
паўстаць, змагчы і быць Айчынай.

Цалую лоб маёй дачкі,
мой адратунак праз вякі,
мой светлячок на хвалі плыннай…

* * *

Больш нічога. Ні праўды, ні Бога.
Людзі ведаюць, дзе іх дарога.
Самі пішуць сябе у чаргу.
Не народ я – бо так не магу.

У расхрыстанай стомленай зале
застаюся адзін, – а казалі! –
больш ніякай падтрымкі няма.
Не падманеш туды, дзе свабода,



www.kamunikat.org

у другім накірунку выгода,
а свабода – дзе кроў і турма.

Вось другіх ужо людзі пачулі!
Вось часы надышлі... і мінулі.
Ну, і як? Ну, і дзе? Ну, і што?
А нічога! Ні праўды, ні Бога.
Ды чакаюць прышэсця другога
дэмакраты ў старых паліто...

Вось ужо пакаленне ў магіле,
а нікога яшчэ не забілі,
на выгнанне не выслалі вон.
У чарзе хутка выраслі дзеці,
а самотныя душы па свеце
паляцелі – па смерць наўздагон.

* * *

Туман. Пясок. Спакой і смутак.
Дарога. Сосны. Дождж. Пясок.
Ніякіх ні навін, ні чутак.
Нічога не відаць здалёк.

Але няўжо і тут чужымі
заўсёды заставацца тым,
хто біўся сэрцамі слабымі
і выгараў у лёгкі дым?



www.kamunikat.org

За грэх які ім як чужая
зямля дзяцінства і дабра,
за што іх вёска адлучае
без слоў ад поля і двара?

Не той зламаў, забыў і кінуў,
хто жыў не тут і жыў не так,
не той забыўся на радзіму,
не той ніхто, не той жабрак...

* * *

За бацькамі ніякай віны – вінаватыя дзеці,
але спрэчка ўсё цягнецца, і вінаваты бацькі;
вечны круг на зямлі, вечны суд з перасудам на свеце,
і, жывы альбо мёртвы, стае́ш прад вачыма дачкі.

Не пакаяцца прагну – не так разлучаліся мы,
як суседкі наквохчуць па месцы жыхарства і працы,
але з беднасці, з болю і з чорнай адліжнай зімы,
калі я і сябры не ўхапілі свабоду на пляцы.

Наша пані абодвух стамілася мне дараваць,
а даруе ізноў, хоць не вылезу ўжо з каляіны;
муж і пойдзе, і прыйдзе, а бацька не можа прайграць
і нікім, як раней, зноў прасіць у дачкі і Айчыны.



www.kamunikat.org

* * *

Добры геній ад мрояў не хоча прачнуцца,
а зайздросніку злому не спіцца ізноў,
патрыёт не жадае на свет азірнуцца,
а прыхільны да іншых не мае сяброў.

У халоднага сэрцам ёсць розум і вочы,
а гарачыя душы здурнелі ад слёз,
працавіты і здольны больш верыць не хоча,
а зняверany скача і ладзіць нам лёс.

Так і цягнемся мы ад пачатку да скону,
так і душым людзей ды ратуем пачвар,
так і кідае нас ад мальбы да праклёну,
так і робім з айчыны здзічэлы абшар.

* * *

Айчыны воі адпіхнулі зброю,
злапа́ныя, як пасткаю старою,
прамовай новай даўніх праўдзюкоў
і спраўным рухам гладкіх языкоў.

А жонкі
калі не трапіў лёс пятлі і кулі
іх мужыкоў і жах мінуў дзяцей,
а час падкінуў глебы для надзей.

А дзеці вояў сталі, як пачвары, –
сляпыя вочы, злізаныя твары,
пустыя думкі, сэрцы без агнёў,
а душы – на цвіках, без каранёў...

* * *

Няма справядлівасці. Як і злачынства.
Ёсць выпадак і супярэчлівы лёс.
Служака гісторыю вымеце чыста,
і чыстымі ляжам пад гоман бяроз.

Змагар дамагаецца з іншага боку,
а праўда нязручная кожнаму з нас,
таму і не чуем ад мёртвых папроку,
калі лепш за іх разумеем іх час.

Мы столькі разоў паўтараліся ў смерці,
не хочацца жыць – толькі праўды шукаць.
Няма як забыць і няма як памерці,
а толькі сабак засталося спускаць...

* * *

Не пішацца. Не хочацца. Не час.
Не патрабуе смерць нікога з нас.
У дабрабыце бедным ролі граем.
Хацелі б нават – ды не паміраем.



www.kamunikat.org

Не страшна. А навошта і чаго
палохацца? За кожным цень да скону.
І не па тэлефону, па закону
лёс вырашаны. Толькі і ўсяго...

* * *

Злачынствы. Здзекі. Сваркі. Парахункі.
Прамовы. Прафесура. Саплякі.
Сяброўства. Крыўды. Плёткі. Пачастункі.
Суседзі. Цёткі. Дзядзькі. Сваякі.

Знявер. Прыблудства. Здані. Утрыманцы.
Спакой. Трывога. Плынь і глыбіня.
Дарога. Поле. Баба на фурманцы.
Змаганне. Пошук. Вобраз. Чысціня.

Знаёмствы. Чэргі. Радасці. Згрызоты.
Падзел. Вымена. Лекі. Мітусня.
Сустрэчы. Выпіванкі. Анекдоты.
Айчына. Памяць. Праўда і хлусня.

* * *

Пры ўсім пры тым, што маем і не маем
сягоння і што будзем мець далей,
ці не зашмат трываем і прымаем –
ні скарб цалей, ні доля весялей?



www.kamunikat.org

Пры ўсім пры тым, што не зламалі ногі
і не скруцілі карку ў цёмны час,
ці не зашмат каштуюць перамогі –
ні нас у Бога і ні Бога ў нас?

Пры ўсім пры тым, што нікуды не лезем
і што не рызыкуем задарма,
ці не наскрозь праела душы плесень?
Жывыя мы? Ці нас даўно няма?

* * *

Кідаюць людзі дом за домам.
Тут чорны Стыкс і белы Нёман
падобныя. Другой ракі
няма ў маўклівым наваколлі.
Халодны вецер свішча ў полі.
Праз мост грукочуць цягнікі.

Кідаюць людзі год за годам
сумленне, памяць і свабоду –
такія правілы гульні
ўстаноўленыя нашым ладам.
Мы паміраем пад даглядам –
і тут ні кропелькі хлусні.

www.kamunikat.org

* * *

Мы коцімся наперад і назад.
Гарэлка льецца, а цвярозых шмат.
Але, на жаль, зусім не лепшы розум
у тых да суму нудных і цвярозых.

Піць і не піць – таксама ўжо няма
такога выбару, калі пайшлі талоны.
Мы ўсе дурнымі будзем пакрыйма,
ці той шалёны – хто цяпер шалёны?

Ці так я вінаваты прад табой,
праменчык мой і дзьмухавёчак мой?
Ты звыклася ўжо з нікчэмным светам,
а я не змог забраць цябе адгэтуль.

Мы будзем жыць іначай толькі ў сне,
але кляні за тое не мяне...

* * *

Не пажадаю шчасця, ты прабач.
Тут мой і твой не лёс, а смех і плач.
Не будзь шчаслівай у шалёным свеце.

Адно жаданне. Аднаго прашу,
каб мела толькі ўласную душу –
на волі і ў казённым кабінеце.



www.kamunikat.org

Ты не згубі сябе і ацалей!
Як ёсць цяпер, не будзе так далей,
якая б плата зноў не каштавала.

Ці тут, ці там, ці блізка, ці здалёк
сустрэнемся, мой мілы васілёк,
якая б смерць мяне не ўтаймавала.

* * *

Калі пустыя край і дом,
знікае страх перад судом
і не шкада нічога.

Калі даўно пусты кішэнь,
чакаюць толькі сумны дзень
і вечная дарога.

Калі разважанняў пустых
чужая злосць дае пад дых,
не ма́ю нават злосці.

Калі ж сцяжынаю пустой
пайду за хмаркай залатой,
спаткаю там кагосьці ...

* * *

Людзі ветру і полымя клічуць на пляцы народ,
людзі бізнесу латаюць дзіркі штогод,
людзі мутнай вады баламуцяць і круцяць.

Людзі кніжак артыкулы пішуць штодзень,
людзі зброі пакуль што хаваюцца ў цень,
людзі смерці нікога не любяць.

Людзі памяці знішчылі болем сябе,
людзі поля знікаюць у вечнай сяўбе,
людзі чэргаў не маюць хвіліны.

Людзі горкага часу і горкіх надзей,
людзі свету і краю зусім без людзей, –
людзі нашыя з нашай Айчыны.

* * *

*Данаце Бічэль*

Агідна часам жыць, а часам міла
з тае пары, як нас з табой прыбіла,
як два лісткі, адзін да аднаго.

Што зробіш, мы такія ад прыроды,
а тыя грошы, школы і заводы
няшмат пакінуць людзям сваяго...

І цягнемся наіўнымі радкамі
мы – самі жабракі – між жабракамі
дарэмна да нябёс ці да гары.

Але пакуль зноў едзем гэтым Краем
да Мінску ці да Рэні з Мікалаем –
і што яшчэ хацець ад той пар*ы*?



www.kamunikat.org

* * *

*М. Адаміну*

Чорны парк і чорны горад назаўсёды тут.
Гандлярам з Літвы і Польшчы – ціхі родны кут.
А сталічным публіцыстам – тэма для змагання.

Закапаліся ў гісторыі мясцовыя сябры.
Змоўклі пасля выбараў за праўду змагары.
Атрымалі ўсе працоўныя адхланне.

З каньякамі і цукеркамі свабоды не знайсці.
За зялёныя паперкі гінуць людзі пры жыцці.
А вялікі мой народ не памірае.

Чорны парк і людзі сумныя – вечны выхадны.
А ніхто ж не бачыць выйсця ў залатыя сны.
Карацей казаць, гісторыя старая ...

* * *

Які ўжо раз дагэтуль і цяпер
і праўду ведаем, і рацыя за намі!
Які ўжо раз ні зброі, ні сяброў...

Спіць розум – і варочаецца звер.
Сон белы з акрываўленымі снамі
зліваецца і нараджае кроў...

Які ўжо раз ідзе крывавы час!
Ні вершніка з мячом, ні Маці Божай
на даўняй палатніне баявой...

Свае халопы спусцяць скуру з нас.
А правы бераг з вечнаю Каложай
пакоціцца да Нёмна галавой...

* * *

Паэты развіталіся са славаю,
а з болем галавы і з чорнай каваю
жыццё іх развітае назаўжды.

Таварышы пайшлі з вялікай партыі,
і толькі дзядзькі з прынцыпамі ўпартымі,
як з багны, лезуць з крыку і нуды.

Вакол так сумна, нават глупства соннае,
адзін народ працуе і выконвае,
то верыць, то не верыць – як калі.

Таму для ўсіх паэтаў і пісьменнікаў
прасвет адзін – падацца да Друскенікаў,
пакуль чагосьці вартыя рублі.

* * *

*В. Дзмітрыеву*

Куды падзецца нам з табой,
напаўвыгнаны сябра мой?
Павіслі, як лісты сухія.

А што хацелі ты і я?
Айчына джаліць, як змяя –
што Беларусь і што Расія.

На гэткай братняе зямлі
часова мы з табой былі,
а час канчаецца паволі.

Куды падзецца нам з табой,
напаўвыгнаны сябра мой,
закладнік гонару і волі?

* * *

Як абрыдла тлумачыць, што ты яшчэ ёсць,
наша соль у крыві, наша чорная косць,
наша спадчына, наша Айчына!

Што прыблуда адсюль, што заехаўшы гусь –
разумею цяпер, каго вешаў Кастусь
і за што, і чаму так магчыма!



www.kamunikat.org

Як абрыдла даводзіць, што ты яшчэ тут,
наш апошні прытулак і збураны кут,
нашай памяці крык на паўнеба!

Што стагоддзе таму, што цяпер гадаўё –
але кожны яшчэ атрымае сваё,
ды не тое зусім, што вам трэба!

* * *

*С. Домашу*

Сам так пачаў і сам зрабіў выснову,
не ўмее гаварыць, але шануе мову
і па-сяброўску будзе ёй спрыяць.

Так абяцаў і так зрабіць не здолеў,
другі падвёў ці нават не дазволіў –
і трэба разумець і спачуваць.

Кахае, быццам матчыную хатку,
пачаць з канца, вярнуцца да пачатку,
нажаліцца, праспацца і забыць.

А патрыёты плачуцца і просяць,
тлумачаць, ходзяць і заявы носяць,
як быццам больш няма чаго рабіць ...



www.kamunikat.org

* * *

Дасць Бог, – і як ніхто не канфіскуе, –
іначай мілы край сябе адчуе,
калі апошні час перажыве.

Не усіх заб'юць, не кожнага настрашаць,
як у часах далёкіх ды і ў нашых –
і сцяг апошні вораг не сарве.

Падкошаныя да калючай пожні,
народы паўстаюць з людзей апошніх,
хто першымі збіраюць свой народ.

Дасць Бог – і людзі, між якіх згублюся,
не згубяць шанц апошні Беларусі
прайсці жывой апошні чорны год.

* * *

Загадчык катэдры і просты селянін
маўчаць да лепшых дзён – і дух адзін
жыве і будзе жыць на Беларусі.

Не трэба нам спяшацца нікуды,
яшчэ ж зусім не лепшыя гады –
вось прыйдуць лепшыя,і закрычым, як гусі.

Цяпер гага́каць – справу марнаваць.
Каму гаворана?! Каб слухаць і трываць!
Пакуль умовы раптам не даспеюць...

А вось тады, дасць Бог, і прыйдзе час:
умовы створацца, і людзі клікнуць нас –
пажнуць, і абмалоцяць, і прасеюць.

## Справаздача
## пра палітычнае становішча

Места Гародня застаецца
вялікай сцэнай тэатра абсурду.

Медны Ленін блішчыць – як вылізаны.
Споўніўся польскі праклён пары міжваеннай:
«*Каб цябе немцы акупавалі, а саветы вызвалілі!*»

У вызваленай Гародні свабодны гандаль ідзе.
Процьма свабодных заняткаў.
Саветы – без камуністаў?!
Кожны грабе як можа, але ніхто не крадзе –
такіх наіўных паслалі на перабудову ў Барысаў.
Паэты і падпалкоўнікі – разам за Беларусь.
Дацэнты і прадпрымальнікі –
таксама за рэферэндум.
Тутэйшы сепаратызм выцягвае шыю, як гусь.

Гэта Менск непакоіць.
Але нам таго Менску – не трэба.
Ад Менску – адны падаткі.
А што ён можа яшчэ?!

Лысыя ці смаркатыя – Усе яны там такія.
А тут – квітнее хто хоча!
За мяжу нават Нёман цячэ!
Адны толькі незадаволеныя –
адстаўнікі пскаўскія...

## Тутэйшы

Маленькі хлопчык, з вёсачкі паэт,
наіўны першакурснік з гурбай кніжак,
выкладчык мовы той, якую свет
забыў, як перакулены кілішак,
мурашка, бесталковы, грамацей,
неўладкаваных дзевак шанц астатні,
абхаяны праз жонку і дзяцей,
настаўнік школьны і прыдомак хатні,
нікому не патрэбны і нідзе,
нікім не выкляты – а быццам бы і сее?!
а сам даўно сівее і лысее,
і новы хлопчык верш яго крадзе...



www.kamunikat.org

## Першая прагулянка па старых вулічках

Даўно ўсё змянілася.
Места самому сабе пакінутае даўно
працоўным людам і ўладай.
Над прыватнай кавярняй самотны алень раве,
але Губерт святы не прыходзіць з добрай парадай.
А краса ўсяе Пушчы Літоўскае
жыць жабраком не звык!
А няма Гародні старой! А тое, што засталося –
чужое даўно, савецкае; вырвалі месту язык,
і не пад Божым сярпом лапоча яго калоссе!
А серп самазванцаў тых, які панаваў даўно,
ссекся, ступіўся таксама, іржавы, кінуты ў зломы...
Тут – як па ўсёй Беларусі: можна ўбачыць
адно кіно
ды зрэдку кіўне са здзекам былы
змагар і знаёмы...

* * *

Да свабоды прамая дарога
за бліжэйшым бугром знікае.
Хто крадзе – не баіцца нічога,
бо на страхі часу не мае.

Прападае свет непадзельны –
нараджаецца непрасветны.

www.kamunikat.org

Абязлюдзеў бульвар нядзельны –
не зайсці на базар савецкі.

У правінцыі твар нязменны –
кожны месца сваё займае.
А прыемна ці непрыемна –
гэта ўжо значэння не мае.

## Батлейка

Чорт матляе хвастом – раздае рэкэцірам вілы.
Цар Ірад душыць падаткамі ды бярэ ў лапу.
Наш працавіты Янка болей не мае сілы.
Анёл прадае адраджэнства – купляе вялікую славу.

Брыгадзір Мікалай пры саветах неяк абвык.
Падпалкоўнік Махмуд дагэтуль не мае кватэры.
У каваля Юрася няма жалеза на пшык.
А дэпутат Леапольд напшыкаў вакол без меры.

Селянін Сымон пакідае родны калгас.
Старшыня Станіслаў прымае гасцей высокіх.
Чужаземец Джон ратуе зусім не нас.
А цялушка Ганна зарабляе ў краях далёкіх.

Простая пані Гандлярка трымае трох мужыкоў.
Галодны дзікі Паэт шукае шляху другога.
Лапшу на вушы Дацэнт чапляе людзям ізноў.
Сягоння ў нашай батлейцы няма аднаго Пана Бога.

## Пра адно

Адзічэлы ля хутара сад.
Белы колер пануе ізноў.
Пазірае гісторык назад.
А паэт не шкадуе слоў.

Дзед сівы заматаў галавой.
Піянерскі запал і узрост.
Трактар песняй гудзе баявой.
Партызаны мініруюць мост.

Птушкай хочацца мне паляцець.
Пазірае гісторык назад.
Абы толькі чаго захацець.
Не схаваецца вораг і гад.

Пазірае палітык арлом.
Партызаны патрэбныя зноў.
А па Нёмане прэ крыгалом.
А паэт не шкадуе слоў.

* * *

Ні парадку, ні крыку – а толькі крадуць і цягаюць!
Ні вайны, ні пакутаў – а людзям не трэба зямлі.
Гэта злодзеі ходзяць і бедны народ падбіваюць;
панапісвалі вершаў, фальваркі бацькоў прапілі...



www.kamunikat.org

За гарэлкай забылі працоўныя свой абавязак,
а вакол дармаедаў адных напладзіў інстытут –
ім бы свінак трымаць, а не слухаць
прафесарскіх казак!
А інакай мы ўсе перадохнем ад голаду тут...

А ў суседняй Эўропе на густы любыя ёсць чарка –
і нікому не шкодзіць! Апроч эмігрантаў ад нас...
І пры ўладзе паэты – і неяк стаіць гаспадарка!
А тут робіш і робіш і нервы марнуеш, і час...

## На роднай вуліцы

На вуліцы маёй які ўжо год
то раскапаюць брук, то на рамонце
крама;
у Івановых знікла ноччу брама,
а мясакамбінат пусціў смурод.
Ніякай якасці, а толькі гоняць вал.
І Сідараў падаўся на Урал...

Тут сеў Пятроў – і ляснула брыгада.
А бабе што?! Знайшла другога гада,
купляе золата – зубамі зіхацець! –
і так вішчыць, што можна звар'яцець...
Чым і займаюцца тутэйшыя бічы.

А што ты зробіш? Слухай і маўчы.
На вуліцы – ні сябра, ні сабакі.
Пустыя крамы і адны палякі.

Спакойны жулік Рабіновіч Лёва
знянацку на старэйшага Пятрова
наскочыў... і пайшоў на бюлетэнь!
Такія вось здарэнні кожны дзень.
І гінуць людзі проста задарма,
і прыкладу для моладзі няма.

У цёткі Мані меншая дачка
абрэзала спадніцу да нічога,
калі стары Іван з настрою злога
білет парцейны кінуў да бачка,
крычаў, буяніў і пратэставаў
ды ўсё чапляўся да Дзіка Валеры:
– Калі ты зробіш мітынг да халеры?! –
і мацюкамі ў белы свет даваў...

Патруль прыехаў. Бараніць народ...
Скандал пачаўся. Гледачы паўсталі.
А выйшла зноў усё наадварот:
не, каб Івана здаць – дык закрычалі
пра цэны і пра тое, як раней,
пра мафію і розных ненажэрцаў,
запалашылі качак і свіней –
і... сплюнуўшы, сяржант зляснуў дзверцы!



www.kamunikat.org

Адзін Пацук Валодзя пaглядзеў
крыху іначай на такую справу:
сказаў, што рана, што Іван здурэў,
што самы час ісці пісаць заяву –
прымаюць лёгка і за пяць мінут...

Куды ні глянеш, дык суцэльны цуд.

## Парэчча

Апошні апорны пункт на мяжы з Летувой.
Далей – адны толькі дачы.
Начальства па градах паўзе.
Цягнікі. Грыбнікі. Лес аж трасе галавой.
Лісічкі – па два даляры!
Польшча ўсё завязе.

Экспансія. Дробны касцёлік
абвешаны рэпрадуктарамі.
Паланізуюць адчайна
наіўныя два ксяндзы.
На імшы адны цёткі старыя.
А Парэчча ўсё па прадукты
паехала да Друскенікаў,
як быццам няма мяжы.

Вакзалік часоў паўстання.
Ленін з адбітым носам.

Статак кабетаў чарнобыльскіх
праз санаторый нясе.
Ваякі свае, тутэйшыя...
Жыццё – як савецкая проза.
Лебедзі просяць булкі.
Сабака костку грызе.

«Былі мы тут усялякімі –
пабудзем і суверэннымі!» –
прыблізна так на палітыку
глядзяць і плююць мужыкі.
А восень ветрыкам з дожджыкам
спявае ўсцяж над Парэччамі.
А лясы навокал вялікія –
а ў лясах адны грыбнікі...

## Станцыя Рыбніца

Грыбоў у лесе – як перад вайной.
Дажджы пайшлі. Палезла вёска ў боты.
Цяпер калгасы поўныя банкроты –
дык люд работай корміцца адной:

лісічкі за даляры прадаваць
літоўцам, рускім, немцам і палякам.
Што ж, трэба жыць пры ўладзе пры ўсялякай
касіць, даіць і малако здаваць.



www.kamunikat.org

Край гэты прадалі даўным-даўно.
Адны лісічкі ў лесе засталіся
і вера, што паможа Бог калісьці,
і дзень за днём размовы пра адно.

* * *

Калі над лугам бусел праляцеў
і ты за ім падняцца захацеў,
было яшчэ нічога невядома.

Ці будзе край? Ці прыйдзе зноў вайна?
Ці проста да вясковага вакна
смерць зазірне і замаўчыць знаёма?

І вось мінуў той час, прапаў той лад.
Здаецца – і шляхоў няма назад.
Вайна і смерць – на поўначы і поўдні.

А сніцца бусел і трывожыць сон...
Што з-пад адлокаў белых бачыць ён?
Што ведае? Пра што адвеку помніць?..

www.kamunikat.org

## Ноччу на хутары

Па вячэры не выйшла размова ізноў.
Неяк душна і сумна, газніца гарыць.
Заблукаў гэты Край паміж явы і сноў –
і пара перастаць пра яго гаварыць.

Нешта вечнае мроіцца ў гэтай глушы.
Лёс пачатку не меў – і канца смерць не дасць.
Слепа бліскаюць фары на блізкай шашы.
Толькі поле вакол, і няма дзе прапасць.

Не прапасці, не згінуць у цемры такой,
дзе адны матылькі не баяцца святла,
дзе спакой нібы смерць, і дзе смерць як спакой,
і дзе некалі наша Айчына была...

## Снег над зямлёю

Забыты свет застаўся далёка
ад Бога, дзяцей, саламяных стрэхаў,
ластаўкай паляцеў высока,
мужыцкім возам даўно паехаў

праз памяць, лес і масток над рэчкай,
праз места грукат, смурод заводаў,
даўно растаяў каляднай свечкай,
даўно памёр між чужых народаў.



www.kamunikat.org

Няма нічога. Адна завея
у белым полі ваўчыцай кружыць,
сад замярзае і бор чарнее –
і сам не ведаю, куды рушыць...

## Дэмакратыя

Каталік бяжыць у касцёл,
праваслаўны ў царкву.
За кароўнік варона ляціць,
за мяжу дэпутат.
Спекулянт глядзіць на Стамбул,
генерал на Маскву.
Толькі мокне адзін пад дажджом
самотны вуніят...

* * *

Не прашу дабра чужога.
І па грошы да старога
на падворак не пайду.

Не збяднею ў гэтым Кра́ю.
Як не ма́ю – дык не ма́ю.
А не ма́ю – не краду.



www.kamunikat.org

Чорны бор стаіць сцяною.
Ліха цягнецца за мною.
Лета цягне ўверх траву...

Лёгкага і так не ма́ю.
Лепшага не дачакаю.
Лішняга не пражыву.

## Песня пра апошняга маёра

Як палае крывёю зара над Рэспублікай цеснаю!
Шал напаў на тутэйшых, а розум
адняў нейкі мор.
Тры лядоўні, сем шафаў і клунак
з любімаю цешчаю
на палутарку спехам кідае расейскі маёр.

Як любіў ён палі Беларусі
за крайнім кароўнікам!
А яго – на Байкал, а з Байкала – няведама дзе...
І ніколі не будзе таварыш маёр падпалкоўнікам,
і ніколі матуля не знойдзе зямлянку ў тайзе...

У Крамлі – падурэлі! Знайшлі сябрукоў,
пакалякалі,
аддалі Беларусь, дзе маёр акапаўся, як пень...



www.kamunikat.org

А цяпер на Расею плююць беларусы з палякамі,
следам чэхі, румыны, мадзьяры і розная дрэнь!

І ўздымаюць свае кулакі змагары недабітыя,
што Мужык-На-Кані на Маскву
                                        пераверне свой меч –
калі ўспомняць яны перамогі свае падзабытыя,
як апошні расейскі маёр на Маскву пойдзе прэч!

А пакуль што і тут з пахвалянкаю іх незалежнаю
ўжо няма больш таго, што было –
                                        і выносіць на двор
тры лядоўні, сем шафаў і клунак
                                        з любімаю цешчаю
і кідае ў палутарку бедны таварыш маёр.

## З нізкі «Чатыры пар*ы* года»

### I

Гарачым лугам у чырвань сыходзяць двое,
правальваюцца скрозь лета да непрытомнага раю,
цені, травы і шлохі сплятаюцца над галавою,
вянком два целы спавітыя, душны дзень дагарае,



www.kamunikat.org

памяць ужо атручаная, словы дрыжаць, як чмялі,
ужо дзесятая стома перасыхае ў горле,
двое ў сваім каханні забылі ўсё на зямлі
і доўга на белых аблоках плывуць, куды вецер гоніць,

куды нясе назаўсёды распуста лета сляпая
або жанчына ўцякае ад самой сябе пад замком,
калі, як пялёсткамі, пацалункамі аблятае
ці растае трускаўкаю пад языком...

**II**

Смецце. Восень. Смярдзіць плацкартным вагонам.
Сніцца разбураны хутар. У печы агонь дагарае.
Сала, міска з блінамі, спацелы графін з самагонам.
Смутак. У бліжнім лесе рэха грыбы збірае.

Сцежка бяжыць пустая. Прымаразак, павуцінне.
Гайдаецца час павучком, абрываецца вечным лёсам…
Лягчэе ў кішэні пляшка. Пуста цяпер у Айчыне.
Спакой – як пух за труною, прыбіты першым маразам.

Ах, тая восень… Болей такой ніколі не будзе.
Так блізка думкі да смерці падыходзяць паволі,
калі абрыдла хавацца ў нармалёвыя людзі
двум адзінотам бяздомным на хутары ў вечным полі...



www.kamunikat.org

## III

Жоўты цягнецца лёд. Чорны вецер вые з ракі.
На базарах далёка людзей абмінаюць сабакі...
Самы час на загад, каб да Вільні прыбеглі ваўкі
з чалавечымі мордамі па-над вопраткай колеру хакі.

Кроў і плюта. Абрыдлая плюта і кроў.
Памяркоўны спакой. Неакрэслены тлум беларусаў.
Абыякавы гоман між ворагаў і сябрукоў:
сексуальна-таварныя клопаты ў іх прафсаюзаў...

Цесна белай зімою... І душна прапасці за так.
Месца крамаў пустых напаўняецца
людам парожнім.
Сон, як гліна з абрыву, да долу ляціць, і скразняк
працінае да болю, як перад паўстаннем апошнім.

## IV

Так было – так мінула. Калі нават целам адным
быць не хочам даўно, і калі раздзіраюцца душы...
Над пасёлкам вісіць толькі лісця счарнелага дым.
Па дарозе канавы, балота і жоўтыя лужы.

Вось такая вясна. Тут рыхтуюцца час паканаць.
Назапашана ўсё – на сябе, на дзяцей і на продаж.

www.kamunikat.org

Смеху варта адгэтуль што клікаць,
а што праклінаць!
Перамелецца ўсё працавітым і сціплым народам..

Панядзелак. Дарога. Апошні тутэйшы дзівак,
на падпітку й няголены, доўга чытае газеты.
Клункі. Торбы. Суседзі. Знаёмы да болю бардак.
А за сто кіламетраў ужо пачынаецца лета…

* * *

Там, на стоках, – дзе Гаўя і Нёман спляліся, –
з хмызнякоў аблятае апошняе лісце,
луг даўно пабялеў ад мінулай жары...

Тут, у месце, панурыя людзі на бруку
абляпілі прылаўкі – і вечнасць па кругу
гоніць час, круціць нас праз пустыя двары...

А за блізкай мяжою пад мовай чужою,
як і тут, з непатрэбнай нікому душою
нехта блізкі, нармальны, жывы, такі сам...

А на вуліцах бруд ад бясконцага гандлю,
а душу пацягнула на Нёман і Гаўю,
а ў душы анічога – як выкінуў хлам...

* * *

Афарбаваныя то жоўтым, то чырвоным,
лясы бягуць і стогнуць за вагонам,
з табой развітваюцца назаўжды...

А ў полі вецер круціцца і плача,
і гоніць сон, і гэты плач дзіцячы
ўсплывае з памяці, як з-пад вады...

Ні голасу. Ні нават адгалоску.
За туманом адна старая вёска –
пустое поле, голыя сады...

А ты ўсё едзеш, блізка і далёка,
а ў памяці балотная асока
і матылі над цемраю вады...

* * *

Вечны дзятлік дзяўбе і не можа прабіць
тую глуш, у якой задыхацца і быць
так, як быццам не быў ты ніколі.

Што тваё і што маеш са сціплых надзей,
гэта ведае кожны з маленькіх людзей,
перабраўшых маленькія ролі.



www.kamunikat.org

Лёгка ўсё разумець і разумнаму ніць!
Толькі дзятлік дзяўбе і не можа прабіць
тую крыўду – на час і на Бога.

Зрэшты, нават не крыўду, а выбар пусты,
ды яшчэ невядома – ці сам выбраў ты,
ці ўжо так павярнула дарога.

* * *

У Вільні – як у Вільні. Цэлы свет.
Старыя брукі. Цесна ад касцёлаў.
Аблокі нізкія над вежай Гедзіміна.

За ўласнаю душой ступаю след у след.
За паланэзам восені мясцовай.
За пахам вапны, бітуму і дыму.

Кавярня. Сорак нацыяў кругом.
Каньяк і ром ў пустой вітрыне бара.
Скупыя кроплі ззяюць, як чмялі.

Тут, як у сне, – далёкі родны дом:
Пад ліпаю прытуленая пара.
Ах, Вільня, Вільня... Места на зямлі...

* * *

Нарэшце – дождж. Пад хмарай, як пад стрэхай,
зямля і людзі. І далёкім рэхам
бор уздыхнуў і выдыхнуў цяпло.

І восень. Верасень. Прыйшла пара другая.
Над чорным борам, над паблеклым гаем
другое існаванне пацякло.

Там свет той самы зменіць пакаленне.
Народы, межы, памяць і сумленне –
ужо другія, тых ужо няма…

А потым вецер з поўначы павее,
а з ім мароз, і груды, і завея,
і сам канец, і вечная зіма…

* * *

Калі пачнецца нешта ў гэтым брудзе,
загіне край і нас даўно не будзе –
і гэта лепш, чым да канца дажыць.

Нам не даруюць суддзі маладыя,
нас не дапусцяць новыя святыя
раней за іх з Айчынай разам быць.



www.kamunikat.org

Як быццам тут не на касцях забытых
зноў загарлаюць зграі новых сытых –
пра Бацькаўшчыну, веру і народ!

Хто той мастак з бародкай вечнамоднай?!
Што плача ён па Беларусі роднай?
Нашто ён трушчыць той крывавы лёд...

* * *

Між вольнымі людзьмі такая сувязь ёсць,
якую ў час разні не сплямяць кроў і злосць,
святая вера, крыкі ды разлікі!..

Мы ўсе сыны сваіх народаў праз вякі,
але калі чужых цкуюць твае бацькі,
такі народ не можа быць вялікі.

Вось ты ўсё прачытаў – і брат ужо не брат
А памяць, як змяя, заслізгала назад,
на смак крыві, па дурасці пралітай.

Запомні, брат, калі агорне злосць:
між вольнымі людзьмі такая сувязь ёсць –
вышэй яна за Край наш паспаліты...

* * *

Заўсёды так. Спачатку звычка вечная,
за ёй прасвет ды ісціна бясспрэчная,
за ёй імёны ўсіх святых яе.

І хлапчукі з надзеямі зялёнымі
ідуць сляпой калонай за імёнамі,
а не за ісцінай – бо што яна дае.

А потым між святымі цесна станецца,
адзін стаўчэ другога – і праглянецца
другая ісціна і трошкі іншы лад.

А хлапчукі, увагі не звяртаючы,
на гэткі дробязг, йдуць не разважаючы –
назад, набок, наперад і назад.

* * *

Так лёгка навучыцца ўладу браць.
Так цяжка проста жыць і паміраць –
ні веры не мяняючы, ні Краю.

Так лёгка веру мець – каго далоў.
Так цяжка зразумець, каго ізноў
паставіць – каб не мець такую ж зграю.

www.kamunikat.org

Так лёгка жыць сумленна – аднаму.
Так цяжка выбіраць за лёс турму
з нагоды разыходжання з сябрамі.

Так лёгка з пераможцам сябраваць.
Так цяжка потым вочы адкрываць
натоўпу за сляпымі змагарамі.

* * *

Капрыз гісторыі? Ці толькі лёс народа?
Не наша гэта справа, і свабода –
не наша справа. Не такія мы.

Як загадаюць, тая будзе воля,
такі парадак і такая доля.
Шлях да нічога – ясны і прамы.

А як яшчэ? Нам добра й без нічога.
Як загадаюць – тая і дарога
хай будзе лепшая, абы не да турмы!

А гэтая Айчына ці свабода –
адна хвароба для душы народа
і страта часу. Не такія мы.



www.kamunikat.org

* * *

Старыя святы зменяцца на новыя.
Але раённыя і мястэчковыя
зноў не разгубяцца кіраўнікі.

Старыя аўтары памруць, і будуць новыя.
Але адвечныя і бесталковыя
задамінуюць зноў тэкставікі.

Старыя праўды і надзеі новыя,
падобныя, як дзеўкі паўграшовыя,
па душы пойдуць, быццам жабракі!

Старыя вуліцы, і атынкоўкі новыя,
і вечны дробны дожджык над галовамі,
і вечны шум вятрыскаў і ракі...

* * *

Лішнімі бедныя будуць, пакуль свет стаіць.
Гэта прыроды закон – і не нам з яго кпіць.
А справядлівасць, па сутнасці, свет не мяняе.

Быў ты на доле ці дзесьці да ўлады далез –
а прыйдзе час, і шуміць над магілаю лес.
Кожнаму неба бяздонне сваё адчыняе.



www.kamunikat.org

Там толькі час без канца круціць нейкую ніць,
толькі над Нёманам вецер заходні ляціць,
толькі рака нашы косці з пяску вымывае...

Некалі прыйдзе на Нёман другі чалавек –
сядзе, закурыць і толькі ўздыхне – цяжкі век! –
і пазайздросціць мінуламу нашаму краю...

* * *

Дарога цягнецца. Спякота дражніць громам.
Перапаўзае абмялелы Нёман
аўтобусам падняты ў неба пыл..

Царква. Тры крамы. Белая авечка.
Ці дажывае, ці то спіць мястэчка,
бялізну звесіўшы, як мах апошні крыл...

На аўтастанцыі два мужыкі п'юць піва
з літровых слоікаў, і цягнецца цярпліва
размова вечная, як гэтая зямля...

Пра суш, пра Сталіна, пра бабаў, пра зарплату,
пра тое, што парторг будуе сыну хату,
і да каго яшчэ схадзіць узяць рубля...

## 1413 год
## Гародля над Бугам

Немец пабіты. Святкуем з Эўропай яднанне.
Каталікі атрымалі ге́рбы – гэй, славяне!
І праваслаўным няма чаго плакаць ізноў –
як сабе мелі, няхай пакуль маюць князёў.

Князь Аляксандар з каралём Ўладзіславам,
ваўкі два старыя,
новую рэзь наклікаюць – ад Бельска па Лепель.
Роўнасці роўная роўнасць бывае... пятлёю на шыі.
Край разарвецца вайной! А хацелі ж, як лепей...

Лепей не трэба хацець. Не направіць сам Бог чалавека,
як напраўляюць тупую сякерыну кругам.
Свята. Стаяць пад царквою –
калека, калека, калека...
Немец пабіты.
І свята ў Гародлі над Бугам.

## Вунія

Пётр Скарга расколаты крыж захацеў падняць.
Але нават Ісус толькі цэлы насіў.
І там, дзе ўчора адзін збіраўся яднаць,
сягоння сотня бяжыць – і рвуць з усіх сіл.

Леў Сапега адвечны хай захацеў спыніць.
Але гэты люд толькі з хаем знацца прывык.
І там, дзе ўчора пан адзін меў суды чыніць,
над усімі расправу сягоння чыніць кожны мужык.

Вось і выкупалі Трэйці Крыж у крыві.
Толькі кроў Кунцэвіча – не Ісуса кроў.
То на Небе адно, а інакш на зямлі,
на глухой зямлі ў час дажджоў, вятроў...

## Паўночная вайна

Эх, і ўдарылі Сапегі на Агінскіх!
Ох, і ўмазалі Агінскія Сапегам!
І чакае пан Агінскі палкоў рускіх,
І чакае пан Сапега палкоў швэдзкіх...

Неба стала з аблачынку – во як б'емся за айчынку!
За дзяўчынку так не б'юцца.
Во як б'емся – аж смяемся!
– Стой, панове! Гэта з нас ужо смяюцца...
– Ах ты, здраднік! На асіну таго немца!

Папялішчы на Айчыне. Здраднік сохне на асіне.
Швэды скінулі штаны. Замірыліся паны.
Пётр гуляе ў Пецярбурзе. Недзе нешта нейк будзе.
Едзе вош на мужыку. Шляхта разам – у шынку.

## Станіслаў Аўгуст Панятоўскі

Не трэба нам чужой хлусні з наезным гнюсам!
І не па іх сягоння пусцім мы слязу...
Вось – Панятоўскі! Быў прыродным беларусам –
бо нават прозвішча сваё пісаў праз «*у*»!

І на вякі вякоў яму за гэта слава!
І памяць вечная за шчырасць з дабрынёй!
Бо ён даваў усім налева і направа –
паводле звычаю між нашай вяскаўнёй...

А то ж спакою не было даўней, мой Божа –
шумеў чарот і дрэвы гнуліся, пся маць!
Ды беларус адзін сапраўдны толькі можа
Рэч Паспалітую на тры канцы раздаць...

## Адам Міцкевіч

Адам Міцкевіч што ў Наваградку, што ў Коўна
жыў небагата, але дыхаў поўна.
Няшмат было на свеце светлых дзён –
да Польшчы так і не даехаў ён.

Паэт спакойна памірае рэдка –
ў Канстанцінопалі расійская разведка
атруціла Міцкевіча, каб ён
не набіраў там новы легіён.



www.kamunikat.org

Сто пяцьдзесят гадоў прайшло – а я ўсё плачу.
Сто пяцьдзесят гадоў прайшло – а я ўсё бачу,
як пад наваградзкі святы касцёльны дах
нясе Тадэвуш Зосю на руках...

## З нізкі «Чорныя касінеры»

### PRIMO

Дождж над мястэчкам... Бясконцы, як смутак Бога.
Вечнай дарогай сцякае свая праклятая гліна.
Масток над рэчкай. Закутак даўняга і былога.
Жыве, працуе, здыхае моўчкі гэта краіна.

Постаці з мокрых магілаў кружаць па наваколлі –
нашыя, і чужыя, і тыя, хто сам не знае...
Краіна не мае мужа. З панам жыве ў няволі –
і ёй непатрэбная воля ні з чужакамі, ні з намі.

Лепшыя польскія курвы з нашых растуць пакаёвак.
Лепшыя рускія блядзі з нашых растуць каханак.
Бывай! мы ўсе паміраем – ніхто
не схаваецца ў словах.
Тут нават Цябе не будзе, у кожны крык цалаванай...

## SECUNDO

Вось міма чорных вокнаў губеранскага места
ляціць генерал Мураўёў, тутэйшыя скачуць за світай –
падпанкі, падафіцэркі, падбрэхі з дарогі цеснай
праціснуліся, пралезлі мала не да міністраў.

Пан губернатар спаўняе прысягу цару і Расеі.
Свайго не мае нічога – нічога й тут не пакіне.
А мы? Калядныя дзеці, зробленыя з пахмелля...
А мы? Яшчэ хутаране – і страшна служыць Айчыне...

Слухай, дык хто ж мы такія? Усіх халуёў праблема,
усіх падшыванцаў мука, усіх слабакоў пакута...
Схіляюцца лёгкія цені, падаюць на калені,
робяць з Расеі Эўропу – не прападае мінута...

Чэсць вам, героі гною! Бог вас крые-ратуе!
Дзеткі вашыя пойдуць на стэпы ды акіяны
служыць імперыі гіблай, якая ўжо ванітуе,
якая нават ляніцца каваць для дурняў кайданы...

## TERCIO

Кінуў мужыцкі анёл Храм На Крыві, Беларусь.
Яна пад сынкамі-чыноўнікамі,
як пад казачым харунжым...



www.kamunikat.org

– Вешаць, вешаць і вешаць!!! –
кулакі сціскае Кастусь.
А дзе ж іх усіх павесіш! Народ гэты
просты і мужны.

«Ну што вы яго шпыняеце, гады вы, саплякі?!
Якой вам яшчэ свабоды?! Вы ж рускія,
праваслаўныя!
Ну што вы хочаце, сволачы?
Каб к р а й  існаваў такі?!.
Шкада-а... Не даў Мураўёў над вашаю
доляй права нам...»

## CVADRO

Арышт. Нарэшце канец. Бяззбройнаму – гэта рай.
Самотны змоўца й герой заўсёды памрэ спакойна.
Бывай, «*Россия, ты матушка!*»
Бывай, «*наднемэньскі край*»
– Вешаць, вешаць і вешаць!!! – і гэта зусім не бойня.

Не бойня гэта таму, што вы на зямлі ніхто.
Не бойня гэта таму, што вам нічога не трэба.
А той, хто вешаць хацеў, зашпільвае паліто
і сам, як Ісус Хрыстос, праз пятлю
ўзыходзіць на Неба…



www.kamunikat.org

## ALLEGRO

На могілках танцуе з крыжам крыж.
Ты на Айчыне дарагой стаіш.
Спакой. Дарога. Ноч і цішыня.
Адзін народ другому не раўня.
Няхай падох бы, хто прадаў свой край?
- А хрэна! – кажа. – Сам ты памірай...

## ANDANTE

Панны пад пудрай адною ды ў тонкіх сукенках.
Баль пачынаецца... Грошы, распуста і ноч.
Дзесьці далёка блукае Хрыстос па засценках,
як арандатар, – і долі інакшай, апроч
дымнай царквы і халоднага вечна касцёла,
зноў не знаходзіць. А словы дарэмна ляцяць...
Бо ж у народзе і краі такога памолу
вечную дур не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Панны пад пудрай адною... Завязаны вочы...
Схованкі, піскі ды шлохі па ціхіх кутах...
Тое ж у простых сялянаў ды простых рабочых –
толькі што горшая выпіўка. Цяжкі іх шлях...
Што паміж ножак у файных і тонкіх паненак –
тое ж і ў гэтага краю адно ў галаве.
Вось і Хрыстос, абмінуўшы апошні засценак,
нас пакідае і ў краі суседнім жыве...



www.kamunikat.org

## SCERCO

Эх ты наш рабочы клас дарагі!
Як ты спраўна стаў пад бел-чырвона-белыя сцягі!
Як ты ў адзін голас за іх галасаваў!
Калі табе ЦК заробку не даваў...

Эх ты наш калгаснік дарагі!
І ты пайшоў пад гэтыя сцягі!
Калі твой старшыня й народны дэпутат
за гэты сцяг быў змушаны падняць свой мандат...

## FINALE

Божа, калі Ты жывеш на свеце, гэтым і прышлым,
Божа, калі ты будзеш, памятай: тут нічога
не зробяць такія дзеці,
калі Ты сам нейкім цудам
гэты край не разбудзіш...

Божа, калі Ты з намі, калі Табе не абрыдла
ратаваць нас бясконца ад глупства, хамства і страху,
Божа, зрабі, каб здохла усё местачковае быдла, –
а сэрца мне вырві, Божа, аддай галоднаму птаху...

Але ніхто не паможа – у рай не адчыніць дзверы,
і Ты прабач мяне, Божа, – позна Цябе я выбраў.
Смерць падняла ў атаку чорных сваіх касінераў –
яны такія ж, як нашы: у мокрых і брудных світках...

## 1863 год.
## Развітанне з Радзімай...

Тут шлях адзін у выдуманы рай
дае сваім жаўнерам гэты край –
на снезе запяклася кроў, як хустка,

і мрояцца ў прабітай галаве
ўсе маскі мёртвыя і тыя, хто жыве,
а холад, слёзы, цемра, час і пустка,

як павукі, снуюць паволі ніць,
бяздушшам, страхам, здрадаю смярдзіць,
і ўсё, чым жыў, дарэмна прападае,

і толькі ў небе ёсць дачка і ты,
спакойны хутар, бераг залаты,
Айчына вечная, свабода маладая...

## Міхал Каяловіч

Ні мовы няма, ні народа.
Ніхто нічога не хоча.
А шляхта крычыць: свабода! –
і Польшчай аслеплены вочы...

Адзін. У Санкт-Пецярбурзе.
Прафесар – якіх дзесяткі.

www.kamunikat.org

На пальцах палічыш – хто людзі.
А так – як учора са статку.

Ні грошай няма, ні парады.
Жывеш – а душа ў магіле.
Што ж – трэба, каб імператар
наеўся... Заходняй Расіяй.

Хай будзе хоць «*триединство*».
Гэта больш, чым нічога.
Потым – з Вільні і Мінска
пачнецца свая дарога.

А ён, хто паклаў пачатак,
дастане тутэйшай пашаны:
у кнігах «удзячных» нашчадкаў
трапіць у цемрашалы...

## 1866 год
## Выбраныя сцэны губеранскага места Гародні

Сумны, пануры дзень пад Фарным касцёлам.
Пяхотныя афіцэры, жыды, урадоўцы.
Поп Мікалай трасе пальцам на пана Малахоўскага:
ска-азана ў Пісанні! павязуць усіх палячышак



www.kamunikat.org

на Сібір пры цары Іосіфе,
начыста вытрасуць каталіцкае семя...
А пад жыдоўскаю крамай пані Малахоўская
сон апавядае пані Дэмбіцкай:
конец свята юж бэньдзе!
прыйдзе немец плюгавы, на іме Гітцэль,
але ўратуе Пан Бог людзей пажондных,
адных жыдоў вымяце жах
з мейсца сэймовэго...

А Леон Ройзман бядуе ў краме;
сын ужо не жыд – змарнаваў грошы на пашпарт;
цяпер Аляксандар Львовіч Раманаў,
манархіста расейскі, курва яго маць...
А чуў, Шмуцусь, што кажа рабін?!
У прышлым стагоддзі на жыдоўскіх могілках
ляжа роўнае поле, званае стадыёнам,
і голыя прывіды бычы пузыр будуць біць нагамі –
разам з Леона тлёнам...

Тымчасам на далоні паручніка Іванова
цыганка долю чытае:
сто гадоў царква прастаіць, дзе паручнік браў шлюб
з *Nadine*, маладой і прыгожай,
а якую царкву мужыкі і паны-недабіткі
фарай Вітаўта клічуць упарта,
узнясецца на Неба... і пылам каменным асядзе,

а на месцы тым новых святых
на сцяне-мураванцы налепяць,
а нядоўга й яны правісяць...
Сам збялелы, як смерць, цягне шаблю паручнік.

Мужыкі ж па дарозе на Скідаль
плётку бабскую цягнуць – як малітву да Бога:
кажуць, дзесьці ў Амэрыцы
шмат зямлі і паноў не бывае,
чынш не трэба плаціць...

Пасміхаецца сумна пан Малахоўскі:
сам Касцюшка прынёс ёй свабоду,
Амэрыцы вашай, хам-мскае быдла,
а вярнуўся хоць генералам,
а шчэ горшай галотай.
– Не кахаеце Польскі...

Сумна, страшна, панура. Канца не відаць...

...неяк, проста з гулянкі,
стане дрэнна папу Мікалаю –
пражыве толькі тыдзень.
Сын загіне пад Вяткай –
застрэліцца пан Малахоўскі,
і, пярсцёнак прадаўшы, пойдзе ўдава да прыслугі.
Леон Ройзман памрэ – як яўрэй!

Сын – прап'е за год краму...
Службу скончыць паручнік –
мёрзлым мясам на Шыпцы крывавай.

Сумна, страшна, панура. Канца не відаць…

## Маёўка гімназістаў на беразе Нёмана

Які ўжо раз дагэтуль і цяпер!
І праўду ведаем, і рацыя за намі...
Які ўжо раз ні зброі, ні сяброў!

Спіць розум – і варочаецца звер.
Сон белы з акрываўленымі снамі
зліваецца – і нараджае кроў.

Які ўжо раз ідзе крывавы Час!
Ні вершніка з мячом, ні Маці Божай
на даўняй палатніне баявой.

Свае ж халопы спусцяць скуру з нас.
А правы бераг з вечнаю Каложай
пакоціцца – і ў Нёман галавой...

www.kamunikat.org

## 1894 год
## Кастрычнік, Гародня...

...тут замёрзла, як Нёман, глухая ад страху кроў.
Адзін гамоніць базар. Пахне сенам, летам і лесам.
Тут яшчэ дажываюць бясконцыя сто гадоў –
і мястэчка губернскае спіць, як за Венскім Кангрэсам.
Тут адменена рабства – і галоднымі ходзяць рабы.
Тут каталічкі-паненкі за рускіх ідуць афіцэраў.
Тут прыяцель кожны любы – і вораг кожны любы.
Тут пярэдні край барацьбы. За Цара, Айчыну і Веру...
Цень бясконцай імперыі ценю Фары даўжэй.
Памёр імператар адзін – у Маскве карануюць другога.
Піск царкоўных мышэй. Сера жандармскіх вушэй.

Суботні шабас. Поўна людзей.
Сінагога ледзь дыхае у цесных завулках...
Дожджык перастае. Прыйшоў сталічны цягнік.
Ад вакзала ляцяць пралёткі.
Шваль свая і варшаўская барахло прадае.
І гуляюць фабрычныя дзеўкі і... з гімназіі цноткі.
Гніль імперыі ліжа з-над Нёмна туман.
Трэскі. Брудныя брукі. Смурод гарбарняў.
Ходнікі з дошак. Крамы. Скрыпкі рвуць рэстаран.
Шпанюкі з нахабнымі мордамі круцяцца ля кавярняў.
Цень бясконцай імперыі даўжэй за час і прастор,
Людзі ідуць на службу. Потым ідуць абедаць.

Сонны спакой. Сонны век. Сонныя дом і двор.
Як добра быць, як усе! Як добра нічога не ведаць!
Як добра жыць і не бачыць,
што свету прыходзіць канец!
Падполле. Лісткі і бомбы. Трох імператараў свара.
Мільёны ліпнуць да пальцаў. З Нёмна на Асавец
цягаюць камень на крэпасць. Страх вайны і пажара
ноччу і белым днём круціцца ў душах, як звер.
Цень бясконцай імперыі цягнецца з комінаў дымам.
Так – як было і будзе. Некалі і цяпер.
Служачы банка гуляе з жонкай і сынам
Максімам.
Побыт цячэ дзень за днём у сталіцы вечнай
глушы...
...і раптам зорка паслання перакрэсліла неба!
Глядзіце – ужо нарадзіўся хлопчык чыстай душы,
пасланы гэтаму Краю, якому нічога не трэба!
Ні веры, ні адратунку, ні хоць бы звацца людзьмі,
ні стаць хоць нейкім народам
між Фараю і Каложай,
і сораму ані кроплі... і хлопчык згарыць грудзьмі,
пасланы гэтай зямлі Паэтам Міласцю Божай.

www.kamunikat.org

## Марыя Багдановіч

Маці Марыя на гродзенскіх могілках спіць.
Камень паставіў па ёй Панцялееў Валодзя.
Надпіс і крыж. І ніякае медзі – і годзе.
Маці душа і без медзі на Небе звініць.

Камень стаіць каля сцежкі да белай царквы.
Злева Ісус, а направа спіць маці Марыя.
Праз два імёны Гасподзь нас ратуе і крые,
каб не загнала нас смерць у канавы й равы.

Трэйцім у Тройцы Святой – сын Марыі Максім.
Ён пахаваны далёка. На неба ўзняты.
На пілігрымку выводзіць дарога да Ялты.
Праўду казалі – праходзіць Паэт Крым і Рым.

## Адам Багдановіч

Беларус Адам Багдановіч... беларусам
не быў свядомым.
Бо паехаў жыць у Расію і там рускім
зрабіўся шчырым.
Але – тры тысячы кніжак бухгалтар
просты меў дома.
Сын прыгоннага кухара. Бацька вялікага Сына.

А сына яго Максіма Гасподзь да сябе паклікаў
свечкай згарэць у цемры і красу адагрэць ад смерці,

www.kamunikat.org

бо Адам ужо з хамаў вылез –
і Максім не на грошы маліўся,
і сэрца білася вольна, і розум яго быў светлы.

З беднай сялянскай хаты ў вечным прыгоне грошай
можна выбіцца ў людзі, але душа будзе рабскай.
А толькі ў вольныя душы дух уваходзіць Божы.
А мы цэлы Край зраўнялі
да беднай хаты сялянскай...

## Матылёк

Як сіні матылёк над белым снегам
цвітучай вішні, так навокал нас
ляціць і кружыць, і ліхім набегам
шалёна вые і ўсё паліць час.

Нядоўга чалавеку жыць на свеце,
нядоўга ў небе матыльку дрыжаць –
калі пасеяў нас аднойчы вецер,
то прыйдзе бура нас аднойчы жаць.

Што ж, матыльку ляцець адвечным следам,
і ён ляціць – за бурай, за зімой,
за белым снегам, Ноевым каўчэгам,
за мглістай абяцанаю зямлёй...



www.kamunikat.org

## У Яраслаўлі

Як няма выгоды сталічнай –
скарыстаю з пагоды слічнай!
Пакуль вараць абед
і пузаты пыхціць самавар,
прышпілю на пiджак
ружу белую графкай англійскай
і на шпацыр сонечным днём
пайду на бульвар!
Яраслаўль – горад маленькі.
Трохсоттысячны толькі горад.
І ўсе з лепшых дамоў дзяўчаты
здаўна ведаюць, што я хворы.
Ну, пайду да рэдакцыі «*Голоса*» –
раптам там капейку налічаць?!
І сустрэну Дзяніса Дзябольскага
з яго малой Веранічкай...
...так і будзе са мной.
Так і памяць плугам падыме
і адваліць назад
пражытае ўсё на Крыме,
дзе памру ў адзіноце,
якую сабе наклікаў,
і апошні ў вачах
стане сквер з малой Веранікай...



www.kamunikat.org

## Прыезд на Радзіму

Так моцна пакахаў яе здалёку,
так часта ў снах прыходзіла яна,
гаіла боль, лячыла адзіноту
і клікала насустрач, як вясна.

І я ляцеў душой сваёй і целам,
і дыхаў яе светам залатым –
яна чакае недзе там, у белым,
у ясным, у нябесным, у святым...

Але ў святым і векапомным Краі,
як выкідыш, пачуўся я ў тры дні –
там аддаўна жыла зусім другая,
з чужой, варожай і дурной радні.

Не цяжка жыць і паміраць, мой браце!
Але за што, за што ляцець на шкло
і без сляда згарэць, і ўсё ж не здрадзіць,
не здрадзіць той, каторай не было?!

## Элегія

Людзі ўсялякія ходзяць пад Богам,
кожнаму дадзена доля свая –
і не прашу я ніколі нічога,
проста жыву час адведзены я.



www.kamunikat.org

Смерць параўняе ў шыхтах пад зямлёю,
як нававбранцаў, пустых і святых –
я не баюся, што будзе са мною
ні ў днях зямных, ні ў вяках залатых.

Праўды і той нашым людзям не трэба,
што ж без канца пра красу гаварыць –
хлеб у іх будзе і будзе да хлеба,
толькі краса без астатку згарыць.

Так і душа мая лёгкая дымам
проста ў нябесы ўзляціць над гарой,
вецер развее і хмарка абдыме,
дожджык страсе яе слізкай парой.

Не шпацыруйце дажджыстай парою!
Схопіць прастуда, захочацца жыць –
і наплывуць невядомыя мроі,
і нечакана душа забаліць...

## Максім Багдановіч

Прароцтваў не прыпісвайце Максіму!
Да беларусаў пасылаць Месію
даўно не мела сэнсу – і таму
быў лепшы талент дадзены яму.



www.kamunikat.org

І Рыцар Збройны на кані і з мечам,
і сам Гасподзь над родам чалавечым
не раз Айчыну беглі ратаваць –
а нам было заўсёды напляваць!

Як не хацеў ён зноў крывавіць гэта!
Ды боль з адчаем давялі Паэта –
і хворы ўжо, і ўжо на сконе дзён
не вытрымаў: Пагоню клікнуў ён...

## Ліст Пятру Гапановічу пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года

Эх, Пеця, Пеця... Жыць няма ўжо сілы!
Няма як дыхаць, бо не лёгкія – нарыў.
А нашы дурні зноў пабеглі да Расіі –
ім сорак бочак новы лад нагаварыў.

Бог прыбярэ мяне – і ўбачыць не паспею,
як будуць бедных і багатых рабаваць,
спірт неразведзены гасіць і «за Р-расею!»
адзін другога будуць вечна забіваць.

А хто з іх, Пеця, будзе белым, хто чырвоным –
ці не ўсё роўна?! Контрразведка і ЧК
адных і тых людзей піхаюць у вагоны,
на баржы грузяць – ад званка і да званка.

www.kamunikat.org

Мне даў Гасподзь, якому я не верыў,
адно дабро: прарокам я не быў –
я проста жыў, я не зрабіўся зверам,
дзяўчат любіў і Беларусь любіў.

## 25 траўня 1917 года
## Смерць Паэта

Ты не дажыў да Актаў і Дэкрэтаў –
але не гэта страшна для паэтаў.
Адно шкада – пісаць бы мог і жыць.

Ты не сустрэў ні трыццаць пяць, ні сорак.
Ты не дажыў да чыстак і разборак –
ОГПУ не стала справу шыць.

А каб дажыў – схавалі б глуха ў шафу
і раздавілі ў лагеры, як жабу,
пусцілі Слова на распыл ляцець.

О, што за Край, пракляты і нялюбы,
дзе Кнігу, Волю і Жыццё ад згубы
...заўчасная адна ратуе смерць!

www.kamunikat.org

## Неадасланы ліст да Янкі Купалы

Я паміраю, стары.
Боль ужо з краю да краю.
Свет разляціцца стары –
цемра за ім маладая.

Зменіцца лета зімой –
лёгкай пагоды не будзе.
Хай не спяшаюць за мной
з марай наіўнаю людзі...

Як там, Луцэвічаў Ян –
плачаш ізноў пра зямельку?!
Сеяць сабраўся, вась пан?
Сей! Толькі жаць будзе нельга.

Слова ў цябе адбяруць –
хаму твой плач непатрэбны,
сэрца тваё абкрадуць –
і пакаленне дарэмна
пойдзе ў пажар і бур'ян,
гнанае ў свет тваім плачам...

Слухай, Луцэвічаў Ян,
а ці магло быць іначай?!



www.kamunikat.org

Я не пясняр. Я юрыст.
Я галавы не губляю.
Я ўсе навукі прагрыз –
долі не будзе ў тым Краі.

Будзе рабунак і бунт,
кожны ў любога пацэліць –
і атутэйшаны люд
Польшча з Расіяй падзеляць.

А што прыдумала Край
ў Вільні масонская ложа,
толькі паглыбіць раздрай –
так, што ўсіх смерць пераможа.

Там, дзе народу няма,
простаму ж люду «усё роўна»,
можа быць толькі зіма,
толькі глухая зіма,
толькі гнілая зіма –
як у маленстве ў тым Гродна...

## 1920 год

Лета здзічэлых садоў раздзіраецца громам.
Чырвоная кавалерыя пераходзіць Нёман.
Сорак плямёнаў ідуць, унукі хана Чынгіза...



www.kamunikat.org

У расхрыстаным Краі паміж Варшавай і Мінскам
чырвоны пыл над зямлёй і свінцовая навальніца,
лета здзічэлых садоў разрываецца громам...

Скончылася амуніцыя. Выйшаў даўно фураж.
Неба ў пажарах. Дарогі ў фурманках. Страшны міраж.
Штыкамі, нажамі, лапатамі б'юцца пад
Радзымінам...

Б'юцца дывізіі з Крэсаў – за чужую Варшаву гінуць.
Але не дадуць яны мачаху ўнукам хана Чынгіза...
Стаіць Варшава.
О, чэсць вам, панове, але гэты горад не наш...

## Станіслаў Булак-Балаховіч

Час скончыўся. Вайна ўсіх параўняла.
Варшава, Вільня, Рыга, Пскоў і Гдоў.
І хамы сабе маюць генерала!
Шэсць ранаў. Шэсць франтоў за шэсць гадоў.

У Рызе дзеляць – як у грудзі цэляць.
Край ба́цькаў раздзіраюць на шматкі.
Адзін твой корпус. Апусцела сцэна.
Ідуць на бой палескія палкі.



www.kamunikat.org

У вёсцы голад. У салонах пышнасць.
Бальшавікоў сядзіць у Мінску раць.
А на цябе – усе пагромы спішуць.
З дачкою жыда шлюб няможна браць...

## Вацлаў Іваноўскі

Інжынераў мужыцкаму Краю не трэба.
А навінкі яго галаву толькі дураць:
бо дае ён на кніжкі, дае на газэты...
А мужык замест кукіша зноў мае дулю.

Нас не купіш, што пан па-мужыцку гаворыць.
Тая мова дурная смярдзіць адным гноем.
Сам сядзіць у Варшаве, не ведае гора,
і браты на пасадах – ці двое, ці трое.

Слухай, братка! З Усходу як прыйдуць «саветы» –
разнясем на кавалкі Лябёдку мы тую!
На той свет хай выносіць сваіх ён паэтаў
і няхай на тым свеце іх кніжкі друкуе!

www.kamunikat.org

## Браніслаў Тарашкевіч

Чаму такі ўжо лёс? Чаму заўсёды позна?!
Хоць сам ты на «Граматыцы» сваёй накрэслі крыж...
Сярэдняя Літва далучана да Польшчы.
А ў польскі Сэйм крычаць – як да глухіх крычыш.

У Цопат тайняком? Па грошы да «саветаў»?!
Эх, што з таго жыцця – калі ляцім да зор...
І грымне Грамада – кароткая, як лета.
У гродзенскай турме даўжэйшы калідор.

Мяжа. Абмен. Масква. Чырвоным дробным клеркам
цягнуць свой рэферат, сваёй чаргі чакаць
да ямы са сваім расстрэльным пакаленнем
і думаць, ці пачнуць «Граматыку» чытаць...

## 1939 год

Скончыўся перапынак паводле актаў Версаля.
Новае пакаленне выступіла ў паход.
Танкі ўжо пад Варшавай.
«Юнкерсы» над Варшавай.
У верасні наступае першы ваенны год.
Рыжскі падзел ганебны больш нікога не дзеліць.
Танкі даўно за Нёманам.
Са слупоў «*говорит Москва!*».



www.kamunikat.org

Мястэчка стала райцэнтрам.
У мястэчку кірмаш. Нядзеля.
Ходзіць зямля пад нагамі. Кружыцца галава.

Звыклы пры кожнай уладзе жыць у ладзе і згодзе,
люд тутэйшы гадае: які ж гэта будзе лад?!
Як быццам усё ужо скончана... Эх, вясковы народзе!
Так хутка ён адгрукоча – у Брэсце супольны парад...

## 13 верасня 1942 года
## Скідаль. Заходняя Беларусь

Шыбеніца над мястэчкам. Людзей сагналі дзівіцца
для «орднунга» і для страху – каб ведалі, пся іх маць! –
як восем «савецкіх бандытаў» вяроўкай будуць давіцца
за тое, што не спалохаліся Райху ў плечы страляць.

Чырвоная Армія драпала – аж чорнае стала сонца.
Да сорак трэйцяга года не лезла сюды Масква.
Не было каму іх падманваць.
Не было каму арганізоўваць.
Але на плячах у кожнага ёсць свая галава.

Эй, крыкуны сталічныя пра ўплыў
праклятаы маскоўскі,
а ў сон крывавы не хочаце пайсці са мною назад?!



www.kamunikat.org

Там крайнім на доўгай бэльцы
вісіць Анатоль Зелянкоўскі...
Старэйшы брат мае маці, а мне ўжо малодшы брат.

## Мацей Каленкевіч-«Котвіч»

Хутар Сурконты. Лес. Трыццаць пяць палякаў.
Скончылася адна – ідзе другая вайна.
Вільню ўжо адабралі. І дарогі нідзе ніякай.
Лета сорак чацвёртага. «Котвічу» доля адна.

Доля парашутыста. Ноччу ступіць з самалёта,
потым блукаць у балотах, нарэшце дайсці да сваіх.
А вайна зусім не такая. Другая зусім перамога.
Ды малая птушка з маёра, каб спяваць аб справах такіх.

Доля парашутыста. Руку адаб'юць па локаць.
Рэха стрэлаў і крыкаў замуруе возера шкло.
Гадкая гэта работа. Горкая асалода.
Скочыў у Польшчу, а Польшчы там ужо не было...

## 1976 год. Мінск. Цяпер – Менск...

Над сталіцай саюзнай рэспублікі
ні хмаркі ў спакойным небе.
Лепшыя хлопцы з мястэчак спакойна едуць вучыцца.

Нашы савецкія танкі спакойна стаяць на Эльбе.
А ў крамах стаяць спакойна гарэлка, цукар, гарчыца.

А па-за сталіцай рэспублікі калгаснае жыта красуе.
Няма авантуры афганскай – няма афганскіх герояў.
Нідзе не відаць беларусаў – ніхто іх не паланізуе.
Жывуць спакойныя людзі без клопатаў і без мрояў.

## Зіма 1980 года

Танцпляцоўка пустая пад мокрым снегам.
Сквер у самым цэнтры мястэчка.
Грае ў сне аркестра самотных сэрцаў.
Хлопцы з восені служаць у войску савецкім.

Над скверам хмара вісіць анучай.
Скандал пачаўся ў кнайпе суседняй.
Танцаваць вучыся, а жыць гора навучыць.
У мястэчку зімой штотыдзень вяселле.

Свецяць экраны блакітныя ў вокнах.
Вайна далёка. У Афганістане.
Ну і што з таго, што хлопцы ў тым войску?
Адслужаць і прыйдуць. Абы дзеўкі чакалі.

Стала цяжка. З мясам. Потым – знік цукар.
Старая «Лазьня» робіць адно па суботах.

Толькі трое вярнуліся ў цынкавых трунах.
У адной панажоўшчыне згінула болей.

## Крыжакí

Горка. Дзеці. Жыжа ляціць з-пад санак.
Побач ваенны завод. Новы крыжацкі замак.
Далей – шырокая вуліца, прабітая да ракі.
І ездзяць вуліцай гэтай у тралейбусах крыжакí.

Дзеці савецкай халявы. Ні племені, а ні роду.
Ехалі на каўбасы з прамысловага Ўсходу.
Бронзавы Ленін на плошчы як калектыўны партрэт.
Кажуць – сям'я галоўнае. Але ж мэта жыцця абед.

Мэта жыцця абед і ў тутэйшых кнехтаў таксама.
Сядзіць па дурных інтэрнатах ачмурэлая вяскаўня.
Горка. Дзеці. Жоўтая жыжа ляціць з-пад санак.
Падрастае новая нацыя. Нацыя без імя.

## Мутанты

Апахмяляемся мутным гурковым расолам.
Потым завод. Прахадная з плакатам вясёлым.
Потым – жалезная жоўтая бочка і купка сяброў.



www.kamunikat.org

Потым – працэсія! Складчына пад «Гастраномам».
Кожны тутэйшы з рублём будзе лепшым знаёмым.
А тут усё ж трыста тысяч жыве жыхароў.

Родны ваенны завод у сярэдзіне васьмідзесятых.
Тысячы простых рабочых у чорных і белых халатах.
Не пераводзіцца дачны гурковы расол.

Правадыры – паміраюць. Штогод на заводзе жалоба.
Мутныя дні настаюць. І здаецца, на шыі народа
чорцік сядзіць і стругае асінавы кол.

## Слімак

На лузе дзядзька статак пасе.
Дробненькі дожджык ватоўку змачыў.
Слімак па лістоце адвольна паўзе.
Алкагалізм паэт падлячыў.

Стаіць на ганку і паліць ён.
Глядзіць на дзядзьку – бачыць народ.
Сніцца і ўдзень яму вечны сон –
пра Астрожскага і на Смаленск паход...

Дзень святы. Думкі – далёка пруць.
Верасень. Вёска. Поле і рэчка.
Слімак паўзе. Жыве Беларусь.
Цяпер і прысна, і вечна.



www.kamunikat.org

## На вуліцы Леніна ў Гародні

На вуліцы Леніна ў Гродна Ленін не жыў ні дня
і ні дня не жыла тут ленінская радня.
Але на вуліцы Леніна ленінцаў шмат жыве.
Ленінцы – гэта ў каго ўсё правільна ў галаве.

На вуліцы Леніна ў Гродна да камунізма крок.
У цемры кожны свабодны. На вуліцы плюта і змрок.
Але за вокнамі лямпачкі ленінскія гараць,
а людзі з блакітных экранаў жывым
не даюць паміраць.

Лезе з тых тэлевізараў казка аб вечным цудзе.
Новага зробім Леніна – калі надакучыць той.
А што жывем, як прыходзіцца, у запоі,
звычцы і брудзе,
то болей ніхто на свеце не мае веры такой...

## Пастаралька
## на 27 ліпеня 1990 года

Поўныя боты апілак, дулі ў пустых кішэнях.
Гразь, балота і смецце – след белага чалавека.
Чыхае трактар савецкі на лёс казённы і шэры.
«Трэба трымацца разам...» – хворага вучыць калека.

www.kamunikat.org

Брэша сабака навязаны – вольны хвастом віляе.
Галёкае Менскае радыё, будзіць родныя гоні,
паведамленні апошнія правільна паведамляе:
«Не трэба нам вашай Пагоні –
ў калгасе ёсць лепшыя коні!»

Але вакол бюракратыя – і ўсё ў галаве мяшаецца:
робіш толькі ды робіш, а дзе яна, тая свабода?!
Памёр тут адзін начальнік – а ў іх жа
ніяк не змяншаецца!..
Таму з глыбіняў народных нясецца голас народа:

«*Замок на сільпе павесілі...*
*Работы – адна толькі відзімасць*
*Ніхто не жалеіт дзірэўню...*
*Дак эта і вам ні забудзіцца!*
*О! Дзімянцей на сесіі атваюіт січас незавісімасць –*
*дак быстра сільпо аткроеця, імперыялісты*
*прыблудныя!..*»

Сонная здохлая хмара лянівa лезе на вёску.
Карова лянівa лётае з лёгкімі крыламі-марамі.
Бабы лянівa пляткуюць, што ў беларускім войску
жаўнерыкі дземянцееўскія будуць жвавыя,
што камарыкі...

## Шэсць сотак

Шэсць сотак гуркоў і бульбы.
Домік. Бочка з вадой.
Так выжываем пакуль мы.
Няма дарогі другой.

Няма яе – і не трэба.
Абы горш не было.
Здурэла і так планета.
Навокал падман і зло.

Не маюць наіўных мараў,
бо ў гэтым жывуць жыцці
і ўнукі лагерных нараў,
дзеці сотак шасці.

## Аповяд шатландскай аўчаркі Боны пра свае канікулы ў вёсцы Біскупцы Лідзкага павета, калі грымнула рэвалюцыя 1991 года, а таксама падробка пад яе гаспадыню Дануту Бічэль

Лёс у сабакаў сабачы.
Пуста ў людзей за душою.
Мы з гаспадыняй на дачы
марна шукаем спакою.



www.kamunikat.org

Знікла шляхецкая мужнасць.
Правіць савецкая раса.
Братніх народаў садружнасць
з'ела сабачае мяса.

Цэлае лета пацею,
нешта шукаю па кучах.
Кажуць – канец Дземянцею.
З'елі яго разам з путчам...

Кожны тут зубы ашчэрыць...
Прасты тут Край – як малітва.
Менскам кіруе Шушкевіч –
вёскай кіруе паўлітра.

Морду паклаўшы на лапы,
ціха драмлю да абеда...
Кажуць вясковыя бабы,
што заваююць нас швэды.

Нос не высоўваю з дома,
гэта ў маіх інтарэсах –
шастаюць цёткі з райкома,
нібы ваўчыцы, па Крэсах.

www.kamunikat.org

## Сон перад незалежнасцю

Будуць хлопцам медалі, і шынкі, і кралі!..
Кожнаму заплоціць Бог – срэбрам і вінам!..
Змагарамі пабылі, гульні адгулялі,
а цяпер сядзяць і п'юць за чужым сталом...

А свайго няма стала – і няма Айчыны.
І смяецца з хлопцаў тых родны іх народ!
Вось і п'юць ды лёс клянуць з гэткае прычыны
вось і страшаць белы свет ўжо каторы год!..

А народ іх – не дурны: моцных не чапляе,
а працуе на зямлі, хай і нічыёй...
Вось і кончыўся народ, і зямля ўмірае,
і ўздыхае Бог адзін вечнай цішынёй...

## Мястэчка

Плошча з райка́мам і кінатэатрам.
Рэстаран забіты на сорак дошак.
З навіны толькі два кіёскі прыватных.
Іх палілі, ламалі, шукалі грошы.

А над шыферам стрэхаў сярэдняя школа
ўсіх вышэй тырчыць аж на тры паверхі.
Царква не выйдзе з рамонта. Троху лепш у касцёла.
Але ж гэта ўспаміны ды сантыменты...



www.kamunikat.org

Лепш не можа тут быць. Тут людзей разагналі.
Местачкоўцы адны паміраць засталіся.
Шафярня вясковая свае тралі-валі
рассыпае вакол, як кляны ў старым парку лісце.

## Terra nullíus

Зямля Нічыя і нам зямля не чужая.
Толькі што часта ездзім і пераязджаем.
На вайну. На работу. На халтуру і на шабашку.
Жыць не цяжка. Мець зямлю сваю – цяжка.

Зямля Нічыя. Адна такая на свеце.
Старыя здыхаюць. І ужо паміраюць дзеці.
Але дзе памерці народу, які з волі ўласнай здыхае?!
Нават магіла любая гаспадара свайго мае...

Лётаюць над базарамі – як вароны над пожняй! –
надта ж хітрыя людзі паміж Расіяй і Польшчай.
І месца з кожнага краю па-хітраму нам адвялі... –
Слухай, што за прыдурак?! – Той? З Нічыёй Зямлі.

## Пастаралька. 1992 год...

Край без імя, прозвішча і даты нараджэння
спрабуе паўстаць з магілы,
робіць поспехі – ужо стаіць на каленях.

Абяцаюць новыя пашпарты – як у Эўропе.
Толькі імя і прозвішча –
каб ніякай этнічнай, расавай і
                    сацыяльнай дыскрымінацыі
Але – паўстае праблема: як пісаць?!
Шушкевіч Станіслаў Станіслававіч
альбо –
          Шушкевіч Станіслаў, сын Станіслава?
Каб не наслядаваць «імпэрскую Расею»...

А тут яшчэ мясцовыя палякі плачуць,
што іх пазбавяць польскасці,
касуючы пятую савецкую графу,
дзе «*русским языком*» сказана, што яны палякі.
Край раздзіраюць дзве праблемы нацыянальнага
адраджэння – бензін і цукар;
праблема самога адраджэння вырашаная –
мова стала дзяржаўнай.
А якая дзяржава – такая і мова.
Беларускія батальёны рыхтуюцца да бітвы –
за ўраджай на палях братняга Казахстана:
аплата па дамоўленасці.
«...*з нашым войскам незале-е-е-жным*
*да сваёй зямлі адзі-і-інай...*»

Ні кроплі дажджу.
Збялелая трава на лугах і пустках
Новае Галілеі.

www.kamunikat.org

## Ранак

Зіма выкідае свой белы сцяг.
Чалавек пражыты год выкідае.
Смецце мяце гаспадар па гасцях.
Гандляры вымятаюцца аж да Кітая.

Пачынаецца постсавецкі пост.
Засынае тутэйшы люд па кватэрах.
Час павольна ідзе праз нёманскі мост.
Два крокі назад і адзін наперад.

Куды ж нам плыць, перавозчык Харон?
Зараз схопіцца грудай адліга...
Ваяваць з Эўропай – каб здацца ў палон?!
Ці зусім уцякаць адсюль ціха – да ліха?!

Ці лепш... не плыць? Бо – і так прыплылí.
Тым не страшна прапасць, хто даўно прапáлі.
На рублях і далярах важаць нулі.
І быць хоча нулём краіна сляпая.

## Перапынак

Мы прыходзім да згоды, што жыць болей нельга вось так.
Мы чакаем з надзеяй, што нехта навучыць, як трэба.
Мы працягваем сніць, што паявіцца збаўца даць знак.
Мы стаміліся жыць вечным пошукам шчасця і хлеба.



www.kamunikat.org

А між тым ужо восень – спыніўся і сцішыўся час,
дождж зацяглы заліў ад Юрацішак да Астрынаў.
Мы ўжо млява і квола выпрошваем хоць бы адказ,
ці палохаем страйкам – у абедзенны перапынак...

Мы? А хто мы такія? Жыццё абышлося ніяк
з нашым лёсам і плёнам, і тлёнам, і ценем народа,
і астатняй згрызотай... І цэлы народ – як жабрак.
Хочаш – тут прападай, хочаш – едзь, куды хочаш.
Свабода...

## Яцвягі

На густым павуцінні рэкаў.
На пражылках замерзлых венаў.
На шляху з варагаў да грэкаў.
На падмостках вялікіх сцэнаў.

На руінах замецених жахам.
Не баімся з Богам змагацца.
Больш няма ні паганскага страху,
ні каштоўнасцяў хрысціянскіх.

Мы – яцвягі. Нас не забілі.
Гэта мы абдурылі лоўка.
Навукоўцы наш след згубілі.
Нашай верай ёсць маскіроўка.

Мы прыймаем любую моду.
Абы добра жылося люду.

www.kamunikat.org

Тэхналогію. Зброю. Мову.
Перуна. Ісуса. Камуну.

Мы сабой не былі ніколі.
Край не стаў ні пеклам, ні раем.
Прасядзелі ў дурным падполлі –
і па дурасці паміраем.

## Новая Галілея

З-пад нябёсаў паваеннай Эўропы
дзіўна выглядае цьмяны абшар
ад Балтыкі да Крыму –

Польшча,
зблуканая між ружовых аблокаў
і легалізаванай мацернай лаянкі,

Летува
з яе хвоямі, дзюнамі, крыжамі ля дарог,
пры саветах піва не разбаўлялі,
а цяпер разбаўляюць,

Львоў,
які хоць мільённы, але старажытны,
бо мітынгі ўсё адно правінцыйныя –
і ніхто не памятае, чаго ён хоча,
далей Палессе:



www.kamunikat.org

новапаўсталыя яцьвягі, Мыкола Шэляговыч,
ахвяра выпіванак з паэтам і бардам
Сокалавым-Воюшам
і жартаў памянёнага барда наконт яцьвягаў,
чого Мыкола нэ зрозумів – т а к паўстаюць нацыі,

далей Гародня –
асірацелы без сацыял-дэмакрата Ткачова
клуб «*Паходня*»
асірацелая без ідэі газэта «*Пагоня*»,
свая танкавая дывізія, свой хімічны камбінат,
свая местачковая мафія з яе квітнеючым
сепаратызмам,
бо ад таго Менску адны падаткі і ніякага толку,

за сто кіламетраў Ліда,
дзе трыццаць гадоў адбудоўваюць стары замак,
ставяць помнікі Міцкевічу, Скарыне і Гедзіміну,
а піва пакуль што не разбаўляюць,
а потым едзь сабе да Вільні, да Нёмана
і хоць да тае вёскі,
дзе раз за жыццё нават літаратараў пояць гарэлкай
майстры тамтэйшай конегадоўлі,

далей – Біскупцы, Морына, Іўе, Бакшты, Ракаў
і другія мястэчкі
прадукуюць геніяў з пакалення на пакаленне,
і нарэшце – сталічнае мястэчка Менск,
якое збывае жывых геніяў невядома куды.
«Жыве сабе Беларусь...».

доўгі нізкі туман
поле балота пясок вёска
туман туман туман
рыпіць воз фыркае трактар
дробны дробны дробны дождж
год і дзень усё роўна якія

вецер каласы варушыць
на бясконцым абшары Новае Галілеі
чакае простага чалавека
які пойдзе па жыце – як па вадзе

## Роспач

Ах, што за час надышоў, што за час!
Рушылі нашыя простыя людзі.
Нехта цягае за нітачкі нас,
нехта клянецца і стукае ў грудзі...

Вось – прынялі! Напівайся, святкуй –
там за Айчыну прагаласавалі!
Хто не жылі і другім не давалі –
хам і падпанак, чужак і халуй.

Вось – ашчаслівілі! І бедны край
крылы падняў – і ўжо некуды рынуў...
Ты ж, хто ніколі яго й не пакінуў,
радуйся, пі ды хутчэй памірай...

www.kamunikat.org

## Мара

Прыеду зноў да міласці забытай,
якая больш не прагне, не кахае
ў люстэрку нашай памяці разбітай
і на разбіты лёс не наракае...

Прыеду ў самы час да белых мрояў,
да хатаў белых, апавітых дымам,
да ўсіх забытых і жывых ізгояў,
рассыпаных між Балтыкай і Крымам...

Прыеду ў край, дзе прывіды і цені
людзей і духаў, лішніх у Айчыне,
дзе, як лучынкі, цягнуцца імгненні,
і гіне ўсё, і да канца не гіне...

* * *

Бераг мой апусцеў. Толькі восень і дым.
Жыць збіраўся калісь хіба духам святым –
ах, дзівак, наіўняк, галадранец...

Так і будзе круціцца раскручаны вір,
па сабе пакідаць толькі попел і жвір
і тупой безнадзейнасцю раніць...

І аднойчы я сам завандрую ў тым сне,
і аднойчы той вецер дагоніць мяне,
і ўзляціць белым пылам дарога...

Бераг мой апусцеў. Толькі восень і дым,
Толькі вецер нямы гасне ў полі пустым,
і нічога, нічога, нічога...

* * *

Цень па вуліцах места пляцецца за мной
летняй белаю спёкай і чорнай зімой –
сцеражэ мой спакой тая служба.

Небяспечная вечная служба штодзень,
але вечна пры мне працавіты мой цень
і трывае ўсе цяжкасці мужна.

Контрразведчыкі, цёткі, дзяды, змагары
апякаюць ад той і да гэтай пары,
што пры той, што пры гэтай уладзе...

Гэта край стукачоў і пабітых ваяк.
Гэта вечны тутэйшы біблейскі бардак.
Безнадзейнасць, бяссілле, бязладдзе...

* * *

Вецер з возера выстудзіў памяць і волю,
вецер з багнаў панёс цені мёртвых па полю,
вецер з прорвы атруціў жывых...

Анямела душа, праўда згінула ў яме,
дагараюць лясы, дагараем мы самі,
больш нікога – ні нас, ні другіх...

Пуста. Холадна. Дождж залівае Айчыну.
Край, якога няма... І не страх, што загіну,
падступае пустэчай да горла...

Гэта вецер і восень. І пуста, высока, –
як на ўласную смерць, на раку гляджу збоку...
Галілея. Самотна і гола.

## Зімовы вечар

Над белай пусткай пад небам чырвоным
блукае дух бяздомнага краю.
Вечар. Над вёскай кружаць вароны,
чуюць нябачных пачвараў зграю.

Прывіды крочаць па белай пустыні,
прыходзяць ноччу, кроў выпіваюць,
ніхто не плача тут па Айчыне –
мёртвыя сораму й слёз не маюць.

Жывыя круцяцца. З тых палетак,
каб не прапалі ў сне нескароным,
у белы свет выпраўляюць дзетак
з белае пусткі пад небам чырвоным.



www.kamunikat.org

## Чорная паль

У чалавека і Бога адна чырвоная кроў –
і не баіцца Бога прагны сын чалавечы.
Гінуць зямля і неба. Прыходзіць час змагароў,
якія вечна калечаць няшчасны край гэты вечны.

Між чалавекам і Богам стаяць касцёл і царква –
і за падачкі грызуцца дзеці гэтага краю.
Між чалавекам і Богам трымае войска Масква –
не спіць, ахоўвае межы, трасецца, абараняе...

На чалавека і Бога здрада, свінец і сталь
даўно ўжо прыгатаваныя – на сэрца, душу і шыю.
У чалавека і Бога лясная чорная паль –
і тут яны сустракаюцца, на мёртвай зямлі жывыя...

## Формула

Не крыж злучае. Дзеляць не паны.
Край гэты ад вайны і да вайны
цярплівы, ціхі, сціплы, працавіты...

І хто б калі дастаў якой бяды,
каб часта не заходзілі сюды
палякі, швэды, немцы, маскавіты?!



www.kamunikat.org

І хіба так бы рэзаў брата брат,
каб не даваў чужак такі загад?!
Наш люд цярплівы, ціхі, працавіты.

Але чаму паўсюдна цэлы час
ад рогату ажно здыхаюць з нас
палякі, швэды, немцы, маскавіты?

## Сіфанафора [1]

Край бульбяны разоры не страціць.
З кожнай кветкі смокча пчала.
Плодзіцца бульба без бацькі і маці.
Абы гной – каб добра расла.

Простая вера той Край трымае.
Жыць – каб зноў пладзіцца і жраць.
Не паміраем. Бо дна не маем.
І каранёў не трэба шукаць.

Нам усё роўна, якое поле.
Скачам у пекла – як бульба ў рот.
Мы ж грамада. Мурашнік. Супольнасць.
Сіфанафора. Бульба. Народ.

[1] Калонія планктонападобных.



www.kamunikat.org

## Балада
## пра высокамаральную графаманку, але не графіню Алу Петрушкевіч, кандыдата ў дактары філалогіі

Што свет шалёны – няма вінаватых.
Ні польская ўласць, ні савецкая ўласць...
Крадуць маёнткі, фальваркі і хаты.
У нас немагчыма жыць, каб не красць.

Месяц за месяцам. Год за годам.
Крадуць маральна. І без маралі.
Я абакраў Багдановіча з Бродзкім.
Графаманы з Гародні мяне абакралі.

Не паспявае рука за ротам.
Жраць заўтра захочам – бо ўчора жралі.
Зніклі са свету годнасць і гонар –
нядаўна міліцыю абакралі.

Крадуць усе. Хто многа, хто мала.
Крадуць з бяды. Крадуць з настальгіі.
Не крадзе адна Петрушкевіч Ала –
за яе шчыруюць муж і другія.

www.kamunikat.org

## Балада
## пасля балю з нацыянальнай элітай

Не хачу на Павонзкі ці Новадзевíчае.
Бо спакою ад Крэсаў нідзе не чуеш.
Не хачу выпіваць з Аляксеем Пяткевічам –
з ім гарэлку нават толькі змарнуеш.

Лезла вёска і лезла – і павылазіла.
Не хачу ўплятацца ў тутэйшы букет.
Тут заморскім гасцям лепяць *honoris causa*
і співаюць, што маюць Універсітэт.

Не хачу я клікаць – мяне б хоць не клікалі.
Не хачу з элітай губляць зрок і слых.
Не друкуйце мяне тыражамі вялікімі –
лепш пазбаўце мяне ганарараў малых.

Не хачу багацця – пазбаўце беднасці.
Тыя ж Крэсы бедныя... на людзей.
Тут супольна здыхаюць бедныя ў еднасці
і аднолькава прагнуць ніякіх падзей.



www.kamunikat.org

## Балада
## пра гаспадара забягалаўкі
## «Батлейка»

На свеце пуста. На свеце гола.
Беларусь співаецца ў дрыбадан.
Не п'е адзін Таранда Мікола.
Адначасова – і пан, і спадар.

Таранда – спадар палітклуба «Паходня».
Там пляткуюць пятнаццаць гадоў
дзяды з залатога пенсійнага фонда
і смаркачы з апошніх радоў.

Таранда – пан паграбка «Батлейка».
Піва з гарэлкай лье папалам.
Там ужо спіўся Юра Карэйва
і цэлы Фонд Сораса ў свой семінар.

А што б тут зрабіла любая разведка?!
Нічога б яна не зрабіла тут...
Але Таранда – эпохі сведка.
Таранда зробіць капут. Без пакут.

## Маўзалей

Мільёны кітайскіх жаўнераў з гліны
труну Імператара ў лабірынце
сто гадоў будаванай сакрэтнай магілы
пільнуюць ад Бога, які не прыйдзе.



www.kamunikat.org

Мільёны кітайскіх жаўнераў бяссонных
вечную службу спаўняюць спраўна,
жаўнеры з гліны не чуюць стомы,
жаўнерам з гліны хвала і слава.

Мільёны кітайскіх жаўнераў з народа
разам з Панам сваім скамянелі –
толькі дурню патрэбна свабода,
а хітры быць хоча ў тым маўзалеі,

дзе час праплывае вечны і ясны,
дзе голад і холад не мучаюць войска,
дзе роўныя Неба, Улада і Рабства,
а жыць – навошта, навошта, навошта...

## Калькута

О, прарадзіма Чалавека, Агню і Жалеза!
Ста́ла ў Індыі зімна,
як памерла Маці Тэрэза.
Бога яна не прасіла – сама рабіла работу.
Нікога яна не хрысціла –
адных перад смерцю сіротаў.
Не высокая. І не дужая.
Пражыла так доўга... Так мала.
Ратавала не душы – жывых людзей ратавала.



www.kamunikat.org

Цудаў яна не ўчыняла, не казала казак аб цудзе.
Проста людзям жыць памагала –
і лягчэй стала жыць у Калькуце.

Ёсць іначай на Крэсах.
Тут бядою не голад з хваробай...
Бог адзін разбярэцца,
што зрабілася з гэтым народам!
Тут адзіны вялікі калгас
праглынае жывымі нас.
Тут бабулька рэдкая верыць у Бога.
Ватыкан пільнуе адны аборты.
Тут кішкамі прагнуць – а не душою.
І гандлюе гарэлкай Царква з Масквою.
Тут чэкісты лысыя і сівыя
сняць пяцідзесятыя, саракавыя.
А Зянон Пазьняк з-за польскай граніцы
смаркачоў заклікае адважна біцца.
Тут любы чыноўнік, з крэсла сагнаны,
дэмакратам робіцца без заганы.
А любы камуніст, што здыхае пад плотам,
самым шчырым робіцца патрыётам,
і бяздонны гумовы калгас
праглынае жывымі нас...

О, прарадзіма Чалавека і Звера...
У ільготах чарнобыльскіх твая адзіная вера.

www.kamunikat.org

Ты здурнела дашчэнту. Ты збялела
насмерць, як мел.
Ты сама націскаеш на прэзідэнта –
каб хутчэй, каб хутчэй адстрэл!
Ты дзяцей праядаеш.Ты даўно
жывеш – як па смерці.
Ты сама сябе выкідаеш ўсяму свету
на смех, як смецце.
Ты здыхаеш не ўпершыню.
Ты не хочаш выходзіць з лесу.
Ты не верыш... у дабрыню. І ў Маці Тэрэзу...

## Дом

У пагоду і ў непагадзь
стукаюць дзверы ў шэрым панельным доме.
Ноччу і днём нехта рухаецца і нешта рушыцца.
Пры дэмакратыі і пры дыктатуры
адзін смяецца, а другі стогне.
За дзвярыма лаўка зламаная
і на ходніку вечная лужына.

Спяваюць і свішчуць сантэхніка і батарэі.
Пошты больш не прыносяць.
Так праходзіць зямная слава.
Кухні смярдзяць капустай і бульбай на польскім алеі.
Ніякіх няма пераменаў.
Нехта памёр ці прапаў – і ладна.

## Залатая свіння

Ноч праходзіць у радыётэлекашмарах.
Нават кашаль мой цыгарэту не тушыць.
Спяць калегі. На нарах. У мінскіх казармах.
І бяссілле правінцыі мяне душыць.

Іх бралі з вуліц за тое, што яны людзі.
А не чорныя вошы за пазухай міліцэйскага бога.
Ноч на Крэсах. Паціху крадуць і гандлююць.
Хаму з плошчы Свінні Залатой не патрэбна свабода.

Спяць усе, каму заўтра зноў на работу.
Над цэнтральнай плошчай усходзіць
Свіння Залатая – як багіня паганская!
Як жывём за калючым дротам,
за працоўным народам, за светам,
за сонным Краем...

## Першая кроў

А вось і першая кроў на снезе.
Людзей збіваюць. Цягнуць за краты.
Злосць простага люду з улады лезе.
Свайго дачакаліся дэмакраты.



www.kamunikat.org

Смерць уздыхнула – і ёй не спіцца.
Ахвяры і каты скутыя страхам.
Просты люд адзін не баіцца.
Дрыхне ў пяціпавярховых бараках.

Ходзіць на службу. Крадзе на чарку.
Любіў прэзідэнта – цяпер не любіць.
Чакае канца – каб пачаць спачатку.
Люд бессмяротны. Прапашчыя людзі.

## Modus Albaruthendi

– На Беларусі і дурань шчаслівы,
калі працавіты і з моцным цярплівы, –
кажа вясковы закон.

– Прыўкрасная будучыня чакае!
Вось толькі чарговы рэжым зламаем, –
вучыць Пазьняк Зянон.

– Спяваў бы пра шчасце, спяваў аб свабодзе,
каб долю бачыў у родным народзе! –
Янка Купала гукнуў.

– Не выжыве доўга дзяржава тая,
дзе большасць дурная перамагае, –
Леў Сапега ўздыхнуў.



www.kamunikat.org

## Пасля дожджыка ў чацвер

Ні прымусу даўно, ні здзеку.
Як банальная рыфма – свабода.
Ходзіш, просіш тую капейку...
Ідыёт за шчасце народа.

Лупяць вочы сяброўскія морды.
Бізнэсмэны на сёмым небе.
Маеш быць ты святы і мёртвы.
Ці жывы – як мёртвы. Так лепей.

Ходзіш ранішняй прагулянкай.
Кожны кажа, як яму цяжка...
Раз за дзесяць гадоў, як сабаку,
Жэнька Лотвін падасць на пляшку.

Гонар твой даўно выйшаў з моды.
А ў вакно ступіць – не збярэшся...
Дурань ты. Беларускамоўны.
На тых Крэсах. Тым узбярэжжы.

Так і будзеш здыхаць, паскуда.
За глыток на паўгода волі.
Падмятаць не возьмуць нікуды.
Забіваць не будуць ніколі.

www.kamunikat.org

## Балада
## пра Рудольфа Пастухова

Слонім. Восень. Ранняя, як у сне.
Пуста. Свет – як на нейкім дне.
Сам не веру. Так не бывае...
Над маёй галавой у светлай труне
Пастухоў Рудольф праплывае...

Над зямлёй без вартаў і без ахоў
сам плыве паэт Рудольф Пастухоў.
Ён цяпер на свабодзе –
і не просіць долі ў народзе.

Ён не ў коле варожым –
ён цяпер толькі Божы,
перажыў суму і турму,
і жывыя зайздросцяць яму...

Чалавек жыве выпадкова –
што ў тым Слоніме, што ў Маклакова.
Сумна будзе на свеце жыць мне без Пастухова.

Зашуміць па ім вецер, дождждык пралье слязу,
прарасце па ім Слова, стане ясна і нова –
пастаю над яго магілай, на Неба яго пагляджу...



www.kamunikat.org

Слова нікога не адратавала,
зло заўсёды мацней дабра,
пакаленне нічога не адваявала,
у бяздонне зацягвае нас дзіра.

Не патрапіць у рай, жто пражыў паэтам,
не цярпеў ні вартаў, ані ахоў –
і таму сам сабой над бяздонным светам
праплывае паэт Рудольф Пастухоў,
праплывае вышэй і раю, і пекла,
над усімі намі лёгка ляціць.

І на доле ў Слоніме робіцца светла.
Толькі Шчáра плача – бо ёй баліць.

## Балада памяці белага коціка Бáсіка

Цяжка на гэтым свеце.
Як было – так ізноў.
Толькі дайшоў я да смерці –
Басік мяне знайшоў.

Бáсік – белы і лáскавы.
Быў ён – Басок, Каласок,



www.kamunikat.org

Брацік Чатырохлапкавы,
Сыночак і Калабок.
Жыў са мной у бяссонніцы.
Чакаў – як мяне не было.
Меў ён сваё Басовішча.
Глядзеў у сваё вакно.

Божа, якія мы дурні
ў гэты кампутарны век!
Коцік жыве разумны
менш, чым святы чалавек.

Што мы сабой занятыя?!
Не бачым нічога кругом...
Як коцік чатырохлапкавы
адзін збярог цэлы дом.

Адкуль у нас столькі злога?!
Чаму мы пусцей – чым дым?!..
Няма больш Басіка дома.
Ляжыць пад вакном сваім.

Ноччу грукае ў дзверы,
да сэрца лезе праз сон...
А можа, ён яшчэ вернецца?
А можа, ўваскрэсне ён?



www.kamunikat.org

## Балада
## пра Ўладзіміра Захарава

Калісьці нашыя пралетарыі
ў працэсе класавай барацьбы
забралі сабе гітару з Гішпаніі
і зрабілі з яе інструмент шпаны.

І прапала ў гітары гукаў свабода –
шэсць акордаў блатных выбівалі з яе.
Але ўзяў яе ў рукі Захараў Валодзя –
і на кожнай мове гітара пяе.

І ў яго не гітара – а сэрца паэзіі.
Ён яе навучыў слухаць нёманскі гул.
Ён яе абярог ад бяздушша і плесені
і свабоднай яе на радзіму вярнуў.

У Гішпаніі слухалі тлумы народа
І нашых вулічак сум, светлы дождж у вакне...

*Калі хочаце мець у Айчыне свабоду,*
*не прасіце яе, а рабіце яе.*

www.kamunikat.org

## Балада
## пра Івана Сяргейчыка

Час аказаўся тупы і вострый.
Вёска, вайна і натоўп жанчын.
Старшы прапаршчык – старшы ў войску.
Бо маёр з маёрам грызуцца за чын.

У падняволлі бойні афганскай
не выйшаў ніхто з летаргічнага сну.
Іншым, як цвік у труну – адстаўка.
Але Сяргейчык не лезе ў труну.

Кожны ў райцэнтры – вялікі і геній.
І графаманіць кожны чыгрын.
А піша добра Іван Сяргейчык.
Бо піша – як жыў. Бо не спаў, а жыў.

Спіхнуў старое – як бабу з воза.
Лёгка паехаў сабе далей.
З каго ты смяешся, сталічная вёска?!
Глядзі, з таго смеху не акалей...

Сяргейчык дом сабе ставіць над Шчарай.
Новы зноў сканчае раман.
А дзе там шчасце і дзе няшчасце –
не мы жылі, і судзіць не нам.


www.kamunikat.org

## Балада
## пра Ўладзіміра Кіслага

Стаім на месцы. Але ў калейцы.
Адны ў Варшаву, другія ў Маскву.
Гэта паэт чым дурнейшы, тым лепшы.
Рэстаўратар мае мець галаву.

Час праядае людзей і сродкі.
Нішчыць кожны – чужы і свой.
І нехта мусіць рабіць падробкі.
Каб прыгажосць засталася жывой.

Мільгаюць улады, мітынгі, пляцы.
Пра Беларусь там і тут плятуць.
Ні святар, ні палітык грашыма не плацяць.
А толькі доўг маральны даюць.

Нам і так засталося нядоўга...
Але за што апошніх майстроў
душыць Айчына маральным доўгам
і рукамі дурных змагароў?!

Стаім і душымся ў той калейцы.
Здыхаем ціха. Гарым агнём.
У Эўропе жабруем – як на жалейцы...
Рэстаўратар робіць. Ноччу і днём.



www.kamunikat.org

## Косава

Ноччу недзе ў далёкіх Крынках,
што згубіліся на пагорках
новаўпэўненай пані Эўропы,
валацуга з далёкай Гародні
з новаўпэўненай Беларусі
цягне піва з гнуткіх бляшанак
аж пакуль не замгліцца ранак.

Свет хаваецца ў завірусе
парахункаў і бамбардзіровак.
Тэлевізар скончыў работу –
папраўляць непапраўныя душы.
Пыл і чад на мяжы непарушнай –
ад суботы і да суботы.
Больш няма ніякага Слова,
ані добрага, ані злога.

Той, хто мае Лепшыя Бомбы –
той бароніць... Прагрэс і Праўду.
А ў каго састарэлая зброя –
той і з крыўдай не мае рады.
Бог – на кожным баку, дзе зброя.
Не хачу варушыць старое...
Свет падзелены – на тых сербаў
і на тых, дзе канчаюцца Крынкі.
Беларусы таму знікаюць,



www.kamunikat.org

каб не быць на лініі фронта.
Не хачу пыл надзеі сеяць
і крычаць у нячутным крыку,
што айчыны не паміраюць
у Эпоху Бамбардзіровак...

Час прайшоў. Спазняюцца грошы.
Чад наркотыкаў. Пустка нірваны.
Пыл на кніжках Мілаша з Мрожкам.
І замест эўрапейскай Польшчы –
з капіталам абмежаваным –
Сам Касцёл наязджае на Крэсы,
бо не мае... ў Эўропе месца.
Не пусціць яго – не па-людзку.
А пусціць – прыйдзе той, хто... лішні
ў Дэмакратыі і Свабоды.
Але... што мы тут самі маем?!
Мокне вёска на шэрым лузе.
Рукі цягнуць грушы і вішні.
Вечны сыплецца дождж над Краем
ад суботы і да суботы...
І няма ніякага Слова –
ані добрага, ані злога.
Што цяпер памінаць старое...
Маем лепшае вырашэнне –
беларусы знікаюць з фронта,
сербы пруць насуперак смерці,



www.kamunikat.org

а рэліктавы лес албанцаў
рэжа кожны мяснік на дровы...

Не хачу варушыць старое,
не хачу варушыць старое
ноччу недзе ў далёкіх Крынках,
што згубіліся на пагорках...

## **Перапіс**

Вось і перапіс звесткі пакінуў.
Самы час цяпер разважаць.
Першакласнікаў менш на трацiну.
Перасталі жанчыны раджаць.

Стала больш беларусаў. На свяце.
Вось што значыць суверэнітэт!
І гавораць на мове – у хаце.
Бо падпольны мэнталітэт...

А жыд*ы* – у Ізрáілі. Дома.
Тут прайшлася ці моль, ці вош...
І адны Гендэльман з Гардонам
дажываюць на ўласны кошт.

І палякаў няма, Божа леташні!
Не кулак, а суцэльны апёк –

толькі Гавін, падпёрты Малевічам.
А Буйніцкі да Польшчы ўцёк...

Што ж, усе мы жывём інтарэсамі!
Дзе народжаны – так і жыві.
Неразменная ціша над Крэсамі.
Бы чакаем чарговай крыві...

## Я хачу ў Савецкі Саюз

Не шкадую і не наракаю.
Толькі мрою – бо я беларус
Але ж толк з незалежнага Краю...
Я хачу ў Савецкі Саюз.

Жыў сабе адным днём – колькі лезла.
Не начальству – народу служыў.
Хоць і бедна, ды лёгка і весела.
Без клапот і праблемаў жыў.

Там было – як на іншым свеце.
Кожны хам быў, як пан і звер!
Нават мова сядзела ў бюджэце.
Не ў змаганні дурным – як цяпер...

У свабоды намнога горшыя,
хоць другія гвалт і прымус



www.kamunikat.org

Ёсць усё. Няма толькі грошай.
Я хачу ў Савецкі Саюз.

Калі пойдзе далей такое,
не пазнаем уласных дзяцей...
– *Сё! Урэмя прайшло залатоя*! –
як казаў Мікалай Дземянцей.

## Хамелеёны

Божа, не будзь Ты такі магутны!
Глянь, як згультаіўся Твой народ...
Гэтыя ўсе яцьвягі і гуды,
і беларусы – з вачыма «ўпярод».

Новы шлях адкрылі халопы,
бо халява яшчэ не ўцякла –
хочуць так пайсці да Эўропы,
каб Эўропа з грашыма прыйшла.

Новы час чынавенцтва чакае,
каб вярнуліся казкі і сны –
служба ціхая, родная зграя
і бяздонная бочка Масквы.

Новы фронт завялі адраджэнцы,
санпрапускнік альбоператрус –



www.kamunikat.org

хто не плюе на свайго ж прэзідэнта,
той цяпер і не беларус.

Так і слінявяць чаканне з праклёнам,
так і глядзяць учарашняга дня
дзесяць мільёнаў хамелеёнаў
на ахамелай службе ў рубля.

## Турма

Снег ідзе. Наляцела на Гродна зіма.
Ходнік слізкі і вузкі. Мур высокі. Турма.
Сягоння з гэтага боку гуляю міма яе.
А што адбудзецца заўтра – маўчаць анёлы мае.

Наша турма са славай. Ад царскай і польскай пары.
Тут сядзелі выдатныя людзі – ўсе з падручнікаў змагары.
Сягоння з гэтага боку гуляю міма яе.
А што адбудзецца заўтра – маўчаць анёлы мае.

А народ бяжыць і штурхаецца. Няма часу яму гуляць.
Дэмакраты няхай выдурняюцца.
Трэба красці і зарабляць.
У правінцыі гора вясёлае. Мы не вязьні – вязьні не мы.
Галубы ляцяць над касцёлам.
Слізкі ходнік каля турмы.

## **Рэквіем**

У імя Сястры Брата і Святога Духа

дзень бясконцы зноў завіруха
сэрца рэжа у глотцы суха
не прыходзіць ніхто за табой
не прыходзіць ніхто за табой
флейта ну́дная ці габой
флейта ну́дная ці габой
не знайсці нідзе чалавека
у суседзяў з другога паверха
у музычнай школе дачка
доўга пуста прапала вера
не пакінула пятачка
не пакінула пятачка

два раз*ы* мяне забівалі
кожны дзень мяне забывалі
а жыву́ жыву́ і жыву́
нешта ма́ю ма́ю і ма́ю
што зрабіла ўсім вам Тамара
чым яна́ зарабіла труну
чым яна́ зарабіла труну
што вы ма́еце Скідаль і Гродна
было цесна ста́ла свабодна
што забыў я тут Божа мой


www.kamunikat.org

не прыходзіць ніхто за мной
не прыходзіць ніхто за мной

дзень бясконцы пустая пáмяць
не патрэбны нікому кáмень
у мястэчку чужая школа
у суседзяў вечнае сола
у душы адзічэлай гола
сэрца рэжа у глотцы суха
свет шалёны зноў завіруха
што зрабіла яна каму
маці з бацькам не дагадзіла
за гадзíнай цячэ гадзíна
што цяпер людзкія рублі
што пажыць ёй вы не далі
не бывае дна залатога
не баліць ёй цяпер нічога
боль пакінула на зямлі

што ён ходзіць недзе далёка
замялá завея дарогу
не прыходзіць боль да мяне
не прыходзіць боль да мяне
не бярэ мяне да Тамары
што ж адна яна там без пáры
не прыходзіць ніхто за мной
не прыходзіць ніхто за мной
ні бяссонніцай ні зімой

www.kamunikat.org

о так ма́ла так ма́ла так ма́ла так ма́ла
пажыла́ пажыла́ пажыла́ пажыла́
Тамара Тамара Тамара Тамара
сястра сястра сястра сястра

## **Бяссонніца**

*Васілю Быкаву*

Ноччу ў вакно грукочуць галінкі.
Дожджык і вецер. І сна не ма́ю...
Быў тут прыехаў адзін вялікі –
як на інспекцыю роднага Кра́ю.

Глянуў – як быццам мы ўчора з лесу.
Таго не ведаем і другога.
Сказаў, што я ўсім у вочы лезу –
як за кашулю да Пана Бога.

А што мне лазіць, дзе не прасілі?!
І так несмяротны – бо з грэшнай душою...
Сястра ма*я* Тома спіць у магіле,
а кніга ма*я* – пад яе галавою.

А што я сам гарэлку цягаю
і са злосці трасе ад мяне начальства...
Я не самотны. Я кнігу ма́ю.
І кніга – там. Перад вечным часам.

## Ластаўка

Ластаўка, птушка мала́я, чорная з белым,
адна ты ў мяне такая на свеце цэлым.
Ты з-пад стрэхі маленства ляціш у па́мяць ма*ю*.
Надакучылі дзеўкі доўгія. Ластаўку я люблю.

Чорненькая мая, валасы мае пасівелі,
апошнія дзесяць гадоў ты са мной не была.
Беленькая мая, тут зімой нават снег чарнее,
апошнія дзесяць гадоў я не чуў тваяго цяпла.

Ластаўка, птушка малая, берагавушка і стрэшніца,
абудзі сваім лётам заспаны абшар.
Ты высока ляціш над дратамі памежнымі,
твае крыльцы малыя не бачыць радар.

Калідоры бясконцыя. Дзверы бразгаюць.
За зімой зіма і за хаем хай.
Не забудзь дарогу даўнюю, ластаўка.
Не забудзь мяне, вясной прылятай...

## Ялінка

Свята дваццаць гадоў не было –
адна гарэлка з горкім вяселлем.
Запаліла ялінка ў доме святло
на Свята Божага Нараджэння.

www.kamunikat.org

Дваццаць гадоў дзе-небудзь вайна.
Самога два разы забівалі.
Свечка гарыць на краю стала.
Не ўспамінаю, а забываю.

Двуногіх звяроў і двудушных сяброў.
Тых, хто біў, і тых, хто не бачыў.
Цяпло, як віно, запаўняе кроў.
А цемра замерзла ў холад сабачы.

Не трэба больш зусім гаварыць –
пра беднага хама і кепскага пана.
Цемра гасне. Свечка гарыць.
І ўсё мінулае ў цемры прапала.

## Помнік
## Максіму Багдановічу
## ў Гародні

Гродна – места маленства.
Агеньчыкі ў вокнах зімы.
На свеце лепшае места
там, дзе ў маленстве мы.

Кожны свой бераг мае.
Чорны і светлы цень.
Гродна – магіла маці.
Першы дарослы дзень.



www.kamunikat.org

Нёман гайдае хвалі.
Цягне вецер матыў.
Ў Менску і ў Яраслаўлі
ў помніках ты застыў.

А тут маленства святое
навек замяла зіма..
Гродна – гняздо пустое.
Помніка ў Гродна няма.

## «На Малой Садовай...»

Гадоў чатырыста гінем –
зноў вось няма свабоды.
Маем толькі Максіма
ў куце на Малой Садовай.

Навошта сэрца і рукі,
калі душа без надзеі?!
Данута, мы – беларусы –
наша месца ў музэі...

Паволі ў рай да спакою
сцежкай ідзем сваёю,
сцежкай не хамскай, не панскай,
Максімавай, магіканскай...



www.kamunikat.org

## Летаргія

Пустка. Хмары. Перад навалай.
Розум спіць – як па цяжкай працы.
Сон ізноў нараджае пачвараў.
Як крыклівае веча на пляцы.

Дзве вайны, ГУЛАГ і Асвенцым.
Трыумф вёскі ў часах Пол Пота.
Свет даўно нікому не верыць.

Апроч новай чарговай глупоты.
Так патопам патоп змывае.
Там, дзе Троя і Атлантыда.
Затаіўся час, спачывае.
Камянём у прашчы Давыда.

## Акіян

Хваля ўстане за хваляй, а мора ўстане за морам.
І гара за гарой. І народ адзін за адным.
Лішні дзень нідзе не замоліш ніякай замовай.
Прарастаем з хаосу – вяртаемся ў попел і дым.

Край дастаўся малы. І слабы. І амаль ніякі.
І цяпер нічый. На Расію ці Польшчу едзь
або тут чакай – прыйдуць рускія ці палякі.
Ды ні тыя, ні тыя... не варушацца ні ледзь-ледзь.



www.kamunikat.org

Нам даўно адным стала Краю такога замнога.
Жыць не здолелі тут святы Юры і святы Ян.
Не прасіце ўсяго Сусвету ў Госпада Бога...
І па кроплі вады адзінай можна спазнаць Акіян.

## Апостал

Пакінь ты мяне, Нячыстая Сіла,
хадзіў я біцца – другім пара́.
Чытаю Эвангелле ад Максіма.
Проста кніжніка. Не змагара.

Усё паўтараецца. Толькі што позна.
У Ісуса Хрыста даўнюткі-даўно
розных прафесій былі апосталы,
а вось змагароў сярод іх не было.

Ці ўсім дзеля люду лезці ў магілу?
А хто ж тады будзе «Вянок» збіраць?!
Пакінь ты нас, Нячыстая Сіла,
Народ мае сам за сябе пастаяць.

## Калі вецер застыгне ў соснах

Калі вецер з Мора
застыгне ў надбярэжных соснах
у пасечаных асколкамі рунах
Зямля народзіцца яшчэ раз

хто сказаў што не веру
і не ўмею пісаць пра Створцу?!

а чыя ж рука сціснула нашу гліну
што аж кроў пацякла –
і чыя гэта кропля крыві
касцёл святой Ганны ў Вільні?

помню: голуб драмаў на краю аргана
сніў у полі калоссе
сцярогся сярпа

на далоні Зямлі пад далоняю Неба
ў невялічкай былой сталіцы
Ерузалеме пушчаў

і ў кожным мястэчку і вёсцы
дзе голуб спіць на краю аргана
як можна не чуць свайго Створцу

калі вецер застыгне ў соснах
і Зямля народзіцца яшчэ раз

www.kamunikat.org

## Малітва

няхай вера простаю будзе

ні збаўленне ні ка́рма
ні алтар кампутара
ні экран касцёла
толькі часу кавалак
чалавечага лёсу
тое месца на свеце
і дарога за светам

няхай вера простаю будзе

бо хто Бога шукае – трапляе да пробашча
секту фірму ці партыю
у кампанію школьных сяброў
у прэстыжны клуб бізнэсмэнаў
забягалаўку пралетарыяў
згаладалы Саюз пісьменнікаў
свет багемы
калгасную вёску
у ідэйную эміграцыю
у грызню за даляры

няхай вера простаю будзе

хлусіць кожны з першага слова –
я нарадзіўся! –
бо – ні сам ні пры чым
ні бацькі не хацелі
проста так атрымалася
потым час без канца і без сэнсу
падарожжа на месцы
толькі свет і дарога за светам

няхай вера простаю будзе

## Малітва на кожны дзень

Божа, дай мне спакой
прыняць і цярпець,
чаго не магу змяніць.

Божа, дай мужнасць
стаяць там і за тое,
у што веру і дзе павінен.

Божа, дай розум
не праспаць у спакоі мужнасць
і мужна перанесці спакой.

www.kamunikat.org

## Малітва на кожны год

Божа,
не дай мне веры ў чужы падман –
і так я лішне ла́сы на словы.

Божа,
не дай мне хваробы розуму –
каб абагнала хваробу цела.

Божа,
не дай мне смерці ніводнай
тых людзей, каго ма́ю і хто ма́е мяне.

## Малітва да Маці Божай Кангрэгацкай, Студэнцкай паспалітага люду места Гарадзенскага Апякункі

Маці Божая,
Ты – шкалярскі сірочы хлеб,
крыж за цёплым гасцінцам,
перавязаны ручніком,
подых спелай пшаніцы
і спакой васількоў,
палявая дарога ў сон...

www.kamunikat.org

Маці Божая,
Ты – Адна за ўсіх матак,
чые дзеці пайшлі за парог –
і за брамай, за вёскай, за небакраем
іх назад ніхто не пазбірае
па халодных слядах босых ног.

Маці Божая,
Ты – Адна над усімі,
над жывымі... і вечна жывымі,
хто не прыйдзе назад на спамін,
па кім хмаркі страсаюць высокія слёзы,
шумяць сосны, бярозы,
потым – вецер адзін.

Маці Божая,
Ты маўчыш, бо Ты – Слова,
Ты – адзін вечны боль,
сцеражы нас ад злога,
не пускай да глыбокага дна,
Маці Божая,
ты ў нас адна...

Маці Божая,
Ты ў крыві свайго Сына,
хоць крыві не відаць пад каронай,
спаглядаеш на нас міласцю нескаронай –



www.kamunikat.org

так глядзяць на вясковых дзяцей,
хто пад да́хамі места
сам сябе не шкадуе, бо так жыць прасцей...

Маці Божая,
у паезуі́цкім касцёле
з усіх просьбаў, малітваў і слёз
круціш нітку і вяжаш – і гоіш паволі
перасечаны час,
перарэзаны лёс,
Ты – святая, зямная, прыгожая...
Маці Божая...

*8 верасня 2005 года*

## «Не бойцеся!»

Не бойцеся жыць
на зямлі і ў часе, якія былі і будуць,
не страшцеся канца і бязмежжа
на дарогах і ў цемры, сярод людзей і местаў,
не гаварыце лішняга,
не навучайце вядомаму.

Новае і старое адно –
не што рабіць, а чаго не рабіць:

не забівай,
не крадзі,
не кажы на бліжняга,
не думай пра тое, што не тваё –

простая навука простаму чалавеку,
народжаная ў Бэтлееме і Вадавіцах,

і ўзнесеная крыжам у Ерузалеме
і белым дымам над Рымам.

Не страшцеся смерці і не бойцеся жыць

і самі зробіце,
і дадзена будзе
цяпер, заўтра і на векі вякоў.
Амэн.

*8 красавіка 2005 года*

## Зямны Рай у Няцечы

«Сорак гадоў касцёл быў пад замком –
чую па радыё з Прагі
дзвюх цётак з Няцечы пад Лідай –
а потым прыехаў ксёндз з Наваградка
кажа: так шмат людзей
такая вялікая вёска



www.kamunikat.org

будзе вам касцёл
і адчыніў нам Рай на Зямлі»

*castelle*:
загон агароджа цытадэль
ратунак прытулак храм Зямны Рай

за мурамі яго той сусвет
у якім прыходзіцца жыць

людзі вераць у Зямны Рай
іначай не мелі б сілы на Зямное Пекла.

«Па смерці няведама што будзе
а тут штонядзелю выбіраемся як на свята»

вось і ўвесь опіюм для народа
дурны вялікі філосаф

душа таксама матэрыяльная
душа ёсць падмурак для цела
падстава ўсяго жывога
ці не для такой душ*ы* ёсць на Зямлі касцёл
як Зямны Рай у Няцечы пад Лідай

www.kamunikat.org

## Семінарыя

Прыедуць хлопцы з дальніх вёсак –
хто па навуку, хто па долю.
Ў Гародні запалае восень
і ўжо не скончыцца ніколі.

На горцы нёманскай, як колас,
расце касцёл праз пяць стагоддзяў.
А над гарою Божы голас –
тады і ўчора, і сягоння.

І гэты ціхі голас кліча
не ваяваць, не глоткі рэзаць
і не дзяліць, але дзяліцца –
тут, на забытых людам Крэсах...

## Камень

Ружовы камень зрабіўся белым.
За адну спёку. Адну завею.
Бо толькі час застаецца вечным.
А ўсё расце, старэе, сівее.

Здавалася б – што яму з гэтым Краем...
З яго нялюдзтвам. І неспакоем.
Але – і камень даўно не камень.
Сівее камень. Жыццё такое.



www.kamunikat.org

Камень збялелы чакае смерці.
А чалавек – адно камянее.
Нешта нядобра на гэтым свеце.
Бо ўсё расце, старэе, сівее.

Мяне – парэжуць. Кананізуюць.
У хрэстаматыях – дурань на здымку.
Камень парэжуць – і адшліфуюць.
І ляжам, парэзаныя, у абдымку.

Пакуль адно тэлебачанне бачу.
Сяджу, пацягваю, назіраю...
Камень не плача – і я не пла́чу.
Ні над сабою, а ні над Краем.

## Тут і там

нарэшце спёка лягла шырока

папера машынка асадкі алоўкі
вакол неабходныя кніжкі
на крэсле і ложку неабходныя коцікі –
дзень не абыходзіцца без пісаніны –
так праходзіць жыццё неабходнае

але гэта цяпер і тут – а было тое там

www.kamunikat.org

там навечна разам Гаўя і Нёман
і Вялікі Луг ляжыць даўнім домам

там час гоніць хвост як альфа з амегай
ціхі вецер дыхае кожнай кветкай

мак таўкуць камары над вадою цёмнай
гоняць ластаўкі ў бераг да гнёздаў цёплых

небам Вострая Брама гоніць звон успамінам
і стаіць з хмаркай Бог над ліцьвінкай з ліцьвінам

* * *

Калі ізноў пачнуць, што не паспелі скончыць,
ты болей ні ўздыхнуць, ні плакаць не захочаш,
бо колькі можна зноў...

Ты ўсё паспеў сказаць пра ўсіх жывых і мёртвых,
пусты, як той вакзал, глядзіш цяпер на мора
халодных, ясных слоў...

Цяпер не падганяй у глотку цёмнай цішы
ні час, ні гэты Край, дзе дагрызаюць мышы
прысудаў поўны спіс...

Не выцірай ілжы – і будзеш беззаганным,
бо не відаць мяжы імёнам безымянным,
абліччам без вачэй і постацям без рыс...



www.kamunikat.org

## Калі ты быў...

На ўсіх разумных простае адно –
зямля і неба, глыбіня і дно.

За днямі дні злятаюць на экран
агонь і вечар, попел і туман.

Тут па сабе пакінуў Божы Сын
след на вадзе, як босых ног спамін.
Там астывае ад вады жывой
гарачы пот дарогі палявой.

Вакол той час і не ідзе назад –
і камянее даўні свет, як сад.

Ты прападзеш, а свет не прападзе
ні ў часе, ні ў зямлі, ні на вадзе.

Вакол і потым будзе вечны свет,
калі ты быў і свой пакінуў след...

## Пазвоннае

Сон прысніўся – ці пекла, ці проста га́дасць…
Нейкі спалены, чорны, абвіслы сад,
І вакол смяюцца ўсе, каб не плакаць,
бо ніхто адтуль не прыйдзе назад.

www.kamunikat.org

Сон услед другі. Ці рай у пазвонным,
вечным подыху – як з касцёла зімой,
ці спакой – як смерць! – над Нёманам сонным,
бо ніхто адтуль не спяшыць за мной.

Сон прыходзіць трэйці. На дзіва праўдзівы,
асабліва ўласцівы сучасным часа́м –
лезе з гною слава гнілою слівай
і вішчыць, што не годны яе ты сам...

...але вось прападаюць начныя морды,
вось ужо не відаць, падзеліся дзе,
бо Валерыя гоніць мой сон чацвёрты,
і сама ў белы дзень да мяне ідзе.

## Інсталяцыя

Лёг туман, як сон – на хаты, прысады.
Не відаць – дзе Скідаль тут, дзе Паставы.
У кустах патруль міліцэйскай засады,
Але нават дарога сягоння пустая.

У такім запусценні свабодна думам.
Што яшчэ і як зрабіць для народа.
Ехаць быле дзе – ці стаяць пад дулам?
Вось і ўся палітыка... І свабода.

На традыцыі грунтуецца вера.
Гаспадарка і побыт – на самагонцы.
Як анафема, за вёскаю ферма...
Потым горка – і могілкі на той горцы.

Пераходны час. Ні зіма, ні восень.
Тэлесерыял «Тутэйшая Сага».
Едзе гною воз. Спіць мужык на возе.
Зверху вілы тырчаць – без ніякага сцяга.

## Рым

Цэнтурыён 201-га легіёна
будзе цэзарам аўгустам потым неронам –
Вечны Рым засядае вакол цыркавой арэны
дзе адны забіваюць другіх і ніякай
другой перамены.

Вось забітыя Павел і Пётр – і другім век кароткі
і пад кожным катэджам з мармура мардатыя продкі
не глядзяць нікуды –
і нічога не бачаць над Тыбрам сады:

меч кінжал і цыкута вяроўка з любога суќа
ці проста голыя пальцы ветэрана і здаравяка
цэнтурыёна 201-га легіёна чалавека без сну...
Вечны Рым у сваёй дасканаласці – сумна яму

Тут не спіць нават смерць
быле не прапусціць нешта новае.
І жыццё пралятае –
і духам, і целам здаровае –

толькі мухі гнілыя ў вачах...
катакомбныя з крыжам ідуць па начах:
«Пане, злітуйся, Пане, вярніся»...

...замятаюць з арэны рабочы пясок,
спіць спакойна працоўная наша Сталіца.

## Зона

Мы даўно не правінцыя І не сталіца.
Нормы. Карткі. Кантроль. Зусім як на зоне.
Што казаць, беларусы любяць дзяліцца...
Беларусы дзяліцца любяць. Казённым.

Разабралі Айчыну да ніжняй цагліны.
На калгасы і соткі Край расцягалі.
А нядаўна... цэлы свет падзялілі –
на сваіх і чужых, і чужых разагналі.

Ад падзелу Керзóна такія мы людзі –
разам толькі п'ем, калі бульбу капаем.
Мы адзіныя ў тым, што дзяліцца любім.
Бо – нічога свайго за душой не маем.

А калі тая пустка ў душы, як зараза,
не дае ні спаць, ні Богу маліцца,
дзень і ноч гундосім, што трэба быць разам,
і яшчэ мацней свярбіць нам дзяліцца...

## Пашыліся ў дурні

Час выцінаю з газэтаў. Як дзеці, раблю аплікацыі.
Лістапад пакрылі ільды без апалубкі і арматуры.
Потым будзе адліга на пагранічнай станцыі.
А потым – рамонт навечна. На загад
Упраўлення культуры.

Потым зваліцца нешта. Як з Ліды Анацка.
Знянацку.
Эпоха нейкая хворая, як былы прэзідэнт Расіі.
Цацка ў дзяцей прапала?! Дайце другую цацку...
Не хочуць – хай не гуляюць. Абы не галасілі.

Кажа вароне варона, што смецце зноў па талонам.
І кожную замацуе за бакам сваім іх бацька.
Гэтак перазімуем. Ціха і нескарона.
А потым зваліцца нешта. Як з Ліды Анацка.
Знянацку.

## Як з Эвангелля

як з Эвангелля дождж цячэ з Неба
на гной на стрэхі на пярэсты статак
«*Мужчина, остановка называется Ферма!*
*Никакой деревни Жукевичи нет!*»
чатырох фермераў
пацягваюць з пляшкі пад крамай

гэтак было
жылі жралі жаніліся
елі пілі рабілі дзяцей
пакуль не ўвайшоў Ной у каўчэг
бо лінуў патоп і знішчыў усіх
а потым зноў
жылі жралі жаніліся
елі пілі рабілі дзяцей
пакуль жонка Лота соллю не аслупянела
гэтак і будзе ў той дзень
калі Сын Чалавечы прыйдзе

летнія ўнукі з Гродна
ведаюць пра чатырох мушкецёраў
але не чатырох вершнікаў Апакаліпсіса
каўчэг Ноя ніяк не выйдзе з рамонта
падвяла «*Сельхозтехника*»
гэтак і будзем



www.kamunikat.org

жыць жраць жаніцца
есці піць і рабіць дзяцей
а потым прыйдзе
патоп

## Скідзель

Не хачу вяртацца нідзе. Не бывае смерці спакойнай.
А палова жыцця прайшла
– як палова Краю прапала.
Паміж «*тут бэньдзе Польска,*
*бо было так пшэд войном»*
і «*я радзілася здзеся, хаця папа*
*прыехал с Урала*».

Гэта Скідзель – як скудзель. Мясціна мёртвых,
якія жывуць, і жывых, якія даўно паўміралі.
Сюды нават марксізм не прыйдзе.
Не калгасная ж мода.
І няма дзе блукаць ад эстэтыкі да маралі.

Па аўторках, па чацьвяргах брук таптаць у мястэчку
сярод лужынаў і паламаных акацый,
на жывых і на мёртвых, як на сябе ў люстэрку,
з нараджэння да смерці штодзень натыкацца...



www.kamunikat.org

## Успамін

Колькі гадоў мінула
людзей падзеяў
даканана справядлівасці
альбо чысткі этнічнай
гітлераўцы прайшліся па жыдах
бальшавікі па паляках
вёска занялася авансам

бацька і маці авансавалі
і папракаюць мяне... што я не трактарыст
і гной не цягаю на бульбу
а цэны шалеюць

няма ў Гродне Налкоўскай
няма ў Лідзе Путраманта
няма ў Вільні Чэслава Мілаша
няма Станіслава і Юзафа Мацкевічаў
няма з кім патаварыць
бо вёска авансавала

жыве Беларусь
бо вёска авансавала
цяпер прысна і на вякі вякоў
Амэн



www.kamunikat.org

## Круча

Круча над пушчай. На Неба ўзыходзяць доўга.
Спачатку хрысцім ад Рыма князя Міндоўга.
Потым – за лепшыя месцы рэжамся як адзін.
Потым – на лепшы сук разбіткаў шле Гедзімін.

А Полацк выгнаў Скіргайлу! Ягайлу
– Вітаўт Шалёны.
Ягайла пабег аж на Кракаў – і нарабіў Ягелонаў.
Адна і другая Вунія. Сорак войнаў на ўсе бакі.
Вялікае Княства Руінаў. Радзівілы і жабракі.

Нарэшце адваявалі. Адстралялі. Аджабравалі.
Нарэшце костку адгрызлі, скінутую са стала.
А час – постіндустрыяльны.
Гавары па-англійску, начальнік!
Наша дарога крутая на Неба не завяла.

## Сон святога Мацвея

Стаяў просты люд пад гарой
шэрай адной імглой...

...шчаслівыя бедныя, бо не маюць страху і сораму,
шчаслівыя заплаканыя, бо не бяздонныя вочы,
шчаслівыя ціхія, бо зямля не гаворыць,
шчаслівыя галодныя, бо іх праўда,

шчаслівыя літасцівыя, бо літасці не спамінае ніхто,
шчаслівыя чыстыя, бо іншыя ў брудзе,
шчаслівыя безабаронныя, бо пад апекай пакоры,
шчаслівыя праўдалюбчыя, бо няма ім канца і края,
шчаслівыя зацкаваныя, бо ім праўду гавораць...

...таму цешцеся ў радасці –
так заўжды выганялі пракокаў,
як выганяюць.

А хто пакідае сваю зямлю,
няхай пакіне тут свой спакой.

Стаяў просты люд пад гарой
рэдкай шэрай імглой...

## Сон святога Марка

Хрысціўся ад Яна. На Іярдане. Было шмат
каго, і бачыць маглі.
Сам апынуўся потым. На дарогах вакол зямлі.

Бо закрычаў адзін – і закрычала ўся школа.
– Не лезь да нас, нічый сын! Нам і так добра...

Пайшоў да Сымона з Андрэем на мора
за небакраем.
– Не збірайце сеткамі рыбу, пайшлі
людзей пазбіраем...



www.kamunikat.org

Каго адкуль назбіралі?! Шаленцы, хворыя,
страшныя...
Не так вучыў, як лячыў. Не было другіх,
былі нашыя.

Калі стаў у човен, захлынулася бура і ціша стала.
Ці стаў смутак? Бо Ірад казаў забіць Яна...

Накарміў легіён. Пяць хлябоў, дзве рыбы –
і не даелі.
Такое – пачулі. Вёскі і плошчы. Нават у Галілеі.

Вось! Прадаецца Сын Божы ў чужыя рукі!
Чаму не нас накарміў?! А толькі нанёс навукі...

Завялі на той суд, які быў. На Пілата
націснулі распарадзіцца.
Замучылі па ўсіх му́ках.
Бо чужая кроў то крыніца.
Калі адваліўся камень, потым знік Юда без вестак,
страх вялікі напаў – на пачэсных
і проста на чэсных.

Так паверылі, што несмяротны.
Было шмат каго, і бачыць маглі.
Бог не шкадуе – Бог судзіць.
На дарогах вакол зямлі.



www.kamunikat.org

## Сон святога Лукі

Сказаць па праўдзе, як бачылі, многія браліся.
Але не тое каб хлу́сілі, а больш
для сябе стараліся.

Калі ж я зацярушыў вока, і мне забалела,
то ў сабе стралу рымскую ўчуў,
што брату ў вока ўляцела.

Тым дадуць, хто вялікі боль несці будуць і падаць.
Але тым адбяруць, хто бяду малую не выкіне ў памяць.

Каму ўсё адабралі, тым адно ў галаве – хто
з іх большы?
І чаму адзін не баіцца – што ён і людскі, і Божы?!

Быў вялікі перапалох у Ерузалеме і рымскіх палацах,
калі адзін адваліўся ка́мень і адзін
паўстаў з-пад уладаў.

## Сон святога Яна

Было мора і была цемра. Потым дух запаліў святло...
Не так было і не будзе, але я скажу – як было.
Бо з камення пясок, а з пяску вараць шкло,
і жывем, як за шклом – не захочаш, а ўбачыш.
Ты паслухай, а потым заплачаш.

Нас было больш, чым у кнігах,
а першы вучань быў Юда.
Такі разумны і спраўны, што яму
не цярпелася цуда.
Толькі падумае Езус – Юда бяжыць і кажа.
Не быле каму, бо разумны, а толькі
сваім і нашым.
Калі ж усе свае нашым, то нашыя ўсе сваім.
Галілея была адна вёска. Сельсавет
і камендатура.
Адным словам, дабегаўся Юда...
Так стараўся – з вушэй пайшоў дым
ад яго гаваркога розуму ў Сынедрыёна
і простага люда.
Быў Пілат у нас доўга – і хацеў
у Сенат без скандала.
Але ж Юда гарэў, як у цемры святлом,
Следам голас народа, як гром –
і паехаць цяпер без скандала проста не выпадала.

Так і сталася, што было.

– Не было таго, што было! –
веру новую вынайшаў Юда
і дабегаўся, як да цуда.
Сам я думаю, прынялі яго ціха, бо людзі Пілата.

Лішні быў цяпер гэты крыкун.
Бо спакой найважней для Сената.
Простым людзям сенацкім лягчэйшы спакой.

Калі Юда быў вецер – ты, Сымон, будзь скалой,
альбо Пётр, па-элінску, каб усе зразумелі.
Больш пісалі, чым нас чатырох.
Толькі так, як за шклом былі.

Мы ж, хоць кожны па-свойму, але так, як жылі.
Мы ад смерці ўцяклі – жыве Езус і Слова.
Мы малая паловы палова, але нас чатырох –
аднаго не пачуюць, пачуюць другога...

Бог Адзіны. І Ён быў Адзін, і дарога.
Гэта нас пайшло чатырох.

## Запавет

не ты адзін але ты адзін
не бойся думаць – розум ад Бога
не ты напішаш – ніхто не напіша
не старайся лішняга
бо адкрыецца прыхаванае
не навучыць навука ўмець жыць
не навучыць турма не ўмець красці
не сон народзіць пачвараў якія за розумам

не адстрашыць смерць жыць другіх
не адваліцца камень сам
не захочаш а будзе як напісаў
бо розум ад Бога

## Светлая льецца ніць

Прабачце нам, хто за намі.
Не біце ў нас перунамі.
Мы спаленыя ў марозы.

Прабачце мне, хто за мною.
Не лёг я сцежкай зямною –
але не заняў дарогі.

Прабачце нам – хто без вестак.
І тым – хто на нашых месцах.
І станьце – за іх, за нас.

Прабачце мне след пражыты.
Кароткі, але спавіты.
У лёс, у подых, у час...

Тых не забудзьце вершы,
хто Чатырох за Першым.
Не забывайце жыць.

Свеціць святло над светам.
Свеціць – над тым, над гэтым.
Светлая льецца ніць.



www.kamunikat.org

## Малітва да Маці Божай Вастрабрамскай

Маці Божая, светлыя вочы Твае
узіраюцца ў чорную ноч,
у завулак Твой, цесны, стары,
у цёмныя шыбы старасвецкіх будынкаў,
ціша тут, зачынілі ўжо вокны, згасілі агні,
варта вулкай прайшла, і не спім мы адны...

Маці Божая, светлыя словы Твае,
так жанчына плача, дзіця пяе,
вецер дыхае навальніцай,
свечка ноччу мгліць на грамніцы,
завіруха спаць не дае,
спёка морыць, як сон...

Маці Божая, брама твая, як схрон,
па дарозе з Вільні да Неба...

Маці Божая, нам жа нічога не трэба.
Мы стаміліся жыць і ляцім пад адхон...

Маці Божая, мы стаміліся, бо жывыя,
адзін воўк жалезны завые,
а кругом чорны час маўчыць,
а кругом нават д'ябал не свішча,



www.kamunikat.org

галавешкі і папялішчы,
смерць адна ў святой прастаце...

Ты Адна ў сваім вострым куце...

Маці Божая, светлыя вочы Тваe
узіраюцца ў ноч над Ашмянамі, Лідай,
над касцёльнаю вёскай і над сталіцай,
куды кожны язык давядзе...

Ты Адна ў сваім вострым куце...

Маці Божая, Ты Адна не стамілася над вякамі,
Ты Адна не баішся з пустымі рукамі,
Ты Адна не згубіла з душы дабрыні,
зачынілі ўсе вокны, згасілі агні,
а вакол толькі мур, а кругом толькі камень,
а вакол толькі смерць, і не спім мы адны...

Маці Божая, светлыя рукі Твае,
як з нябачнаю праўдай,
працягнуты ў свет, які жыць не дае
сам сабе, як брат брату,
хто за кожнаю стратай маленькай
забыў пра Вялікую Страту,
і пра тое, хто большы з суседзяў, адно ў галаве...
Маці Божая, светлы Твой ранак,

зараз прыйдзе Твой хлопчык і сядзе на ганак,
свой адкрые альбом і змалюе
гару Гедзіміна дазвання,
як штодзённае практыкаванне,
так праходзіць зямное жыццё...

Маці Божая, дзякуй за ўсё.

## 30 траўня 2005 года

Так мала за душой, так шмат за крыўдай,
так шмат чужога і так мала сваяго,
так мала добрага – што ў Скідзелі, што ў Крынках,
так шмат парадаў і няма спытаць каго.

Так мала тут было, так шмат не стала,
так шмат цягнуліся што лета, што зіма,
так пусткі шмат і так надзеі мала,
так шмат ніякіх і так многіх больш няма.

Так мала дзён далей, так шмат мінае,
так шмат не будзе больш каго чакаць,
так Сыс памёр – і так шмат хто чакае,
так мала веры, каб сябе хоць не чапаць.

Так мала тут жылі і так навечна ляжам,
так поўна камянёў – як на зямлі святой,



www.kamunikat.org

так шмат жывым па смерці перакажам,
так мала зла пакінем за сабой.

Так мала мелі і так шмат памарнавалі,
так шмат не думалі – і лёгка так было,
так цяжка пасля нас знясе жывых на хвалі –
так шэра будзе... Ні дабро, ні зло.

## Сон у летнюю ноч

сплю – як розум:
коцікі Каця і Саша на пачварныя ловы
пайшлі здаровы

дзе чорт схавае – там участковы прыйдзе
дзе баба гоніць – там вецер вясёлы

як з Шалкевіча песні выходзяць дзяўчаты
і на ўсё прадмесце – ад хаты да хаты –
спяваюць ночкай купальнаю
вясёлую пахавальную:

«*калі Польшча не згібела – не было калхоза*
*а цяпер другое дзела – як за стол з мароза*
*ідзе дарога – ад плота да Бога*
*і ад заварота – ад Бога да плота*»



www.kamunikat.org

гэта было так даўно
калі адны жывыя яшчэ былі
а другіх жывых – яшчэ не было

сплю – як стары лішні розум:
дзед Ілля Аляксандравіч
дзядзя Якуб Станкевіч
з татарскай хаты Джаміль
і ўвесь мёртвы Скідзель
вывернуты на ліхі бок

сплю і не бачу ніякіх сноў –
адзін стары свет якога няма

## Дзве душы

Чэрвень. Холад. Вакол залева.
І не вылезуць грошы з дарогі...
Толькі коцікі – справа і злева.
Мяккацёплыя абярогі.

Каця ходзіць зігзагам удачы.
Саша спіць – як мышку прадаўшы.
Каця ходзіць, сумленне будзіць.
Саша сніць – што было і будзе.

Дзве душы пад адною стрэхай.
Чысты розум даўно паехаў.



www.kamunikat.org

Двух катоў у адным пакоі –
як спакой жыве з непакоем.

Так спяшаеш і так марудзіш,
так чакаеш і так іх любіш,
так іх церпіш і так трымаеш,
як сваёй душы больш не маеш.

Паляцела душа ад цела.
Жыць з табою не захацела.
Бо ты просты – як серп і молат,
ці ад печы халоднай холад...

## Спакой

Лета – як апошняе цяпло.
Залятаюць чмелікі ў вакно.
У нядзелю час ідзе нідзе.
І трускаўнік за вакном цвіце.

А вось з ночы – коцікаў прыход.
Каця Слаўкіна і Саша Кот.
Годзік ім і ўжо другі пайшоў.
Самі ж яны ходзяць на мышоў.

Проста іх пісаць – як тэлеграму.
Бо характар Каці проста ў маму.
Тоўсты і Тутэйшы яе брат.
Як у шляхты ці ў Адэльску лад.



www.kamunikat.org

Ходзікамі ходзяць малышы.
Лапкамі ступаюць па душы.
Шэрая ў матроску лягчэй ваты.
Бела-чорна-белы і касматы.

Гэта шмат. Каб без махнуць рукой
перад смерцю мець такі спакой.
Перад смерцю ці пасля жыцця.
Вось і казка ўся. Ці праўда ўся.

## «Тутэйшая Шляхта» *

Наша «Тутэйшая Шляхта»
паехала ў свет ганарысты…
Сам слухаў, як з Менску дзяўчаты
ў польскіх спявалі Крынках –
на «*имя власное*» гожыя,
без спадчынных запаветаў
в о л ь н ы я з ласкі Божай
ды р о ў н ы я ўсяму свету.

Менск за правінцыю лепшы,
бо м е г а п о л і с – ці места.
Тут беларусы з тутэйшых,

---

* Менскі студэнцкі хор 2000 года.

www.kamunikat.org

рускія з сінагогаў,
палякі з Гродзенскай Фары,
саветы з усёй краіны,
адны татары з татараў
ад Вітаўта з Гедзімінам.

Кіньце шукаць пад плотам
свае карані – ці гены.
Тут кожны сваім радаводам
сягае ніжэй калена…
Ці гэта Арлой Уладзя
адзін усіх напалохаў?!
А сам пры савецкай уладзе
вылез у Полацку з лёхаў…

## Вячэра

Толькі ўсе бяруць. Адзін Бог дае…
Але вечар прыйшоў – і не думаю я.
Поўны збор засеў пры адным стале –
Слаўка, Юры, Скідзельскі Цмок і Я.

Цмоку больш трэба даць – бо тры галавы.
Рыцар Юры – жалеза цягаў цэлы дзень…
А ўжо што застанецца, падзелім мы,
я і Чорная Слаўка, мой светлы цень.



www.kamunikat.org

Так зайшоў і не выйдзе з маёй галавы
той  п ы т а л ь н і к , забіты на цэлы свет:
хто тут з нас прыдуманы – хто жывы,
хто тут з нас смяротны – а хто Паэт?!

Бо не ты галоўны ў сваім жыцці
і вакол у свеце паміж людзей.
Гэта потым, па смерці, відаць па ўсіх –
з каго чорны цень, з каго светлы цень…

## Грыневіч

Сяргей Грыневіч намаляваў
сваё жыццё – па якім вандраваў –
і нас, такоўскіх і нетакоўскіх…
І пані Элізу Ажэшку з Паўлоўскіх.

Стылю ягонага – не зразумець.
Бо майстар у пальцах усё ма́е мець.
І спраўнасць, і сэрца, і Божы дар.
Грыневіч – сам сабе гаспадар.

Не забудзь Сяргей паесці, папіць.
Нават кнігу ма*ю* не забудзь купіць.
І з Галандыі зноў вярнуцца…
Не чакаючы тут рэвалюцыі.



www.kamunikat.org

Чым больш робіць – тым больш працы ма́е.
Цэлы край. Ад краю да краю.

Мой занятак другі, я заняты другім…

Бо ж страла, альбо куля – запа́лена ў ім,
то пякучая,
то пяючая,
бо за ім род, падмурак, падруба, жальпла́хта [1],
непахісная, неўміручая
ваўкавыская шляхта –
кроў чырвоная, белая косць
у Сяргея Грыневіча ёсць.

## Ягады

Збіраю ягады пустой жменяй.
Занятак той – абы дзе падзецца.
А ягад меней, меней і меней,
як дзён маіх, на кустах застаецца.

Глядзяць з вакна мае коцікі мягенькія
і думаюць пра сваё, як звыкла.
Каб з тых кустоў звісалі не ягадкі,
а хоць маленькія, але рыбкі.

---

[1] Żalpłachta (*польск.*) – пла́ха, калода; месца, адкуль узыходзяць на Неба.



www.kamunikat.org

А ўсе пісьменнікі з мастакамі –
і хто як Чобат, і хто з пасадай –
каб самі бегалі за мышамі
і не паспалі ночы ў засадах...

Так і мы, людзі, а нават горай –
а яшчэ плачам, што дзён тых меней –
што кот маўчыць, тое мы гаворым
і кругом лезем пустою жменяй.

## Кантрабандысты

«Куды цяпер, калі ў Айчыне цесна?!
Свабоды не відаць за паранджой…
Змалолі ўсіх. З мукí змясілі цеста.
Няверныя каханкі – за мяжой.

Давай і мы пацягнем *aqua vita* [1] .
Браты-палякі спомняць нас дабром.
І выйдзе ўсё, дасць Божа, шыта-крыта.
Бо ж лёс такі, як ножык пад рабром.

Данута піша зноў: – Не мáю сілы…
Шалкевіч Віктар выйшаў на бальшак.

---

[1] aqua vita (*лац.*) – «вада жыцця», альбо этылавы спірт, алкаголь.

Абрыдлы мітынг лезе, як з магілы.
І Божы конь стаміўся, як ішак… [1]

Давай хоць мы пацягнем свае чаркі:
– За Беларусь! За векапомны Край…
І дай нам, Божа – не, не нам у ка́ркі –
а лепшай долі, спраўнай волі дай…» [2]

## 23 жніўня 2006 года

вось мне і час на высокае дно –
Слаўка як хмарка на небе даўно –
і ўжо як вечнасць Тамара
доўгі імёнаў за ёй караван
дзед мой Ілля і з Рудольфам Іван –
з хмарак збіраецца хмара –
чорнае дно найвысокае дно
як гэта ноч і пустое вакно
вішня дрыжыць як святая
дождж шуміць налятае

---

[1] ішак (*цюрк.*) – чорнарабочы; пралетарскі асёл, якому не плацяць.

[2] Гэта была лірыка беларускага вяселля.
Спявалі Віктар Сазонаў і Уладзімір Хільмановіч.



www.kamunikat.org

подых зыходзіць ад іх на мяне
з дна вышыні праз вакно ў зямным дне
там дзе стос кніжак і ложак
коцікаў двух пляма з лямпы і стол –
вось мне і час на высокі падол
следам усіх босых ножак

подых ваш чую як вецер святы
з Вечнага Луга дзе Край залаты

абарані яго Божа

## Нябачны надпіс на камені

Вось чалавек. Тут яго месца.
Жыў не задоўга, а някепска.
Цяпер ляжыць пад валуном...
Не пад асінавым калом.

Так ціха тут, як у абрыдзе.
Не пакрадуць. Ніхто не прыйдзе...
Ляжыць і хай сабе ляжыць.
Бо час бяжыць і трэба жыць.

Няма па ім дзяцей і кніжак.
Жыў проста – і ляжыць, як лішак.
Каму якой бяды па ім...
Ці як даўней казалі – дым.

## Малітва да кнігі

няхай кніга лёгкаю будзе –
каб дзіця змагло ўзяць яе ў рукі

няхай кніга праўдзівай будзе
бо ў жыцці – свая праўда

няхай кніга не будзе самотнай
у другіх пакаленнях

няхай розум бароніцца
змроку пагалоўнай асветы –

і пажоўклы лісток
спіць спакойна паміж старонак

## Малітва да праўды

прашу Цябе не прыходзь раней часу:
толькі нашкодзіш – сабе і людзям

сваіх тут не сустрэнеш
а каго сустрэнеш – тых пакалечыш

Ты добрая адным мёртвым
каму не баліць



www.kamunikat.org

«праўду шукаюць» не для Цябе самой
а дзеля справядлівасці

а тую справядлівасць
кожны нацягвае на сябе аднаго

прашу Цябе не прыходзь раней часу
лепш будзь як надзея

бо надзея добрая пакуль не споўнілася
і таму спадзяюцца да самога канца
і пасля канца…

## Малітва да беларусаў

калі хочаце «жыць у Эўропе»
не будзьце народам з мяккім знакам

гора вам дзеці Чарнобыля –
сваё кінулі чужога не годныя

спявайце славу палякам і рускім:
без попелу іх прапашчых імперый
на чым бы вы паўзыходзілі і куды прараслі?!

першае незалежнае пакаленне
савецкія беларусы… закапáлі ў настальгію

www.kamunikat.org

а беларускія беларусы
«ваявалі за мову»… з касцёлам –
замест каб яе в у ч ы ц ь  я к  з а м е ж н у ю

а цяпер выявілася: нічога свайго не маеце –
адзін касцёл

Пілата на вас няма! той бы сказаў:
ш т о  в ы  з а  л ю д з і  ?!

не за вас малюся –
за ўнукаў вашых
праўнукаў вашых
за Зямлю пад Белымі Крыламі

і будзе мне пясок Яе пухам,
а камень Небам

## Малітва да жыдоў

прабачце мне за ўвесь просты люд беларускі –
той вас прасіць не будзе:
п р о с т ы  л ю д  б я з г р э ш н ы  і  н е а м ы л ь н ы

прабачце мне стадыёны на могілках
клубы з майстэрнямі ў сінагогах

прабачце мне *Жыдóмлю* і *Жыдкóвічы* –
за Жытóмлю і Ж*ы*ткавічы


www.kamunikat.org

*«высокае жыта адно цвіло»* –
н і я к і х  ж ы д о ў  у  н а с  н е  б ы л о

што кепскага то не мы
бо ж не мы вас
стралялі білі вывозілі –
мы толькі марадзёрылі
па вашых кінутых кватэрах і хатах

а цяпер нашыя ўнукі і праўнукі
ўжо канчаюць прапіваць
вашыя мэблю бронзу і ўсё жыццё

бо ж вашыя ўнукі і праўнукі
адляцелі ў заморскі вырай

і пакінулі нам
пусты Страчаны Рай

## Візантыя

цёплы вечар на шнурах ў бялізне спіць вецер
доўгія цені як вушы суседзяў Сад
пранікаюць да дна,
паўмільёна суродзічаў  п о л і с  якіх поўна
на гэтым свеце
кожныя дзесяць гадоў нечакана прыходзіць вайна

так сядзець бы ў крэсле пад грушай
і кіраваць гэтым краем,
паводле *colchozum veto* падаўляючай бальшыні
але эўрапейскія варвары за Нёманам і за Дунаем
развалілі Сцяну рушаць помнікі
нашай славы і велічыні

помніць с-сука чыё мяса ела
маць-і-мачаха Візантыя
паміраць не хоча старая дура –
а бо хто калі хацеў паміраць?! –
працягнуць бы яшчэ пакаленне…
хай гэтыя ўлады хай тыя
а па нас хоць патоп а не ў нас то хоць з танкаў страляць

у скалечаным свеце здаровым ёсць толькі калека
ці натоўп альбо охлас гатовы на кожнае «кыш!»
тут міжволі згадаеш Маладога
Прыгоннага Чалавека
стругалямі дубовымі ўбітага ў кедравы Крыж

контрразведка з адных дармаедаў
трыбухі адрасціла паліцыя
як усе тут пракрáліся бачна як бабу голую днём
і ўжо кожную ноч на тралейбусным дроце
Яго плашчаніца
– Яго плашчаніца! –
павісае гарыць не згарае бел-чырвона-белым
агнём…

## Ціша

Жывём адным днём. Жывём другім днём.
Гуляем з агнём – паміж верхам і дном.
Старэем, як баба на полі...
А нехта – як Сыс [1]. На падоле.

Нікога пры нашым, – і мы ні пры чым.
На возе чужым пра чужое маўчым.
З цярпеннем сваім праваслаўным...
Адзіным і нават дзяржаўным.

Куды свет пайшоў? Да каго свет прыстаў?!
А каб які ксёндз што з амбона [2] сказаў!
Згніло нешта ў нашым Садоме...
Як той тэлевізар у доме.

Заплакаў жабрак, а за ім куркулі:
– Каб вы не жылі, бо ж і мы не жылі!..
Закінуты Край лесні́човак
накрэсліў тут Божы аловак..

[1] Паэт Анатоль Сыс, мой аднагодак, памёр у 2005 г.

[2] ambon (*лац. і пол.)* – мóўніца; кáтэдра; трыбуна.



www.kamunikat.org

## Бясснежань

У снежні з далёкай Сахары
      прыходзіць вецер  с і р о к а –
затопіць Венецыю, потым
      дасягне ажно да Рыгі,
як ізноў не намі, хоць наша
      вызначана дарога
краіне святога Юрыя
      у руках Вастрабрамскай Марыі.

Рунь зелянее зара́на,
      як на Беларусі свабода…
Апосталы адгаварылі.
      Цяпер мемуары пішуць.
Хто з мяккім знакам, хто без.
      Хто для грошай, хто для народа...
«Спакой трэба мець, голад, холад», –
      ратаваў мне жыццё д-р Ж*ы*бер.

Дваццаць гадоў праляцела,
      калі быў далёкі бясснежань.
Валерыі пяць гадоў.
      Ні школы савецкай, ні польскай.
У Польшчы яшчэ Ярузэльскі.
      З Літвой няма яшчэ межаў.
А еду на Дон, на Урал
      з тэхнічнай фабрычнай поштай.



www.kamunikat.org

Ноччу «Азот» пускае
          лішак да Пана Бога.
Белае чорнае неба.
          Колеры ўсе на тым свеце.
Савецкі Саюз непарушны.
          Туды і назад дарога.
Адзін з далёкай Сахары,
          як з таго свету, вецер.

Куды жыццё праляцела?!
          У тонкі дзесятак кніжак.
Так бязлюдна і чыста,
          што не прыляціць і сарока.
Адны двух коцікаў дома
          суцяшаюць, што ім ты не лішак.
*Sic transit gloria mundi*, [1]
          як дальні вецер  с і р о к а.

## Дождж

Зацягнуўся дождж на ўсё лета.
Нерухомы час круглы год.
І суседзі справа і злева
лезуць – як лебяда праз плот.

1 Так мінае слава зямная (*лац.*)



www.kamunikat.org

Адзін з плачам, што ўсё тут гіне,
а другі – як праз не магу.
Сам – як молат. Як серп – гаспадыня,
і сабака на ланцугу.

Ціша – як у мястэчку ў банку.
У рамонце шлях на мяжу.
І не едзе ніхто… На ганку
смерць схавалася ад дажджу.

Залівае патоп канавы –
і, ступаючы след у след,
пералазіць злева направа
за суседам другі сусед…

## Санет

Над белым светам зноў пачатак дзён –
разумны век пхне за жалезным векам,
а чорны воран зноў над чалавекам
за кругам круг вяршыць – з усіх старон.

Каго цяпер шукае зверху ён?
На крыж, на стос, на гвалт сляпым калекам?
Каго ўзяць хоча ў лапы новым здзекам?
Чый выглядае ўжо астатні схрон?

Вось тваё заўтра, племя маладое!
Пакуль не абазнанае з бядою,
то смешны крыж табе і лішні боль...

Жалезны век сканае разам з намі,
закружыць чорны розум над табой –
і загаворыць неба камянямі...

## Такія мы людзі

Так старанна стараешся злосці не мець,
ці так блізка і ясна прыходзіць смерць,
што бывае без дома і з домам
нават страшна – як маладому.

Ты цяпер не адзін, а сяброў цэлы рой.
І памогуць – калі нападзе настрой.
Скрозь уздых і праз сумную стому.
Не сапраўднаму ж, бо не да смерці сляпому.

Цяпер проста. Ты сам маеш быць, як не быць,
і «*ўсё добра*!» сказаць усім не забыць –
завядзёнка такая з Эўропы прыйшла
і, як белая сажа, на душы лягла...

www.kamunikat.org

Так да попелу весела паліцца час.
І другім будзе тое, што маеш даўно.
Вось і злосці няма. Не на нас і на нас.
Бо такія мы людзі. Такое кіно.

## Валерыя

Ты цяпер не адзін, бо дажыў да спакою –
нават з часам такім і бясчассем такім.
Ты цяпер не адзін – бо жыццё ўжо другое,
бо другое жыццё ўжо пайшло за тваім.

Ты цяпер, як той цень – за дачкою дарослай.
Летні вечар над Кракавам. Звоніць трамвай.
Там дачка, а ты тут – са сваёю дарогай,
і без спеху на вечнасць збірацца давай.

Мне даволі было, што здаўна перапала –
і людзей, і смярцей, без вайны і з вайной, –
але вечна было б усяго мне замала,
каб не гэты спакой між дачкою і мной.

Я прыйшоў раней часу і быў нецярплівы –
Таму дыхаю, веру, жыву і стаю.
У другую краіну. У край мой шчаслівы.
У Валерыю веру. У веру сваю.



www.kamunikat.org

## Край мой шчаслівы

Буду жыв*ы*, то яшчэ пастараюся ўбачыць
іншым наш свет, у якім жывуць людзі іначай,
і яшчэ ўбачыць, няхай невядома калі,
Край мой шчаслівы, якога няма на зямлі.

А буду мёртвы, то зноў пастараюся выжыць
словам і следам, і стосам сваіх малых кніжак,
бо там схаваны, ці лета наўкол, ці зіма,
Край мой шчаслівы, якога на свеце няма.

Быў я на свеце – згаджаюся і пацвярджаю,
быў я жывы – і дачка мая будзе жывая,
і ў лепшы час будзе жыць, і паўстане з-пад сна
Край мой шчаслівы, які запрыгожыць яна.

А без мяне ці са мной, таго ведаць не можам
ані яна, ані я – мы ў Тваёй руцэ, Божа,
і адной ніткай абодвух да сэрца прышыў
Край мой шчаслівы – як сон, што мяне перажыў...

## У гэтым Краі

Быў між іншых і гэты Край –
Каму пекла, а каму рай,
Жыў пакутна, збройна і бражна.



www.kamunikat.org

У гісторыі нашых вякоў
Цяжка – першыя сто радкоў,
Гэта потым – сумна і страшна.

Чым падпоры і горы хістаць,
Лепш пра тое кніжкі чытаць –
Маладыя мы ці старыя.

Покуль вечнасць не прыйдзе ў час,
Пад сябе не загорне нас
І старонкай кніжнай накрые…

## Смерці не будзе

Смерці не будзе раней, чым паспееш даехаць
там, дзе пад стрэхай спакой і вакол белы сад,
там, дзе нікога чужых у пагоду і непагадзь,
толькі адкуль не бывае дарогі назад.

Смерці не будзе раней, чым нічога не будзе,
так набліжаецца восень, прыходзіць зіма,
сорамна ў Скідзелі жыць ...і баяцца на скудзель [1],
бо невядома, ці блізка той свет, ці няма.

[1] Мясціна мёртвых (*слав.*)



www.kamunikat.org

Вось перагорнецца кнігі кароткай старонка,
як за люстэркам, такі самы вечар глядзіць,
і Вастрабрамская Маці Усіх Абаронка
долю нябачную цягне, як вечную ніць.

## Малітва да гісторыкаў

не будзьце свяцей за свае народы –
т ы х  народаў няма
г э т ы я  вас не чуюць

не стойце на дарозе з рукой узнятай:
хто спазніўся той не паспеў

не забудзьце зас*ы*паць за сабой
усе ямы з раскопамі праўды –

ніхто далёка не заедзе па ямах

і нікога не давяла яшчэ да дабра
дарога  пакутаў слёз і крыві

помніце: «гісторыя ёсць навукай
перапісвання тоўстых, але чужых кніжак
у свой тонкі, але агульны сшытак»



www.kamunikat.org

## Мой Запавет

*«...а калі памру,*
*пахаваць мяне па волі прыяцеляў*
*альбо апекуноў,*
*Ці іншых людзей паспалітых,*
*клопату ім не справуючы;*
*а захоча прыйсці святар –*
*каталіцкі, вуніяцкі, праваслаўны*
*ці яшчэ іншы які, –*
*то няхай прыходзіць;*
*а месца тое па смерці маёй*
*пазначыць каменем простым,*
*а напісаць на ім толькі*
*імя ды прозвішча,*
*як бацькі наракі,*
*ды гады канца й пачатку майго,*
*як міласцівы Пан Бог адпусціў,*
*а іншых які́х кляйнотаў меціць не хачу,*
*няхай будзе толькі герб таго краю,*
*які не я выбіраў,*
*понеже не чалавек выбірае Айчыну сваю;*
*а крыжа не трэба мне праз грахі мае чалавечыя,*
*а хопіць і таго крыжа,*
*які рыцар збройны, Пагоняй паўсюдна званы,*
*на тарчы сваёй нясе...»*

## ***Belarus tomorrow*** *

Не дай Бог жыць з чаканнем за душой
у той краіне – блізкай і чужой –
з адным чаканнем вечным канца свету.

Не бачыць і не чуць нічога больш,
чым хамскі тлум і свой уласны боль,
і як за ка́ру, мець краіну гэту.

Не дай мне Бог шаленства ўсіх старых,
чый с о р а м в ы ц е к – так, як зрок, і слых,
і ў віск слінявы замяніўся голас.

Не дай мне злосці ў цяжкай галаве,
калі мой Край мяне пераражыве,
і слова прарасце – як зерне ў колас.

Бо свет плыве, а ты – у бераг вер,
і калі знікне ўсё, што ёсць цяпер –
не тая страта найвялікшым горам.

Бо набівае кожны ўласны гуз –
і там, дзе будзе з а ў т р а Б е л а р у с ь,
спачатку будзе *Belarus tomorrow*.

* Беларусь заўтра (*англ.*)

Бо жыць – не нам. Бо вечна нам не жыць.
Так і пад намі шмат каго ляжыць,
за нас спраўнейшых ва́цлаваў, максімаў…

Бо дзе свабода – мёртвых там няма.
Бо там ніхто не гіне задарма
і кожны ёсць Айчыны вечнай сынам.

## Дачка

Ляці вышэй, мой белы галубок!
Пакуль чакалі са слязой і мрояй,
вялікая імперыя ў наш бок
затрэсла публіцыстыкай і зброяй...

Мой цёпленькі заспаны матылёк,
на сэрцы бацькі ціха склаўшы крылы,
ляці вышэй. Бо не відаць здалёк,
як прымуць нас кар'еры і магілы...

Ляці вышэй! Пакуль не вырас ты
і маеш час, пакуль праз кроў і зімы
цябе таксама клікнуць у шыхты
і бацькаў цень, і вечны лёс радзімы...



www.kamunikat.org

## Лёс

Дзякуй Богу, пражыў пяцьдзесят зім і лет,
цяпер годны, як мёртвы, любога разца́.
Не на мне закончыцца гэты свет,
а ў тым свеце зусім не бывае канца.

Дзякуй Богу, спісаў пераломны час
у вялікім спакоі і ціхай вайне,
бо паўстанне з мёртвых было ва ўсіх нас,
хто ў жыцці сустрэліся мне.

Дзякуй Богу, не ўсе пайшлі на той свет,
так сабе – пяць дзясяткаў мужчын і жанчын,
і пасля пражытых тых зім і лет
мне спяшаць за імі да ямы ўслед
асаблівых няма прычын.

Дзякуй Богу, мне лёгка – тут і нідзе.

Бо мой лёс замятае мае́ сляды –
і сваёй дарогай дачка ідзе
з душой вольнай у вольны свет малады.

www.kamunikat.org

# Змест

«*Звар'яцею ад роднага краю…*» Уступ ***Язэпа Янушкевіча*** .......... 3

«Калі мой край перажыве мяне…» .......... 5
«Зіма. Адліга. Чорная дарога…» .......... 5
«Раскіданыя часам і вайной…» .......... 6
1863 .......... 7
Ксёндз Фалькоўскі – першы павешаны... .......... 8
«За прамовы сталіцаў заўсёды плаціць…» .......... 9
«Смяецца дурань мястэчковы…» .......... 9
«Звар'яцею ад роднага краю!..» .......... 10
«Балада пра памінальную хвіліну» .......... 11
«Мой даверлівы брат, не пішы халуюь…» .......... 12
«У паўстанцаў заўсёды прамы...» .......... 13
«Які ты задаволены!…» .......... 14
Гістарычны нарыс .......... 14
Абноўленая будучыня .......... 15
Час Касінераў .......... 15
Вёска .......... 16
Каўнас .......... 17
Першыя перамены .......... 18
«Калі ўсё скончыцца…» .......... 19
«Не цяжка мне зусім…» .......... 20
«У восені малюнак свой і строй…» .......... 21

Ноч........................................................................ 21
Ля карціны М. Савіцкага... ................................. 22
Браты ..................................................................... 23
Такая гэта зямля ................................................... 25
«Сон падарожжа акрыліў нясмелых…»............ 27
«Плёскат хваляў рачных…».................................. 27
«Запомні гэты дзень, няма другога…»............... 28
Польскі эцюд ........................................................ 29
«Так непадобныя, як толькі ты і я…» ............... 30
На аўтобусным прыпынку.................................... 31
«У тых мясцінах, блізкіх да нябёс…»................ 31
«У вёсцы клопатна, у горадзе няёмка…» .......... 32
«Цалую неба над табой…» ................................. 33
«Больш нічога. Ні праўды, ні Бога…» ............... 33
«Туман. Пясок. Спакой і смутак…» .................. 34
«За бацькамі ніякай віны – вінаватыя дзеці…» 35
«Добры геній ад мрояў не хоча прачнуцца…».. 36
«Айчыны воі адпіхнулі зброю…» ...................... 36
«Няма справядлівасці…» .................................... 37
«Не пішацца. Не хочацца. Не час…» ................. 37
«Злачынствы. Здзекі. Сваркі. Парахункі…»...... 38
«Пры ўсім пры тым, што маем і не маем…»..... 38
«Кідаюць людзі дом за домам…»....................... 39
«Мы коцімся наперад і назад…» ....................... 40
«Не пажадаю шчасця, ты прабач…».................. 40
«Калі пустыя край і дом…» ................................ 41
«Людзі ветру і полымя клічуць на пляцы…».... 41
«Агідна часам жыць, а часам міла..».................. 42
«Чорны парк і чорны горад назаўсёды тут…».. 43
«Які ўжо раз дагэтуль і цяпер…» ...................... 43

«Паэты развіталіся са славаю…» ........................ 44
«Куды падзецца нам з табой…».......................... 45
«Як абрыдла тлумачыць…» ................................ 45
«Сам так пачаў і сам зрабіў выснову...»............. 46
«Дасць Бог, – і як ніхто не канфіскуе…» ........... 47
«Загадчык катэдры і просты селянін…» ........... 47
Справаздача пра палітычнае становішча........... 48
Тутэйшы ............................................................... 49
Першая прагулянка па старых вулічках............ 50
«Да свабоды прамая дарога…».......................... 50
Батлейка .............................................................. 51
Пра адно.............................................................. 52
«Ні парадку, ні крыку …».................................... 52
На роднай вуліцы ............................................... 53
Парэчча ............................................................... 55
Станцыя Рыбніца ................................................ 56
«Калі над лугам бусел праляцеў…».................. 57
Ноччу на хутары.................................................. 58
Снег над зямлею.................................................. 58
Дэмакратыя......................................................... 59
«Не прашу дабра чужога….» ............................. 59
Песня пра апошняга маёра................................ 60
З нізкі «Чатыры пары года» ................................ 61
«Там, на стоках, – дзе Гаўя і Нёман…» ................64
«Афарбаваныя то жоўтым, то чырвоным…».......65
«Вечны дзятлік дзяўбе і не можа прабіць…» ......66
«У Вільні – як у Вільні. Цэлы свет…»............... 66
«Нарэшце – дождж…»........................................ 67
«Калі пачнецца нешта ў гэтым брудзе…» ......... 67
«Між вольнымі людзьмі такая сувязь ёсць…»........68

«Заўсёды так. Спачатку звычка вечная…» ........ 69
«Так лёгка навучыцца ўладу браць…» .............. 69
«Капрыз гісторыі? Ці толькі лёс народа?...»...... 70
«Старыя святы зменяцца на новыя…»............... 71
«Лішнімі бедныя будуць, пакуль свет…» .......... 71
«Дарога цягнецца. Спякота дражніць…»............72
1413 год. Гародля над Бугам .............................. 73
Вунія..................................................................... 73
Паўночная Вайна.................................................. 74
Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ............................ 75
Адам Міцкевіч...................................................... 75
З нізкі «Чорныя касінеры» ................................ 76
1863 год. Развітанне з Радзімай.......................... 81
Міхал Каяловіч ..................................................... 81
1866 год. Выбраныя сцэны губеранскага места
Гародні ................................................................... 82
Маёўка гімназістаў на беразе Нёмана................ 85
1894 год. Кастрычнік, Гародня... ....................... 86
Марыя Багдановіч ................................................ 88
Адам Багдановіч................................................... 88
Матылёк ................................................................ 89
У Яраслаўлі........................................................... 90
Прыезд на Радзіму ............................................... 91
Элегія..................................................................... 91
Максім Багдановіч ............................................... 92
Ліст Пятру Гапановічу.... .................................... 93
25 траўня 1917 года. Смерць Паэта.................... 94
Неадасланы ліст да Янкі Купалы........................ 95
1920 год ................................................................. 96
Станіслаў Булак-Балаховіч.................................. 97

Вацлаў Іваноўскі .................................................. 98
Браніслаў Тарашкевіч ........................................... 99
1939 год .................................................................. 99
13 верасня 1942 года. Скідаль............................ 100
Мацей Каленкевіч-«Котвіч»............................... 101
1976 год. Мінск. Цяпер – Менск...................... 101
Зіма 1980 года.................................................... 102
Крыжакі́.................................................................. 103
Мутанты ................................................................ 103
Слімак.................................................................... 104
На вуліцы Леніна ў Гародні................................ 105
Пастаралька на 27 ліпеня 1990 года ................ 105
Шэсць сотак ......................................................... 107
Аповяд шатландскай аўчаркі Боны ................. 107
Сон перад незалежнасцю .................................. 109
Мястэчка .............................................................. 109
Terra nullíus ..........................................................110
Пастаралька. 1992 год.........................................110
Ранак......................................................................112
Перапынак .............................................................112
Яцвягі .....................................................................113
Новая Галілея .......................................................114
Роспач.....................................................................116
Мара .......................................................................117
«Бераг мой апусцеў. Толькі восень…»..............117
«Цень па вуліцах места пляцецца…»...............118
«Вецер з возера выстудзіў памяць…»...............118
Зімовы вечар..........................................................119
Чорная паль .......................................................... 120
Формула ................................................................ 120

Сіфанафора ........................................................ 121
Балада пра высокамаральную графаманку…........122
Балада пасля балю з нацыянальнай элітай ...... 123
Балада пра гаспадара забягалаўкі…................. 124
Маўзалей .......................................................... 125
Калькута........................................................... 125
Дом .................................................................. 127
Залатая свіння................................................... 128
Першая кроў ..................................................... 128
Modus Albaruthendi.......................................... 129
Пасля дождҗыка ў чацвер ................................. 130
Балада пра Рудольфа Пастухова ...................... 131
Балада памяці белага коціка Басіка ................. 132
Балада пра Ўладзіміра Захарава ...................... 134
Балада пра Івана Сяргейчыка............................ 135
Балада пра Ўладзіміра Кіслага ........................ 136
Косава............................................................... 137
Перапіс ............................................................. 139
Я хачу ў Савецкі Саюз ...................................... 140
Хамелеёны ....................................................... 141
Турма ................................................................ 142
Рэквіем ............................................................. 143
Бяссонніца......................................................... 145
Ластаўка ........................................................... 146
Ялінка ............................................................... 146
Помнік Максіму Багдановічу ў Гародні........... 147
«На Малой Садовай...» ...................................... 148
Летаргія............................................................. 149
Акіян................................................................. 149
Апостал ............................................................ 150



www.kamunikat.org

Калі вецер застыгне ў соснах........................... 151
Малітва.......................................................... 152
Малітва на кожны дзень .................................... 153
Малітва на кожны год ........................................ 154
Малітва да Маці Божай Кангрэгацкай… ......... 154
«Не бойцеся!»................................................. 156
Зямны Рай у Няцечы ......................................... 157
Семінарыя ....................................................... 159
Камень ............................................................ 159
Тут і там ......................................................... 160
Калі ізноў пачнуць... ........................................ 161
Калі ты быў... ................................................... 162
Пазвоннае........................................................ 162
Інсталяцыя ...................................................... 163
Рым ................................................................ 164
Зона................................................................. 165
Пашыліся ў дурні ............................................. 166
Як з Эвангелля................................................. 167
Скідзель.......................................................... 168
Успамін............................................................ 169
Круча .............................................................. 170
Сон святога Мацвея ......................................... 170
Сон святога Марка ........................................... 171
Сон святога Лукі.............................................. 173
Сон святога Яна............................................... 173
Запавет........................................................... 175
Светлая льецца ніць ......................................... 176
Малітва да Маці Божай Вастрабрамскай......... 177
30 траўня 2005 года.......................................... 179
Сон у летнюю ноч ............................................ 180

Дзве душы ........................................................ 181
Спакой ........................................................ 182
«Тутэйшая Шляхта» ........................................................ 183
Вячэра ........................................................ 184
Грыневіч ........................................................ 185
Ягады ........................................................ 186
Кантрабандысты ........................................................ 187
23 жніўня 2006 года ........................................................ 188
Нябачны надпіс на камені ........................................................ 189
Малітва да кнігі ........................................................ 190
Малітва да праўды ........................................................ 190
Малітва да беларусаў ........................................................ 191
Малітва да жыдоў ........................................................ 192
Візантыя ........................................................ 193
Ціша ........................................................ 195
Бясснежань ........................................................ 196
Дождж ........................................................ 197
Санет ........................................................ 198
Такія мы людзі ........................................................ 199
Валерыя ........................................................ 200
Край мой шчаслівы ........................................................ 201
У гэтым Краі ........................................................ 201
Смерці не будзе ........................................................ 202
Малітва да гісторыкаў ........................................................ 203
Мой Запавет ........................................................ 204
Belarus tomorrow (Беларусь заўтра) ........................................................ 205
Дачка ........................................................ 206
Лёс ........................................................ 207



www.kamunikat.org

Літаратурна-мастацкае выданне

**Чобат** Аляксандр (Алесь) Хведаравіч

**Калі хочаце мець у Айчыне свабоду…**

Укладальнік Я.Янушкевіч

Рэдактар Я. Войніч
Мастак В.Паўлавец
Мастацкі рэдактар Я. Іслачоўскі
Тэхнічны рэдактар Я.Янушкевіч
Кампутарны набор Я. Крывіцкі
Вёрстка Я. Самавук
Карэктар К. Дамянуш

Падпісана да друку 08.08.2009 г.
Фармат 60 х 84 $^{1}/_{32}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times. Ум. друк. арк. 6,28. Ул.-выд. арк. 4,43.
Наклад 200 асобнікаў. Замова № 200.

www.kamunikat.org